Юнипресс

# Беларуская літаратура

## Пазакласнае чытанне 2–4 класы



*Серыя «Хрэстаматыя»*

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА:

## ПАЗАКЛАСНАЕ ЧЫТАННЕ

## 2–4 класы

Для агульнаадукацыйных устаноў
з рускай мовай навучання

Мінск
«ЮниПрессМаркет»

УДК 821.161.3.09(075.3)
ББК 83.3(4БЕИ)Я73
Б43

Укладальнік *Л. І. Строк*

Б43 **Беларуская** літаратура: Пазакласнае чытанне 2-4 класы / уклад. Л. І. Строк. — Мінск: ЮниПресс-Маркет, 2016. — 384 с. — (Серыя «Хрэстаматыя»).

ISBN 978-985-578-509-6.

Дадзены вучэбны дапаможнік складзены з твораў вядомых беларускіх пісьменнікаў. Прапануецца для пазакласнага чытання і адпавядае тэматыцы заняткаў, абазначаных у школьных падручніках. Кожныя тэматычныя заняткі ўключаюць разнастайныя па жанру творы. У дадатку прадстаўлены аўтабіяграфічныя звесткі пра кожнага пісьменніка і паэта, чые творы і складаюць змест дапаможніка.

Адрасуецца вучням і настаўнікам пачатковай школы.

**УДК 821.161.3.09(075.3)**
**ББК 83.3(4БЕИ)Я73**

**ISBN 978-985-578-509-6**

© Строк Л. І., 2009
© ТАА «ЮниПрессМаркет», 2016

# ПРАДМОВА

Пазакласнае чытанне ў школе з'яўляецца неад'емнай часткай вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне».

Урокі пазакласнага чытання ў 2–4 класах згодна з праграмай павінны праводзіцца адзін раз у месяц і суадносіцца з прапанаванай аўтарамі падручнікаў тэматыкай. У працэсе пазакласнага чытання вучням неабходна пазнаёміцца з творамі беларускіх пісьменнікаў: Я. Коласа, Я. Купалы, М. Багдановіча, У. Караткевіча, В. Віткі, А. Вольскага, А. Якімовіча, З. Бядулі, У. Ягоўдзіка, В. Хомчанкі, У. Дубоўкі, Э. Агняцвет, Е. Лось і інш.

Дадзены вучэбны дапаможнік складзены менавіта з твораў гэтых пісьменнікаў і адпавядае тэматыцы заняткаў, абазначаных у школьных падручніках. Кожныя тэматычныя занятакі пачынаюцца эпіграфам і ўключаюць разнастайныя па жанру творы. У дадатку прадстаўлены аўтабіяграфічныя звесткі пра кожнага пісьменніка і паэта, чые творы і складаюць змест дапаможніка.

# 2 клас

## Тэматыка чытання:
## НЕ ПРОСТА Ў СЛОВЫ Я ГУЛЯЮ, НА РОДНАЙ МОВЕ РАЗМАЎЛЯЮ...

*Родная мова*
*У марах, у песнях, у снах.*
*Мае ў ёй кожнае слова*
*Свой колер, і смак, і пах.*
*Зліваюцца гукі ў словы*
*І ў рэчышчы роднай мовы,*
*Як рэкі ў мора, цякуць.*

А. Грачанікаў

*Роднае слова — гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет.*

Я. Колас

### ПЯТРУСЬ БРОЎКА
### Родныя словы

Яны даспадобы мне, хай і старыя,
Не толькі ў гучанні хвалюючы змест,
Як многа гавораць мне назвы такія —
Мінск,
    Пінск,
        Брэст.

Калі паразважыш, няцяжка дазнацца,
Бо сведчаць на ўсю неабсяжную шыр,
Што продкі любілі спакойную працу, —
Шклоў,
Клецк,
Мір.

А вораг находзіў, — бязлітасна білі,
Трываць не хацелі абразы і слёз,
І разам з Бярозаю катаў тапілі —
Пціч,
Друць,
Сож.

Дзяды і бацькі нашу мову стваралі,
Каб звонка звінела, была як агонь,
У сёлаў імёны, як гукі цымбалаў, —
Блонь,
Струнь,
Звонь!

### Багата, родная ты мова

Багата, родная ты мова,
Цябе стварыў і ўзнёс народ.
А вобразы якія ў словах,
А параўнанняў што за ўзлёт!
Вятры — вандроўнікі, вядома.

Барозны — гуслі на раллі,
А сосны — рыцары ў шаломах,
Крыніцы — вочы ўсёй зямлі.
А хвалі ўвосень — гэта зрэб'е.
Як срэбра, ручаёк цячэ,
А зоры, як цвікі на небе...
І шмат яшчэ, і шмат яшчэ!

## ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ

### Першае слова

Першы голас, які я пачула на свеце,
Быў голасам маці.
Калыханку пад месяцам
І на дасвецці
Спявала мне маці.

Гэта — першая песня
І першае слова
Зямлі маёй весняй.
Гэта — ціхая ласка
І міру ахова.
Дзякуй, маці, за песню!

Запаветныя, родныя фарбы і гукі —
Усё застаецца.
Дзякуй, мама, за рукі,
Бяссонныя рукі,
За адданае сэрца!

Рукі цёплай пяшчоты,
Турботы і працы —
Ад ляноты лячылі.
Аніякай работы ў жыцці не цурацца
І мяне навучылі.

Не пакрыўджу цябе,
З тваіх сцежак не збочу,
Засланю ад нягоды.
Я хачу, каб свяціліся радасцю вочы
І жыла ты заўсёды!

**Паводле ВАСІЛЯ ВІТКІ**

## Мілагучнасць роднай мовы

Беларуская мова вельмі мілагучная. І толькі той ёю добра валодае, хто адчувае музыку слоў, яе жывую душу.

Возьмем хоць бы гук «*дз*», які перадаецца дзвюма літарамі. Напрыклад, слова *дзень* нагадвае гучанне нацятай струны. І наша вуха ўжо ўлавіла і звон сонечнай цішыні летняга дня, і прастору чыстага высокага неба, і нават палёт пчалы: *дз*, *дз*, *дзень*.

Дзіва! — скажаце вы. І сапраўды дзіва! У самім слове — *дзіва*. Жывое слова мілагучнасці, дзіва музыкі.

А возьмем кветку дзьмухавец. Чаму ў яе такое імя, здагадацца, вядома, няцяжка. Але ці звярнулі вы ўвагу на вымаўленне гэтага слова? Дзякуючы мяккаму знаку слова памякчэла, палагаднела. А паспрабуйце вымавіць *дзмухавец*. Слова ўжо не спявае. Паспрабуйце дзмухнуць — не дзьмухаецца. І гэта толькі адна з многіх асаблівасцей нашай мовы, якія робяць яе мілагучнай.

## УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

### Родная мова

Наша родная мова — гэта мова Скарыны і Буднага, Багдановіча і Купалы, Багушэвіча і Коласа, мова сотняў талентаў, што яшчэ прыйдуць на нашу зямлю. Мова настаўнікаў і паэтаў, вучоных і кампазітараў, але перш за ўсё мова больш чым дзесяці мільёнаў простых людзей Беларусі. Мова першай матчынай калыханкі і апошняга «бывай», мова старадаўніх архіваў і пажаўцелых статутаў...

Гнуткая, пявучая, адвечна новая, без якой нельга ўявіць сабе свайго жыцця, як без хлеба, без паветра.

Наша мова неўміручая, бо яе захоўваюць усе: сялянка, што спявае народную песню, вучоны, які складае слоўнік, дзяды, што апавядаюць пра мінулае.

## КАЛЫХАНКІ

### Баю-баінькі-баю

Баю-баінькі-баю,
Не лажыся на краю.
Не лажыся на краёк,
Прыйдзе шэранькі ваўчок.
Прыйдзе шэранькі ваўчок,
Цябе схопіць за бачок.

### Люлі-люлі-люленькі

Люлі-люлі-люленькі,
Люлі-люлі, спаценькі!
Прыляцелі гуленькі,
Сталі яны гаварыць:
— Чым малютку накарміць?
Будзем карміць піражком,
Будзем паіць малачком.
Люлі-люлі, спаценькі.

## НІЛ ГІЛЕВІЧ

### Калі рана ўстанеш

Калі рана ўстанеш —
Разам з сонцам яркім,
Разам з ветрам шпаркім,
Разам з белым днём, —
Сам тады, мой дружа,
Разумець ты будзеш,
Для чаго мы, людзі,
На зямлі жывём.

### Тэматыка чытання:

## ВЕРАСЕНЬ БУКЕТЫ ЗАПРАСІЎ У ШКОЛУ...

*Над партамі вучні*
*Схілілі галовы*
*І пішуць у сшытках*
*Любімыя словы:*
*Матуля, Радзіма,*
*Мір ва ўсім свеце —*
*Старанна выводзяць*
*Шчаслівыя дзеці.*

Н. Парукаў

## ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ

### Параска і падказка

— Скажы, Параска,
Калі ласка,
Якую ты чытала казку?

Параска думала: «Ой-ой,
Я ж не чытала ні адной!»
Хтось шэпча ў класе:
— Курка-раба...
Параска кажа:
— Мурка-жаба.
Хтось шэпча:
— Журавель і чапля...
— Я помню!
Муравей і шабля.

— Скажы, Параска,
Калі ласка,
Якіх ты ведаеш звяроў?

Тут чхнуў яе сусед Пятроў,
Яму шапнулі:
— Будзь здароў...
Параска, не дачуўшы слоў,
Сказала:
— Ведаю кароў.
— Вось дык цікава, звер —
карова!

Скажы нам, без якога слова
Пражыць не можаш
ані дня?
Маўчыць Параска... Цішыня...

Глядзіць яна ва ўсе бакі,
Глядзіць на столь
і на падлогу,
Хто прыйдзе ёй на дапамогу?

Знайшоўся жартаўнік такі,
Што гучна прашаптаў:
— Падказка.
— Падказка! — крыкнула
Параска.

А я не ведаю, браткі,
Ці гэта быль, ці гэта казка?

## РЫГОР БАРАДУЛІН

### Колькі раніц месціць ранец?

Як памножыш на гады
Дні і месяцы,
Тады
Падлічыць набудзеш шанец,
Колькі раніц
Месціць ранец.

Раніц многа
Ранец месціць.
Кожны дзень
І кожны месяц
Іх кіруе ў школу рана,
Каб вучыліся старанна.
Ты расцеш —
Растуць гады.
Не сцішаючы хады,
Раніцы ідуць з табой
З першай радасцю,
Журбой.

Першая
Ступае тая,
Жоўтым лісцем залатая,
Следам —
Раніца другая,
Першай партай дарагая.
Раніцай вясёлай трэцяй
Промень хітра
Ў вокны свеціць.

Добрых раніц
Шмат у школе —
Не забудзеш іх ніколі:
З першаю тваёй пяцёркай,

З акцябрацкай зыркай
Зоркай,
З гукам горна,
Сцягам гордым,
З першым у жыцці
Рэкордам,
Хай пакуль што
Не сусветным,
З першым смуткам
Самым светлым.

У вяснушках лісця,
Рыжы
Раніцу прывеціць рад
Задуменны лістапад.
Снежань
Раіць дбаць пра лыжы.
Нават грозны месяц люты
Запытаецца,
Чаму ты
Не прыходзіш на каток
Правяраць на звон лядок.
Сакавік качае снежкі,
Красавік казыча
Ўзмежкі.
Вострыць май
На нудных ікал,
Запрашае да канікул.

Кожнай раніцы
Усмешка
Непаўторная такая.
Да Краіны Ведаў
Сцежка
У дарогу вырастае.

Раніцы з табою ўсе —
У лістах,
Снягах,
Расе.
З іх,
Турбот і шчасця поўны,
Твой
Пачаўся
Дзень працоўны.

### Вінаваты тут не сшыткі

У Мікіткі двойкі ў сшытку
Шыі гнуць,
Як тыя гусі.
Абяцае ўсё Мікітка:
— За вучобу я вазьмуся.
Сшытак новы завяду
І, нібы на паваду,
Ўсе пяцёркі павяду.
З захапленнем,

Са стараннем
Ён рашаў задачу ўранні,
Толькі так пяром вадзіў —
Кляксу з бохан пасадзіў.
Уздыхаў Мікітка горка:
— Зноў не будзе мне
пяцёркі...
А назаўтра
Жвава, вёртка
Маляваў хлапец вавёрку.
Так малюнкам захапіўся,
Што на хвост зусім забыўся.
— Не было б хваста
ў вавёркі,
Атрымаў бы я пяцёрку...

Потым з дружбаком
Ягоркам
Коўзаўся Мікітка з горкі.
Прапусціў урок хлапчына,
Ды знайшлася зноў
прычына:
— Каб не горка, не Ягорка,
Я б дамоў прынёс
пяцёрку...
І адна ў яго гаворка:
— Каб ды каб,
Я б меў пяцёрку...

Сшыткі новыя заводзіў,
Толькі з двойкамі прыходзіў.

## Перастараўся
(Смяшынка)

Дзіма ходзіць па пакоі і на ўвесь голас выгуквае словы. Падышла сястра:

— Чаго ты крычыш?

— Верш вучу.

— А нашто так моцна?

— Ганна Міхайлаўна казала вучыць уголас, лепш запамінаецца.

— А скора ты ўжо вывучыш?

— Не ведаю. Можа, і зусім не вывучу: нешта горла пачало балець.

## ВАСІЛЬ ХОМЧАНКА

## Цяжкае імя

Сяргейка не выгаворвае літару. Гэта бывае часам з малымі. Замест **Р** вымаўляе **Л**.

Калі яго пытаюць, як зваць, Сяргейка адказвае:

— Як дзеда.

— А дзеда як?

Ён кліча дзеда і кажа:

— Яны хочуць ведаць, як цябе зваць. Скажы.

Іншы раз старэйшыя дзеці знарок пацяшаюцца з Сяргейкі:

— Скажы: труба.

Ён і тут знаходзіць выйсце.

— Жалеза вось такое, — адказвае Сяргейка і складвае ў трубачку далоньку. — Гнутае.

Аднойчы прыехаў у госці бацькаў сваяк. Прывітаўся з усімі, а потым падаў руку і Сяргейку.

— Мяне завуць дзядзя Рыгор, — сказаў ён. — Не забудзеш?

— Не забуду, — нявесела адказаў Сяргейка і ўздыхнуў: — Цяжкае імя.

— Гэта чаму ж цяжкае? — здзівіўся дзядзька.

— Калтавае. Аж два Л.

## АНДРЭЙ ФЕДАРЭНКА

### Падслуханая казка

Настаўнік даў вучням хатняе заданне — кожнаму намаляваць якуюсь кветку.

Марыйцы спачатку заданне падалося лёгкім. Дзяўчынка добра малявала, да таго ж ведала і любіла мноства самых розных кветак. Ранняй вясной яна любіла дзьмухаўцы і лотаць, улетку — смолкі і валошкі, увосень — вяргіні і астры... Якая ж з гэтых кветак самая прыгожая, самая любімая? За акном цяпер не вясна, не лета і не восень, а сцюдзёная зіма, белыя гурбы снегу, і адзіныя кветкі — тыя, што намаляваў мароз на аконным шкле.

Дзяўчынка думала-выбірала ўвесь вечар і потым, у ложку, засынаючы, таксама думала. Ад гэтага ёй прысніўся сон. Прысніўся заліты сонцам, запоўнены птушыным спевам празрысты летні дзень, поплаў, які нагадваў дарагі стракаты дыван, — столькі на ім было кветак... І калі яна, босая, лёгкая, ступала па гэтым мяккім дыване, кветкі схіляліся да яе і хваліліся кожная сваёй прыгажосцю. Вядома, гэта быў сон, таму кветкі і маглі размаўляць. Галасы іх

пераліваліся ціхім журчаннем ручайка, ранішнім жаўруковым спевам, лёгкім пошумам ветрыку, які забаўляецца з маладой лістотаю... Пунсавелі красуні ружы і стараліся прыхаваць пад лісцем свае шыпулькі; звінелі, бы нанізаныя на нітку парцалянавыя званочкі, бялюткія ландышы; выхваляліся адзін перад адным смешныя таўстуны цюльпаны самых розных колераў; надуваліся ад гонару таўсташчокія півоні; разбегліся і засталі па ўсім поплаве бесклапотныя рамонкі; сінелі між імі маўклівыя сціплыя незабудкі, сон-трава і «цвяток» яе, Марыйчынай, радзімы — непаўторная валошка...

Дзяўчынка слухала, любавалася кветкамі і аніяк не магла выбраць лепшае. Гэтая прыгожая, а паглядзіш — другая яшчэ прыгажэйшая... Раптам яна пачула меладычныя, танюткія і чыстыя, як перазвон крышталю, галаскі. Дзяўчынка агледзелася. Ах, яна нават не заўважыла, што наступіла на цэлую

сямейку непрыкметных сярод гэтай раскошы колераў і пахаў звычайных маргарытак! Цяпер яны, прымятыя, падымаліся з зямлі, атрэсваліся, распраўлялі пялёсткі і лісточкі, падстаўлялі сонцу свае бела-ружовыя вяночкі з жаўтком пасярэдзіне. Яны гаварылі так ціха, што дзяўчынцы, каб пачуць іх, давялося прысесці і нагнуцца ледзь не да зямлі.

— Каб толькі гэтая дзяўчынка захацела паслухаць нас! — сказала адна з кветак, і Марыйка, як гэта бывае толькі ў снах, чамусьці адразу зразумела, што гэта нямецкая маргарытка. — Каб дала нам хоць крышачку ўвагі! Можа, тады яна выбрала б нас? Мы нікольк не горшыя за іншыя кветкі. Гэта ж акурат мы здавён-даўна прыносім дзецям і дарослым радасць, стараючыся прадказаць іхні лёс. Можна загадаць любое жаданне, потым абрываць па чарзе пялёсткі, і тое слова, пры якім будзе абарваны апошні

пялёстак, і павінна азначаць: збудзецца ці не збудзецца жаданне.

— Гэта праўда, — азвалася другая кветка, і зноў Марыйка адразу зразумела, што гэта маргарытка-францужанка. — Мы цвіцём з ранняй вясны да позняй восені, і няма ў свеце краіны, дзе нельга было б нас сустрэць, дзе не варажылі б на нашых пялёстках! Я таксама расказала б гэтай дзяўчынцы, як яшчэ ў старадаўнія часы рыцары дарылі нас сваім дамам і на стужках, якімі абвязвалі букеты, рабілі такія надпісы: «Кожная кветка мае сваю вабнасць, але калі б мне прапанавалі на выбар адразу тысячу кветак, усё адно я выбраў бы толькі маргарытку!»

— А я расказала б дзяўчынцы, — падхапіла кветка-грачанка, — што наша назва «маргарыткі» пайшла з грэчаскай мовы і азначае «жамчужыны». І гэта нас апяваў паэт, сцвярджаючы, што мы, незлічоныя белыя кветачкі, рассыпаныя па зялёным лузе, — здаёмся сапраўднымі жамчужынамі!

— А я, — умяшалася кветка-італьянка, — распавяла б дзяўчынцы адну з самых прыгожых легендаў пра нашае паходжанне. Вядома, што вялікае сонца больш за ўсё на свеце любіць кветкі, клапоціцца пра іх, песціць, як дзяцей... А кветкі карыстаюцца гэтым і заўсёды аб нечым у яго просяць: адны хочуць быць больш буйнымі, другія — больш духмянымі, трэція — мець прыгажэйшыя пялёсткі... І толькі мы, маргарыткі, ніколі ні аб чым не прасілі, заўсёды адчувалі сябе шчаслівымі, такімі, як стварыў нас Бог. Больш за ўсё мы радуемся, калі нас зрываюць дзеці, гуляюць з намі. І ў падзяку за нашую сціпласць сонца цалуе нас, пакідаючы свой знак — жоўтую плямку пасярэдзіне белых пялёсткаў.

— Я расказала б дзяўчынцы, — прамовіла кветка-аўстрыйка, — што выява букеціка маргарытак ёсць нават на мармуровым помніку. Ён узведзены ў памяць аўстрыйскай імператрыцы Лізаветы, якая заўчасна

загінула, а маргарыткі — сімвалы яе дабрыні і сардэчнасці.

— Я, — сказала кветка-англічанка, — радуюся таму, што гэтая дзяўчынка наступіла на нас. У Англіі і цяпер існуе звычай: калі наступіш на дванаццаць маргарытак адразу, вясна надыдзе раней.

— І ў Скандынавіі мы служым прадвесніцамі вясны і аднаўлення жыцця, — падтрымала шведская кветка. — Менавіта ў Швецыі ўпершыню быў наладжаны збор ахвяраванняў для хворых на сухоты, а кветкай, якую даравалі кожнаму, хто рабіў грашовы ўклад, былі выбраны мы, маргарыткі!

— А я, — абазвалася апошняя кветка, — расказала б дзяўчынцы пра нашую агульную з ёю цудоўную і нешчаслівую радзіму. Я расказала б, як яшчэ са старадаўніны таптали мяне чужацкія коні і людзі, як з веку ў век вострыя сохі і плугі падразалі разам з дзёрнам мае карані, і я, як і іншыя кветкі і травы, угнойвала глебу; рас-

казала б, як паласавалі мяне цяжкія жалезныя гусеніцы цягачоў і танкаў і як вырывалі, перамешвалі мяне з зямлёю разрывы бомбаў і снарадаў; расказала б, як прысыпала мяне смяротным радыяцыйным попелам і брудам... І ўсё ж я выжыла! Нездарма ў нашай мове я завуся стакротка. Я зноў расту паўсюль, дзе толькі могуць умацавацца карані, і я хачу, каб бегалі па мне басаною, каб зрывалі мяне і варажылі на маіх пялёстках шчаслівыя дзеці, хачу радаваць вочы і адаграваць душы дарослых...

Марыйка прачнулася. Яшчэ нейкі час у яе вушах адгалоскам звінелі ціхія крышталёвыя галасы, а перад вачыма стаялі бела-ружовыя зорачкі з жоўтымі пячаткамі пасярэдзіне.

Яна ўжо ведала, якую кветку будзе маляваць.

## Памылка

— Сягоння, Аксана, ты не зусім цвёрда ведаеш правілы, таму і памыляешся ў напісанні слоў, — сказаў

Максім Раманавіч, добразычліва паглядаючы на светлавалосую дзяўчынку, якая стаяла каля класнай дошкі і асцярожна трымала ў пальцах доўгі брусочак крэйды. Ад слоў настаўніка Аксана крыху пачырванела і апусціла долу вочы. Было відаць, што ёй вельмі хацелася атрымаць пяцёрку.

— Але ты заўсёды добра рыхталася, — працягваў Максім Раманавіч, — і я прадыктую табе яшчэ некалькі слоў. Напішаш правільна — пастаўлю пяцёрку. Не спяшайся, успамінай правілы, але не хвалюйся — чацвёрка таксама добрая адзнака.

Ён зняў акуляры і, паціраючы пальцамі пераноссе, падняўся з-за стала. Хутка павінен быць канец урока, і трэцякласнікі чакалі званка, перашэптваліся і шумелі. Настаўнік пачаў хадзіць ад стала да сярэдзіны класа і назад, каб вучні супакоіліся, і гучна дыктаваў словы, расцягваючы па складах:

— Ба-раць-ба... Ма-лаць-ба... — гаварыў ён, і ў яго атрымлівалася «барадзь-ба», «ма-ладзь-ба»...

Аксана пісала марудна, баючыся памыліцца, абдумвала кожнае слова, і настаўнік не прыспешваў яе.

— Касьба.

На гэтым слове празвінеў званок. Дзяўчынка хутка дапісала яго і павярнулася тварам да класа.

Максім Раманавіч прыжмурыўся, блізарука глянуў на дошку, падышоў да стала і, схіліўшыся над журналам, сказаў:

— Што ж, добра...

— Максім Раманавіч, у Аксаны памылка, — сказаў раптам круглатвары, чырванашчокі хлопчык, які сядзеў за першай партай. Звалі яго Антосем. Ён, як і Аксана, быў выдатнікам.

— Аксана напісала касьба цераз «з», — устаўшы з-за парты, удакладніў Антось.

Дзеці, якія пачулі гэта, прыціхлі.

— Ты вельмі ўважлівы хлопчык, — сказаў настаўнік Антосю, — а памылку, калі яна ёсць, мы зараз убачым. — Настаўнік падышоў да дошкі, знайшоў памылку, але мякка ўсміхнуўся дзяўчынцы, якая выглядала зусім разгубленаю, і сказаў: — Ты вельмі старанная вучаніца, а памылілася, бо падумала, што ў беларускай мове заўсёды як чуецца, так і пішацца. Але гэта не заўсёды. Бачыш, трэба яшчэ лепш вучыць не толькі правілы, а і выключэнні з іх.

Максім Раманавіч паставіў Аксане чацвёрку, а Антосю — маленькі плюсік і адпусціў дзяцей на перапынак.

На двары, калі Антось, апранаючы на хаду паліто, спускаўся па прыступках школьнага ганка, да яго падышлі некалькі хлопчыкаў, яго аднакласнікаў.

Забягаючы ўвесь час наперад і не даючы Антосю ісці, яны пачалі дражніць яго:

— Ябеда ты!

— Што, атрымаў плюсік?

— Гляньце, атрымаў плюсік — і рады!

— І рады. А табе зайздросна? — адказаў Антось. Ён адчуў, што толькі так, злосцю на злосць, можна абараніцца.

— А што ты выйграў з таго, што наябеднічаў і атрымаў плюсік? — выступіў з гурта наперад і крыкнуў Антосю ў твар Казімір.

— Я сказаў праўду, а не ябеднічаў, — Антось крыху спалохаўся.

— Ну і што, што мне да твае праўды? — выкрыкнуў Казімір, не спускаючы з Антося насмешлівых вачэй. — Нашто мне такая праўда, калі я, напрыклад, захачу пайсці пагуляць у хакей, а ты пабяжыш ды скажаш настаўніку, што я ў хакей гуляю і ўрокаў не вучу.

— І пабягу.

— Яшчэ як пабяжыш! Ці куплю марожанага, а ты пойдзеш ды скажаш майму бацьку, што я знарок ем марожанае, каб захварэць і не пайсці ў школу.

— І скажу...

Невядома, чаго яшчэ нагаварыў бы Казімір, калі б са школы ў гэты момант не выйшлі дзве настаўніцы старэйшых класаў. Заўважыўшы шумных, ваяўніча настроеных вучняў, настаўніцы перасталі размаўляць паміж сабой і глядзелі на іх. Дзеці крыху прыціхлі.

Выкарыстаўшы збянтэжанасць, Антось прасунуўся паміж хлопчыкамі і, буркнуўшы нешта сабе пад нос, хутка пайшоў са школьнага двара да аўтобуснага прыпынку.

Ад крыўды Антось не мог спакойна стаяць на прыпынку і пайшоў пешкі, балазе ісці было недалёка — якіх два прыпынкі.

Бацька быў дома, бо працаваў у другую змену. Маці яшчэ не вярнулася з працы.

— Познімся, брат, — сказаў бацька, выходзячы з кухні і пазіраючы на гадзіннік. Ён любіў парадак.

Антось распрануўся і зайшоў следам за бацькам на кухню.

— Ведаеш, тата, сёння настаўнік не заўважыў памылку на дошцы, а я падняўся і сказаў.

— Правільна зрабіў, — здымаючы з пліты каструлю, сказаў бацька.

— Але калі б я змаўчаў, адна дзяўчынка атрымала б пяцёрку. Ды й так... Ад маёй праўды нікому лягчэй не стала: выходзіць, гаварыць праўду — не заўсёды добра? — Антось пачырванеў, успомніўшы словы Казіміра.

Бацька заўважыў гэта.

— А што здарылася? — зацікавіўся ён. — Ты паступіў абсалютна правільна. Хоць настаўніку, канечне, магло гэта не спадабацца. І калі трэба, я сам магу пайсці ў школу і ва ўсім разабрацца.

— Не, усё добра, — адказаў сын і пайшоў мыць рукі.

Цяпер ён ведаў: дарослыя — ва ўсякім разе, бацькі і настаўнікі — скажуць, што ён зрабіў правільна; дзеці — ва ўсякім разе, яго аднакласнікі — скажуць, што ён звычайны

ябеда. Былі нейкія дзве праўды, у якіх хлопчык заблытаўся.

Усё ж Антось больш верыў дарослым. Пасля размовы з бацькам ён супакоіўся, павесялеў.

Правёў бацьку, дачакаўся маці, пагуляў на двары, вывучыў урокі... І толькі позна вечарам, калі лажаў у ложку і думкі яго пачыналі блытацца, пераходзячы ў сон, ён здрыгануўся. Заўтра трэба ісці ў школу. Як быць? Як размаўляць з усімі?

Антось успомніў твар Аксаны, якая яму вельмі падабалася і з-за якой заўсёды карцела вылучыцца перад астатнімі, успомніў насмешлівы Казіміраў твар, і яму, як ніколі, захацелася па-сапраўднаму пасябраваць з Казімірам...

Не маючы болей сіл разбірацца ў гэтых супярэчнасцях, хлопчык перавярнуўся на жывот, уткнуўся тварам у падушку і ціха заплакаў.

## ПРЫКАЗКІ

Добра таго хваліць, хто хоча ўсё ведаць.

У каго веды — у таго і сіла.

Сказаць лёгка, ды зрабіць цяжка.

Хочаш многа знаць, трэба мала спаць.

Прыгожая птушка пер'ем, а чалавек вучэннем.

Не той шмат ведае, хто доўга жыў, а той, хто шмат вучыўся.

### Тэматыка чытання:

## МЫ НЕ ЗАЎВАЖЫЛІ І САМІ, ЯК ВОСЕНЬ ПА ЗЯМЛІ ПАЙШЛА...

*Сляды гарачыні*
*Яшчэ на тварах носім,*
*Ды паплылі ўжо дні*
*У залатую восень.*
*Самотны крык гусей*
*Даносіцца з-пад воблак.*
*У асмужанай красе*
*Твой бачу, восень, воблік...*

П. Панчанка

## ЯКУБ КОЛАС

### Восень

(Скарочана)

«Прыйшоў Пятрок — апаў лісток; прыйшоў Ілья — апала два». Так кажуць людзі, бачачы чуць відны паварот ад лета к восені.

Луг ужо скошаны. Дзе яшчэ нядзельку таму назад калыхаліся высокія зялёныя травы, блішчалі кветкі, над каторымі з такімі вясёлымі песнямі лёталі работніцы-пчолкі, збіраючы мядок, — там цяпер пуста. Адны толькі дзябёлыя стагі, як вежы, параскідаліся па грудочках то тут, то там. Буслы даўно пазляталі з гнёздаў і ходзяць стадамі па лузе або кружацца высока-высока ў небе, усё роўна як радзяцца яны перад далёкай дарогай.

Жыта на полі зжата і звезена; авёс і ячмень сабраны. Толькі дзе-нідзе жаўцее чыя-небудзь палоска позняга аўса ці ячменю, ды пачарнеўшыя лапінкі спелай грэчкі чакаюць серпа.

Картафлянік на картофлях павяў, апусціў сухое лісце; адны толькі голыя цыбуры тырчаць, як палкі. Глуха і нудна на полі. Ужо не чутно спакойнае гаворкі ціхага ветру з каласкамі збожжа. Толькі ржышча — кароткія пянёчкі жыта, аўса, ячменю і пшаніцы — гаворыць, што тут яшчэ нядаўна красаваліся пасевы. Ужо не трапечуцца ў небе над полем жаваранкі з мілымі песнямі. Прайшла вясёлая пара лета, усё адцвіло, адкрасавала. Усюды, куды ні глянь, накладае восень свой след, сваю руку. Толькі кароўкам і авечкам больш стала прастору на зжатым полі.

А глянеш на лес! Ці той гэта лес? Як адмяніўся ты, чорны, высокі, чуць-чуць засланы сінім туманам, далёкі лес! Яшчэ так нядаўна зваў і клікаў і цягнуў к сабе ты ў гарачы летні поўдзень пад свой цень... Тысячы галасоў усякіх птушак, вясёлы іх шчэбет рассыпаліся ў тваім гушчары, і ціхі спакой навяваўся на

душу тваёю доўгаю, густою моваю, лепетам тваіх лістоў і галін. Эх, гутарлівы лес! Люблю я цябе, люблю твой шум, халадок тваіх лістоў і твой здаровы смаляны запах. А цяпер ціха і глуха і ў лесе. Птушкі перасталі спяваць, лісце пажоўкла і патроху асыпаецца на дол.

Сонца не грэе так ярка, як, бывала, улетку. Кожны дзень яно ўсё ніжэй і ніжэй ходзіць па небе. Неба часцей і часцей засцілаецца хмарамі. Невясёла пазірае яно, засланае смутнымі хмаркамі, як зааранае поле. Туманы закрываюць ад вачэй божы свет. Дробны дожджык сеецца, як скрозь сіта. Нудна і непрытульна выглядае ўсё ўвосень.

## СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ

### Лістапад

Пэўна, сонца знемаглося,
Адпачыць пайшло за хмары,
І паўзе павольна восень
Па іржышчы і папары.
І ад холаду рабіна
Чырванее, нізка гнецца.

Паляцелі гусі клінам,
Каб у выраі пагрэцца.
Сыплюць лісцікі бярозы,
Стала ветрана і суха —
Недалёка ўжо марозы,
І снягі, і завіруха.

## РЫГОР БАРАДУЛІН

### Як восень дрэвы ашукала

Вяслуюць крыламі буслы,
Плывуць,
плывуць
над светам.
Атаваю,
Іржышчам злым
Пайшло упрочкі лета.
Свае ўладанні
На зары
Абходзіць восень важна,
Заходзіць у лясы,
Бары
Ды ціха дрэвам кажа:
— Паабшарпаліся зусім,
Апратка ў вас старая,
На сонцы выцвіла.

Усім
Я вам зычліва раю:
Хутчэй скідайце лахманы,
Азябнеце ў тумане!
Я ж прынясу вам без маны
Навюткае убранне.
Усю зіму
Сястра вясна
За морам кросны ткала,
І з раннім выраем яна
Тканіну пераслала.
Спяшаў, ляцеў
Да гнёзд сваіх
Гарласты гурт грачыны,
Аднак не мог забраць усіх
Сувояў зяляніны.
Я запрагу вятроў
І ўраз,
Ледзь толькі сонца ўстане, —
З-за мора прывязу для вас
Навюткае убранне...
Гарыць агонь
Па ўсёй зямлі.
На возеры,
У канаўцы —
Кляны

Сям'ёю пачалі
Маўкліва распранацца.
І ясень
Прыклад даў вярбе.
Рабіны сумавалі,
Адно пакінулі сабе
Гарачыя каралі.

Дрыжыць:
— Не трапіць у бяду б! —
Асіна ўся ад страху.
І расшпіліў
Плячысты дуб
Цяжкую апранаху.

Адкуль узяўся той вятрэц,
Як ухапіў за полы.
Дуб-тугадум,
Стары мудрэц,
Стаяць застаўся голы.

У восені
Зашмат турбот
І ніякой падмогі.
Пакуль праверыла
Ўмалот,
Паразмяла дарогі...

Пакуль яна
Знайшла вятроў —
Пасліся ў лузе недзе, —
Пакуль запрэгла, —
З-за лясоў
Мароз са снегам едзе.

## УЛАДЗІМІР ЯГОЎДЗІК

### Баравік

Такое ўжо яно, шчасце грыбніка: чым на руцэ цяжэйшы кошык, тым лягчэй і весялей яму ідзецца. Апусціцца над лесам дождж, прамочыць апранахі да апошняй ніткі, а вопытны грыбнік усё роўна не спяшаецца, не ўцякае дахаты. Ходзіць нячутна паміж дрэў і наспеўвае паціху дзіўную песеньку, якую даўным-даўно склалі нашы мудрыя дзяды:

А грыб баравік
Над грыбамі палкавік:
Загадаў усім грыбам
На вайну ісці!

Слухаецца маленькі грыбны народ свайго камандзіра. Зноў ата-

куюць кошык лісічкі, а за імі — сыраежкі і грузды. Толькі паспявай адбіваць паклоны.

А што сам баравік-палкавік, знакаміты грыбны ўладар?

Ён не спяшаецца ў палон, моўчкі цікуе за табой з нейкай схованкі, прыглядваецца, які ты ўважлівы і пільны. Быццам строгі экзамен прымае: як завуцца белыя грыбыбраты? Хто за кім і дзе ўладарыць у грыбным царстве?

Дык слухай, запамінай, дружа, потым не раз табе яшчэ прыдасца.

Першымі ў чэрвені з'яўляюцца *каласавікі* — яны растуць, калі цвіце-красуе жыта.

Потым разам з пачаткам жніва ў барах высыпаюць *жніўнікі*.

А восенню, у верасні і кастрычніку, калі ападае лісце, грыбнікоў радуюць крамяныя прыгажуны *лістападнікі*.

Так, усе яны родныя браты, хоць растуць у розныя поры года і часта не падобны адзін на аднаго.

І колерам капялюшыка, і памерам ножкі.

Самыя раннія белыя грыбы, як яшчэ інакш называюць баравікі, сустракаюцца ў дубровах. І капялюшыкі, і ножкі ў баравікоў-дубровікаў пафарбаваны ў аднолькавы светлы колер.

У бярозавых гаях растуць каржакаватыя баравікі з самавітымі карычневымі капелюшамі.

У яловым лесе, сярод брусцічніку і шапак моху, хаваюцца ад людскога вока самыя высокія з братоў-уладароў.

А ў сасновым бары гаспадараць баравікі-чорнагаловікі.

Вось бачыш, дружа, які выбар — на любы густ. І які б цяжкі ні быў кошык, памятай:

*Грыбнік без баравіка — што салдат без медаля.*

### Жураўлі

«Курлы!.. Курлы!.. Курлы!..» Быццам дзесьці высока-высока пад

аблокамі зайгралі звонкія срэбныя трубы. Ды не дзве і не тры, а сапраўдны аркестр. Так пераможна трубяць у гонар вясны шэрыя жураўлі, якія спяшаюцца да родных гняздоўяў.

Жураўлі, ці журавы, як яшчэ іх называюць, надзвычай прыгожыя птахі. Усе як адзін рослыя, дужыя, самавітыя. І бадай найлепшыя танцоры ў птушыным свеце. Асабліва хораша яны танцуюць на світанні, калі ўзыходзіць сонца. Прыляцяць на ціхую балацявіну, збяруцца ў карагод і пускаюцца ў скокі, падпяваючы сабе гарэзлівым курлыканнем. А колькі ў тых скоках весялосці! Жураўлі то кланяюцца адзін аднаму, то распускаюць крылы, то ходзяць упрысядкі, то бегаюць навыперадкі. Птушыны цырк дый годзе!

Убачыць зблізку жураўлёў няпроста, бо яны жывуць на глухіх балотах. Гнёзды свае ладзяць сярод травы, на высокіх сухіх купінах. Звычайна жураўліха адкладвае ў гняздо

два яйкі. Калі птушаняты праклюнуцца і падужэюць, бацькі вучаць іх знаходзіць пад мохам чарвякоў, жучкоў, лавіць у вадзе жабак, іншую дробную жыўнасць, паказваюць, як лаўчэй скакаць з купіны на купіну, хавацца ад шматлікіх ворагаў. Асабліва нялёгка даводзіцца маладым жураўлям пазней, калі ў іх адрастуць крылы. Тады бацькі-настаўнікі ні хвіліны не даюць ім спакою — прымушаюць махаць крыламі, падскокваць угору, пераля-таць з аднаго месца на другое.

Такая штодзённая фізкультура не праходзіць марна. Мінаюць тыдні, і ў жніўні падлёткі становяцца на крыло — падоўгу крыляюць у небе. Але абавязкова пад пільным вокам вопытных птахаў. Старыя жураўлі паказваюць маладым розныя паветраныя манеўры, вучаць ляцець клінам, выконваць загады важака. Неўзабаве суровы экзамен — вырай у цёплыя заморскія краіны.

Надыходзіць восеньскі дзень, і гас-

падары балотных абшараў выпраўляюцца ў далёкае падарожжа. Ляцяць яны высока, імкліва, кідаючы развітальныя крыкі: «Курлы!.. Курлы!.. Курлы!..»

Услухайся ў гэта самотнае курлыканне, дружа, і ты, мабыць, пачуеш, як важак чарады гукае:

«Кірыла! Кірыла! Кірыла!..»

А журавель, які ляціць апошнім, яму адказвае:

«Скры-віў! Скры-віў!..»

І проста на вачах выцягнуты ў раўнюткія шнуры клін паварочвае ўбок ці зусім распадаецца. Наперадзе — няблізкі шлях. Нельга памыляцца ў пачатку дарогі! Колькі хвілін птахі ляцяць моўчкі, потым зноўку збіраюцца ў свой дзівосны клін.

## ПЯТРУСЬ БРОЎКА

### Песня хлебу

Радуюць сэрца
Збожжа і травы,
Дзень мой праменны,
Дзень мой ласкавы.

Водар хваёвы,
Сіняе неба,
Кожнае ранне
Рады я хлебу.
Рады я ўсходам
Веснімі днямі
І як гамоніць ён каласамі.
Большай не маю
Сёння патрэбы —
Кожнае ранне
Рады я хлебу.

## РЫГОР БАРАДУЛІН

### Загадкі на градках

У гародзе каля градак
Шмат цікавых ёсць загадак.
Той, хто градкі даглядае,
Той загадкі адгадае.
От бабуля важна села
І глядзіць навокал смела.
У зямлю схавала лапаць.
Як зачэпіш,
Будзеш плакаць.
Гэта злосная бабуля
Называецца ... .

У бабулі родны брат
Ласкавейшы быццам.
А да слёз давесці рад
Так, як і сястрыца.
Ты не вельмі плач, сынок,
Калі шчыплецца ... .

Не сыдзе з месца
Ні на крок,
Зарыўшыся ў пярыну.
Цярэбіць ціхі вецярок
Зялёную чупрыну.
Ды выцягнуць з пярыны —
Пачырванее небарак.
Вядома, што гэта — ... .

І не Маша,
І не Галя,
А дзяўчына ў крыўдзе —
За касу яе цягае
Кожны, хто ні прыйдзе.
Абмінаюць вельмі рэдка,
Бо яна завецца ... .

Гэта што за важны туз,
Хвост зялёны,
Чэпкі вус?

Усім вядомы
Карапуз
Пузан Пузанавіч ... .

З вусамі,
А не стары.
Зайздросныя вочы.
За што-небудзь
На двары
Учапіцца хоча.
Хопіць хітрасці
На трох.
Ну, на тое ж ён ... .

## ВІТАЛЬ ВОЛЬСКІ

### Вавёрка

Увосень вавёркі кормяцца арэхамі і рыхтуюць сабе запасы на зіму. Арэхі і жалуды вавёрка хавае ў глыбокім дупле старога дрэва. Прынясе арэх ці жолуд і кіне ў дупло. Робіць яна кладоўкі і пад каранямі дрэў.

У такіх кладоўках вавёрка трымае толькі добрыя арэхі. Яна ўмее адрозніваць арэх з добрым зернем пад шкарлупкай ад пустога ці чарвівага.

Вавёрка — дбайная і клапатлівая гаспадыня. На зіму яна нарыхтоўвае сабе запасы не толькі з арэхаў і жалудоў. Вавёрка збірае і грыбы.

Вы ідзяце па лесе і раптам бачыце ў сябе над галавой апеньку на дрэве. А вось тырчыць недалёка ад яе на адзінокім голым сучку і другі грыбок!

Якім чынам трапілі яны сюды? Грыбы ж на дрэве не растуць. Ды яшчэ так высока над зямлёй!

Хто іх тут прымацаваў?

Гэта работа вавёркі.

Грыбы сохнуць на паветры і зімой спатрэбяцца гаспадыні.

## КЛАЎДЗІЯ КАЛІНА

### Кастрычнік

Трэ Кастрычнік лён, аж кастрыца ляціць стаўбом. Спяшаецца ён да замаразкаў кужаль выткаць і вопратку сабе пашыць. Пачулі пра замаразкі павучкі і напалохаліся.

— Ой, што нам рабіць? — пачалі бедаваць. — Змерзнем мы ў замаразкі, загінем без вопраткі.

І пайшлі павучкі да Кастрычніка, каб той навучыў іх ткаць кужаль.

— Добра, навучу, — згадзіўся Кастрычнік і даў кожнаму павучочку льну па снапочку.

— Перш-наперш гэты лянок трэба вымачыць, потым высушыць, затым пацерці... — навучаў ён павучкоў, — далей трэба лянок вытрапаць і вычасаць, кудзелечку скласці і танюсенька спрасці. Нітачкі тыя ў аснову на кросенкі навіць. Нарэшце нітачку ў чаўнок — і тчыце сабе кужалёк!

Падзякавалі павучкі Кастрычніку і ўзяліся за работу. Прадуць павучкі кужалёк, а што далей з ім рабіць, забыліся. Адны кажуць: «Трэба зноўку кужалёк мачыць!» Другія пярэчаць: «Трэба сушыць». Трэція крычаць: «Трэба часаць». А да ладу не могуць дайсці.

Так кожненькі год і спрачаюцца паміж сабою павучкі. Напрадуць нітачак, цягнуць іх па зямлі і не ведаюць, што далей з імі рабіць. І ляціць

разам з маленькімі павучкамі над палямі беленькі кужалёк — бабіна лета.

Паглядзіце ў кастрычніку на палі, лугі, лясы... Колькі таго серабрыстага кужалю павучкі напралі!

## ПРЫКАЗКІ І НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ

Увосень — работ восем.

Увосень і верабей багаты.

Багата вясна кветкамі, а восень палеткамі.

Садок пасадзіў — добрую справу зрабіў.

Журавы ляцяць высока — зіма яшчэ далёка.

Вялікія мурашнікі ўвосень — на суровую зіму.

Шмат жалудоў на дубах — на цёплую зіму.

## Тэматыка чытання:
# ШТО Ў НАРОДЗЕ СКАЖУЦЬ — ЯК ВУЗЕЛ ЗВЯЖУЦЬ...

*Доўга скарб збіралі гэткі*
*І матулі,*
*І дзядулі,*
*Каб яго пачулі дзеткі,*
*Каб дарослыя пачулі.*

П. Макаль

## КАЛЫХАНКІ

### Люлі-люлі

Ой, люлі-люлі,
Ветры ў полі загулі.
Ехаў каток ды па дровы,
Загарэлася дуброва.
Пайшоў каток ваду насіці,
Стаў дубровачку тушыці.
Ехаў каток ды па сена,
Забалела калена.
Трэба катка ў хату ўзяці,
Каб пеў баінькі дзіцяці.
Ой, люлі-люлі,
Ветры ў полі загулі.

## Ходзіць сон каля акон

Ходзіць сон каля акон,
А дрымота каля плота.
І пытае сон дрымоту:
— Дзе мы будзем начаваць?
— Дзе хацінка цяпленька,
Дзе дзетачка маленька,
А мы пойдзем начаваць
І дзіцятку калыхаць.

## Люлі, люлі, ўсе паснулі...

Люлі, люлі, ўсе паснулі,
А сыночак (дачушка) спаць не хоча.
Люлі, люлі, люлі. Люлі, люлі, люлі.
Засынаюць кураняткі
Пад крыламі сваёй маткі.
Люлі, люлі, люлі. Люлі, люлі, люлі.
Шэры коцік спіць у куце,
І сабачка спіць у будзе.
Люлі, люлі, люлі. Люлі, люлі, люлі.
А па сенцах ходзіць бай —
Спі, сыночак (дачушка), засынай!
Люлі, люлі, люлі. Люлі, люлі, люлі.

## ЗАБАЎЛЯНКІ

### Чыкі, чыкі, сарока

(Той, хто забаўляе, бярэ ў сваю левую руку ручку дзіцяці і трымае яе далонькай уверх. Пальцам сваёй правай рукі стукае ў далоньку дзіцяці і расказвае забаўлянку.)

Чыкі, чыкі, сарока
Прыляцела здалёка,
Села ў пана на таку,
Меле крупы на муку.
А пан кажа: «Засяку!
Ў мяне шабля пры баку».
«Хоць і шабля пры баку,
Ад цябе я ўцяку!»

(Пры апошніх словах дарослы лёгенька ўзмахвае рукамі дзіцяці і кажа: «Па-ля-це-ла!»)

### Гоп-гоп, і-га-га...

Гоп-гоп, і-га-га.
На буланцы едзець Янка,
Паўтараста рублёў санкі,
Пяцьдзясят рублёў дуга,
А кабылка паўрубля.
Гоп-гоп, і-га-га!

**Мышка, мышка, дзе была...**

— Мышка, мышка, дзе была?
— Была ў пана караля.
— Што рабіла? — Лыжкі мыла.
— А што далі? — Кусок сала.
— Дзе паклала? — Пад лаўкаю.
— Чым накрыла? — Халяўкаю.
— Дзе падзела? — Кошка з'ела.

## ЛІЧЫЛКІ

***

Аты-баты, йшлі салдаты,
Аты-баты, на базар.
Аты-баты, што купілі?
Аты-баты, самавар.
Аты-баты, колькі стоіць?
Аты-баты, тры рубля.
Аты-баты, хто выходзіць?
Аты-баты, гэта я.

***

Раз, два, тры, чатыры, пяць —
Я іду шукаць.
Хто перада мной стаіць,
Той у агні гарыць.
Раз, два, тры —
Гэта, верна, будзеш ты.

## ЗАГАДКІ

Без станка і без рук, а кросны тчэ. *(Павук)*

Маленькі шарык пад лаўкай шарыць, збірае крошкі, баіцца кошкі. *(Мышка)*

Маленькія лапкі, на лапках царапкі, мякка ступае, мышак выглядае. *(Кот)*

Прыйшла чорная маці, усіх паклала спаці. *(Ноч)*

Поле не змерана, авечкі не лічаны, пастух рагаты.
*(Неба, зоркі, месяц)*

Два браты глядзяцца ў ваду, а ніколі не сыдуцца. *(Берагі)*

Стукае, грукае, а нідзе яго не відаць. *(Гром)*

Я засцілаю дол ігліцай, спрадвеку слаўлюся жывіцай. *(Сасна)*

Стаяць слупы бялёныя, на іх шапкі зялёныя. *(Бярозы)*

Адзін лье, другі п’е, трэці расце.
*(Дождж, зямля, трава)*

Белячок-таўсцячок пад кустом лёг на бачок. (*Баравік*)

На агні не гарыць, у вадзе не тоне. (*Лёд*)

Ляцяць птушкі без крыл, на дрэвы садзяцца без ног. (*Сняжынкі*)

Без голасу, а вые, без рук, а абрусы сцеле. (*Мяцеліца*)

Цякло, цякло і лягло пад шкло. (*Рака пад лёдам*)

Вясна прыгрэе, шубу надзене; зіма наступае, шубу скідае. (*Лісцевае дрэва*)

Сядзіць пані ў жупане, хто жупан здзірае, той слёзы пралівае. (*Цыбуля*)

Лата на лаце і шва не відаці. (*Капуста*)

Скрыначка на тры вуглы, поўныя мукі. (*Грэчка*)

Сама пані ў каморы, а яе косы на двары. (*Морква*)

Малы малышак упаў з вышак, не так забіўся, як шапкі пазбыўся. (*Жолуд*)

Без языка жыве, не есць, не п’е, а гаворыць. (*Радыё*)

Не доктар, а дрэвы лечыць. (*Дзяцел*)

Не агонь, а пячэцца. (*Крапіва*)

## ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ

Не той друг, хто мёдам мажа, а той, хто праўду кажа.

Кожнаму мілая хатка, дзе радзіла яго матка.

Хто за Радзіму гарой, той сапраўдны герой.

Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы.

У сваім краі, як у раі.

Для ўсякай птушкі сваё гняздо міла.

Чалавек без працы, што птушка без крылаў.

Кожная сасна свайму бору песню спявае.

Адным пальцам і гузік цяжка зашпіліць.

Сёння зробіш — заўтра як знойдзеш.

Узяўся за гуж — не кажы, што не дуж.

Рэшатам вады не наносіш.

Хто позна ўстае, той хлеба не мае.

Ляжачага хлеба нідзе няма.

Гультай за работу — мазоль за руку.

Ранняя птушка дзюбку цярэбіць, а позняя — вочкі працірае.

Ласкавае слоўка, як сонейка, грэе.

Птушцы воля — чалавеку мір.

Добрая слава даражэйшая за багацце.

Ласкавае слова — што дзень ясны.

Добрае жалеза не ржавее, добры чалавек не забываецца.

Пры сонейку цёпла, пры мамачцы добра.

У няўмечкі не баляць ні ручкі, ні плечкі.

Колас, што зярнят не мае, угору лоб задзірае.

Чалавек без сяброў — што дрэва без каранёў.

Чалавек без друга — што яда без солі.

Трашчыць сарока — чуваць далёка.

Старога паважай, малога павучай.

Хто многа абяцае — рэдка слова трымае.

Хто баіцца, таму ў вачах дваіцца.

Баязліваму і свой цень страшны.

Кіем галавы не дастанеш.

Меней гавары, болей рабі.

У чужых руках пірог вялікі.

## КАЗКІ

### Зайкава хатка

Жылі-былі ў лесе лісічка і зайчык.

Жылі яны непадалёку адзін ад другога. Прыйшла восень. Холадна

стала ў лесе. Надумаліся яны хаткі на зіму пабудаваць. Лісічка збудавала сабе хатку з труску-сняжку, а зайчык з труску-пяску. Перазімавалі яны ў новых хатках. Настала вясна, прыгрэла сонца. Лісічкіна хатка растала, а зайкава стаіць, як стаяла. Прыйшла лісіца ў зайкаву хатку, выгнала зайку, а сама ў яго хатцы засталася. Пайшоў зайка са свайго двара, сеў пад бярозкаю ды плача. Ідзе воўк. Бачыць — зайка плача.

— Чаго ты, зайка, плачаш? — пытае воўк.

— Як жа мне, зайку, не плакаць? Жылі мы з лісічкаю блізка адзін каля аднаго. Пабудавалі мы сабе хаты: я з труску-пяску, а яна з труску-сняжку. Настала вясна. Яе хатка растала, а мая стаіць, як стаяла. Прыйшла лісічка, выгнала мяне з мае хаткі і сама ў ёй жыць засталася. Дык вось я сяджу ды плачу.

— Не плач, зайка. Пойдзем, я табе памагу, праганю лісічку з твае хаты.

Пайшлі яны. Прыйшлі. Воўк стаў на парозе зайкавай хаткі і крычыць на лісічку:

— Чаго залезла ў чужую хату? Злазь, ліса, з печы, а то скіну, паб'ю табе плечы.

Не спалохалася лісічка, адказвае воўку:

— Ой, воўк, сцеражыся: мой хвост, як дубец, — як дам табе, дык будзе канец.

Перапалохаўся воўк ды наўцёкі, і зайку аднаго пакінуў. Сеў зноў зайка пад бярозкай ды горка плача. Ідзе праз лес мядзведзь. Бачыць — зайчык сядзіць пад бярозай і плача.

— Чаго, зайка, плачаш? — пытае мядзведзь.

— Як жа мне, зайку, не плакаць? Жылі мы з лісічкаю блізка адзін каля аднаго. Пабудавалі мы сабе хаты: я — з труску-пяску, а яна — з труску-сняжку. Настала вясна. Яе хатка растала, а мая стаіць, як стаяла. Прыйшла лісічка, выгнала мяне з мае хаткі і сама там жыць засталася. Дык вось я сяджу ды плачу.

— Не плач, зайка: пойдзем, я табе памагу, праганю лісічку з тваe хаты.

Пайшлі яны. Прыйшлі. Мядзведзь стаў на парозе зайкавай хаткі і крычыць на лісічку:

— Нашто адабрала ў зайкі хатку? Злазь, ліса, з печы, а то скіну, паб'ю табе плечы.

Не спалохалася лісічка, адказвае мядзведзю:

— Ой, мядзведзь, сцеражыся: мой хвост, як дубец, — як дам, дык будзе табе канец.

Спалохаўся мядзведзь ды наўцёкі, і зайку аднаго пакінуў. Зноў пайшоў зайка са свайго двара, сеў пад бярозкаю ды горка плача. Аж бачыць — ідзе праз лес пеўнік. Угледзеў зайчыка, падышоў і пытае:

— Чаго, зайка, плачаш?

— Ды як жа мне, зайку, не плакаць? Жылі мы з лісічкаю блізка адзін каля аднаго. Пабудавалі мы сабе хаты: я — з труску-пяску, а яна — з труску-сняжку. Настала вясна. Яе

хатка растала, а мая стаіць, як стаяла. Прыйшла лісічка, выгнала мяне з мае хаткі і сама там жыць засталася. Вось я сяджу ды плачу.

— Не плач, зайка: я выганю лісу з твае хаткі.

— Ой, Пеценька, — плача зайка, — дзе табе яе выгнаць? Воўк гнаў — не выгнаў. Мядзведзь гнаў — не выгнаў.

— А вось жа я выганю. Пойдзем, — кажа пеўнік.

Пайшлі. Увайшоў пеўнік у хатку, стаў на парозе, кукарэкнуў, а потым як закрычыць:

Я — пятух-чабятух,
Я — пявун-лапатун,
На кароткіх нагах,
На высокіх пятах.
Нясу касу на плячы,
Хачу ліску засячы.

А лісічка ляжыць ды кажа:

— Ой, певень, сцеражыся: мой хвост, як дубец, — як дам, дык будзе табе канец.

Скочыў пеўнік з парога ў хату ды зноў крычыць:

Я — пятух-чабятух,
Я — пявун-лапатун,
На кароткіх нагах,
На высокіх пятах.
Нясу касу на плячы,
Хачу ліску засячы.

І — скок на печ да ліскі. Дзюбануў лісу ў спіну. Як усхопіцца лісіца ды як пабяжыць вон з зайкавай хаткі, а зайка і дзверы зачыніў за ёю.

І застаўся ён жыць у сваёй хатцы разам з пеўнікам.

*Апрацоўка Я. Коласа.*

**Зайчыкі**

Селі два зайчыкі ў лясочку пад бярэзінкаю, грэюцца на сонейку і гутараць.

А ў лясочку так добранька!.. Мушкі гудуць, адна за адною ганяюцца, крыльцамі звоняць, як бы смяюцца. А там дроздзік пасвіствае, хлопчыка Піліпку падражнівае:

— Пюліп! Пюліп!

А Піліпка па верасочку з кошыкам ходзіць, на баравічкі прыглядаецца.

Яшчэ далей зязюлька кукуе.

Ну так ясна, цёпла, весела!

Але нявесела зайчыкам, невясёлыя гутаркі іх.

— Ох, якая горкая долечка наша, — кажа адзін зайчык. — Бойся кожны дзянёчак, трасіся кожную часінку, хадзі, прыслухоўвайся, ці не ходзіць вораг твой блізка.

— А колькі ў нас ворагаў? Хто толькі не крыўдзіць нас, бедных зайчыкаў!

— Крыўдзяць нас людзі, крыўдзяць звяры; нават птушкі-драпежнікі — каршуны, совы, пугачы — і тыя нас, зайчыкаў, ушчуваюць.

— І як бараніцца нам ад злых нашых ворагаў? Чым ратавацца? Адна толькі надзея на нашы ножкі: выбавяць з бяды — наша шчасце, а не выбавяць — прапала наша шкурка!

І заплакалі горкенька зайчыкі. Плачуць і слёзкі лапкамі выціраюць.

— Ці ж можна нам жыць на свеце? — кажа другі зайчык. — Ніхто

не баіцца нас, — ну, ніхтосенькі!.. Пойдзем, хіба, ды ў ваду кінемся.

Наплакаліся, надумаліся бедныя зайчыкі і пайшлі ў возера тапіцца з гора. Прыйшлі да возера, прыпыніліся, развіталіся. Да самага беражка падышлі, каб у ваду кінуцца, аж бачаць — скок жаба на купіну: убачыла зайчыкаў і спалохалася.

— Эге, — кажа адзін зайчык, — ёсць жа на свеце стварэнні, што і нас баяцца. Відаць, ім яшчэ цяжэй на свеце жыць.

Глянулі зайчыкі адзін на аднаго і пабеглі назад.

*Апрацоўка Я. Коласа.*

## Вол і асёл

Жылі на адным двары вол і асёл. Вол рабіў цяжкую работу — у ярме хадзіў, асёл толькі калі-нікалі гаспадара ў вазку вазіў.

Вось аднаго разу прыйшоў з работы вол, цяжка ўздыхнуў.

— Чаго ты, вол, уздыхаеш? — пытаецца асёл. — Мала сена гаспадар падкінуў, ці што?

— Не, брат асёл, — адказвае вол, — сена не мала. Ды ўспомніў, што і заўтра цаліну араць трэба. А гэта, браток, не песні табе спяваць — і-а, і-а...

— Э, — кажа асёл, — нас, аслоў, дурнямі лічаць, а ты яшчэ дурнейшы, дык і цягнеш сваё ярмо дзень пры дні.

— А што? Ты за мяне пацягнеш?

— Яшчэ чаго захацеў! — сказаў асёл. — Хопіць мне і калёс.

Вол махнуў хвастом:

— Ат, не можаш памагчы, дык лепш памаўчы.

Асёл памаўчаў, а потым зноў за сваё ўзяўся:

— Хочаш, навучу цябе, як ад ярма выкруціцца?

Вол натапырыў вушы, зацікавіўся:

— Ну, ну, навучы, брат асёл. Хоць бы дзень-другі ў хляве адстаяцца ды адляжацца.

— Заўтра, як выведзе цябе гаспадар з хлява, вазьмі ды закульгай, скачы на трох нагах. Вось ён і не паедзе араць на табе.

Ну, вол так і зрабіў, як асёл навучыў.

Паглядзеў назаўтра гаспадар на кульгавага вала, пачухаў патыліцу:

— Што ж рабіць? Ці не запрэгчы асла? Ён, відаць, выгуляўся, у хляве стоячы.

І запрог гаспадар асла ў плуг.

Нездарма ж кажуць: «Навучыў на сваю галаву!»

## СКОРАГАВОРКІ

Твая маці й мая маці
Пяклі булкі ў адной хаце.

Каток нітак клубок
Закаціў у куток.

Ехаў Пракоп з Пракопіхаю і малым Пракапяняткам.

Прыручыць сароку —
Адна марока,
А сорак сарок —
Сорак марок.

Рак улез у лак —
І блішчыць ад лаку рак.

Лезь, залезь,
Залезшы, злезь.

## Тэматыка чытання:
## СНЕГ ІСКРЫЦЦА ПАД НАГАМІ...

*У зімы тры сыны,*
*Снежань, студзень, люты.*
*Як адзін — усе яны*
*У ільды закуты.*
*Снежань снежыць —*
*Вецер смешыць.*
*Студзень студзіць —*
*Буры будзіць.*
*Люты сцюжамі лютуе —*
*Ад вясны снягі вартуе.*

Л. Пранчак

### ЯНКА КУПАЛА

### Зімой у лесе

І лягла ж цішына
У бары за гарой, —
Каб дравінка адна
Хоць кіўнула сабой.

Снег пушаны залёг
На галінах сасон,
І чарнобель, і мох
Атуліў сабой ён.

Сокат птушак замёр,
Як бы поўнач была,
Адно свісне тапор
Ды зазвоне піла.

Гэта сілу сваю
Так прабуе мужык;
Рухнуў дуб на зямлю,
Як магуч і вялік...

Далей — глуш, цішына
У бары, за гарой, —
Каб дравінка адна
Хоць кіўнула сабой.

## ЯКУБ КОЛАС

### Зіма

*Эх ты, зіманька-зіма!*
*Непагодная была:*
*Ні праехаць, ні прайсці,*
*Ні коніка правесці!*

З народных песень

Крэпка скаваў мароз голую зямлю, зрабіў яе цвёрдай, як камень. Вымерзлі лужынкі, высахла гразь; халодная кара лёду легла на рэкі і азёры. Цвёрдую пасцельку прыгатаваў мароз для мяккага белага снегу.

Чакае ўсё гэтага снегу, каб закрыцца хоць гэтай халоднай коўдрай ад пякучага марозу.

Вось падуў сівер, і папаўзлі па небе снегавыя хмары, сівыя, лёгкія, як дым, халодныя, непрыветныя, і завалаклі ўсё неба. Вось, ціха лётаючы па ветру, закружыўся белы, лёгкі пушок, камячок снегу, перавярнуўся некалькі разоў, памкнуўся з аднае стараны ў другую, як бы выглядаючы лепшае месца, і нячутна лёг на мёрзлую зямлю. За ім паказаўся другі, трэці, і ўсё часцей, усё гусцей залёталі гэтыя белыя, халодныя матылёчкі зімы і пасыпаліся на зямлю. І як жа многа іх закружылася ў небе! Аж пабялеў воздух, і белая сетка сплятаецца з іх. Валяць і валяць белыя сняжынкі; адзін аднаго пераганяюць гэтыя харошанькія камячкі, злепліваюцца ў паветры і кладуцца на зямлю. Борзда бялее зямля. Снег роўнаю плёнкаю кладзецца на хаты, на гумны, на паркаы, на платы, на шулы, на ўсё, што ні сустрэне прад сабою.

Назаўтра, праз ноч, выходзіш на двор. І пазнаць трудна божы свет: так адмяніў яго снег! Гляньце на шулы! Дапраўды, аж смешна: стаяць усе ў рад і ў кожнай наверсе па белай шапцы-кучомцы; стаяць, пазіраюць, усё роўна як у госці прыйшлі. На стрэхах ляжыць цэлы слой снегу, як хто палотны парассцілаў. Куды ні кінь вокам, усюды бела і бела, аж вочы адбірае. Вунь стары лес. Адзеўся, прыбраўся, як у свята, і глядзіць, як немаведама хто. Проста дзіваў натварыў гэты снег-жартаўнік: цэлае войска прывёў за ноч старых баб і дзядоў!

Прыціхла рэчка, і закрыў яе зусім снег, так што і берагоў не відаць. Усюды, куды ні глянь, адна белая пялёнка снегу. І луг, і поле, і горкі — усё засыпана белым халодным пухам.

Весела выскачылі на вуліцу з хаты дзеці. Рады яны першаму снегу. Бегаюць, крычаць, пхаюць адзін аднаго ў гурбы, кідаюцца снегам. Але з зімою малыя жарты: шчыпне яна

і за нос, за вушы, і бягуць дзеці з двара ў хату.

— На печ лезьце! — крыкне на іх бацька ці маці.

## Два маразы

Гулялі па полі два маразы, два родныя браты: мароз Сіні-нос і мароз Чырвоны-нос.

Гуляюць-пагульваюць маразы, адзін аднаго пахвальваючы. А ноч ясная-ясная. Прасторна маразам на волі. А ціха, так ціха, нібы жывой душы не засталося на свеце. Перабеглі маразы з поля на лес. Бегаюць, палускваюць, з дрэва на дрэва пераскокваюць, зайчыкаў палохаюць. З лесу ў вёску заскочылі і давай па даху страляць.

— Эге, — кажа мароз Сіні-нос, — усе пахаваліся, баяцца на двор вылезці.

— Няхай толькі вылезе хто: задамо яму страху, — адказвае мароз Чырвоны-нос.

Пачало развідняцца. Паваліў з комінаў дым густы. Заскрыпелі кало-

дзежы. Павыходзілі мужчыны з хат. Хто малаціць пайшоў, хто ў лес па дровы збіраецца.

— Стой жа, брат, — сказаў мароз Чырвоны-нос. — Пабяжым жа мы на дарогу ў поле.

І пабеглі яны зноў у поле; стаяць, прытуліўшыся, падарожных чакаюць.

Заскрыпелі сані на дарозе. Зазваніў дзесь званочак пад дугою.

У санях селянін сядзіць, коніка паганяе. А ззаду за ім зухаўскі вазок плыве. Званочак пазвоньвае.

— Ну чакайце ж вы, — кажа мароз Сіні-нос. — Ты бяжы за мужыком, а я за панам паганюся.

І пабеглі яны падарожных марозіць. Доўга бег мароз Сіні-нос, пакуль пана дагнаў. Нарэшце дагнаў, пад футра залез, цяпло выганяе адтуль. Пацічкаецца пан, ногі зябнуць, холад па целе пайшоў, панскі нос пасінеў. А мароз Сіні-нос толькі пасмейваецца. Ледзь да смерці пана не замарозіў. А мароз Чырвоны-

нос дагнаў селяніна і давай яго марозіць.

— Эге, мароз не жартуе, — кажа селянін. Злез ён з саней, бяжыць, нагамі тупае, рукамі аб плечы б'е. Прабег так з паўвярсты, аж горача стала яму. Сеў сабе на сані, едзе — і гора мала.

— Ну пачакай ты, брат: прайму я цябе, як ты дровы сячы будзеш.

Заехаў чалавек у лес. А мароз Чырвоны-нос выперадзіў яго, у лесе чакае. Выпраг коніка селянін, сякеру ўзяў ды як пачаў секчы — горача стала яму. Скінуў кажух. А мароз і ўзрадаваўся: залез у кажух і давай там белыя кросны ткаць.

Зрабіўся кажух белы, як снег. Насек дроў чалавек, да кажуха ідзе, а ён увесь абмёрз.

— Эге, браток, дык ты тут!

Узяў пугаўё ды як стаў малаціць — ледзь жывы выскачыў мароз Чырвоны-нос ды драла ў лес.

Узлаваўся мароз Чырвоны-нос на селяніна, але ніякай рады даць яму не можа.

## ЗМІТРОК БЯДУЛЯ

### Сняжынкі

Сняжыначкі-пушыначкі
Ляцелі матылькамі,
Над хмызамі над шызымі
Дыміліся дымкамі.

Зіхцеліся, мігцеліся
У розныя калёры.
Драбнюткія, пякнюткія,
Як зоранькі, як зоры.

Насіліся, кружыліся
Над ціхімі палямі.
Даліначкі сняжыначкі
Пакрылі дыванамі.

Над елкамі, над хвойкамі
Спявалі песні-баі:
«Мы хатачкі-палатачкі
Будуем тут у гаі.

Маленькія, міленькія,
Дзіцяткі-птушаняткі,
Ляціце вы, скачыце вы
У светленькія хаткі!

Вушастыя, пушыстыя,
З драцінкамі-вусамі
Вы, зайчыкі-малойчыкі, —
У хаткі к нам таксама!»

Сняжыначкі-пушыначкі
Спявалі песні-баі:
«Мы хатачкі-палатачкі
Будуем тут у гаі».

## МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

### Завіруха

У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе,
І спеў ліецца ўсё мацней, —
Гулянку справіў пан Падвей.
У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе.
Ўскіпела снежнае віно,
І белай пенай мкне яно.
У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе.
Па вулках вее дзікі хмель,
Гудзіць сп'янелая мяцель.
У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе.

Тэматыка чытання:

# ВЯСНА, ВЯСНА ЖАДАНАЯ!

*Вясёлы спеў*
*Прыветлівы*
*Вады ў руччах*
*Пачуецца.*
*Ачнецца гай*
*І з песнямі*
*Ў зялёны ліст*
*Адзенецца.*

Я. Колас

## ЗМІТРОК БЯДУЛЯ

### Вясна

То не снег,
То чаромха цвіце.
То не снег,
То бярозка расце.
То не снег —
Расцвітае садок.
То не снег,
А ляціць матылёк.
То не шоўк —
Гэта рунь ля гары.
То не шоўк,
А сон-цвет у бары.

То не шоўк,
А мурожны лужок.
То не шоўк —
Маладзенькі лянок.
Не гусляр —
То пяюць салаўі.
Не гусляр —
То звіняць ручаі.
Не гусляр —
Дрозд у гаі пяе.
Не гусляр —
Гэта пчолка гудзе.
Ах, вясна
Маладая мая!
Пад табой
Ажывае зямля.
Пад табой
І звініць і пяе
Нават жук...
Нават мушка ў траве.

## КЛАЎДЗІЯ КАЛІНА

### Песня вясны

(Казка)

Злая Зіма пасля доўгай вандроўкі падалася назад у свой край, дзе

ніколі не бывае Лета, дзе ўсё закута ў лёд і занесена снегам.

Яна ішла па дрымучым лесе. А следам з мяшком снегу за плячамі бегла Завея. Яе сівыя кудлы былі не прычэсаны, адзенне вісела на ёй пашарпанымі шматкамі.

— У-у-у-у! — жаласна завывала Завея. — Гэта бязлітаснае Сонца так рада Вясне, што хоча загубіць нас.

— Не выходзь на прагаліны, трымайся ценю, — сказала Зіма.

А за імі з праталінкі на праталінку бегла басаногая Вясна. На плячах у яе сядзелі дзве птушкі і весела спявалі:

Уцякай, злы Мароз,
Кідай санкі, бяры воз!

Там, дзе ступала Вясна, падымала галоўку блакітная кветачка пралеска. Яна выпроствала сваю зялёную ножку і цягнулася ўсё вышэй і вышэй да Сонца.

Убачыла Зіма пралеску, азірнулася і гнеўна пагразіла Вясне:

— Я замарожу твае кветкі!

Вясна ўсміхнулася, кіўнула на блакітнае неба і адказала на пагрозу:

— Паслухай, як заліваецца звонкай песняй жаваранак. Яго ты не замарозіш. А гэта мой пасланец.

Злосная Зіма закрычала што мела сілы на Вясну:

— Рана ты смяешся! Глядзі! — І дзьмухнула Зіма холадам на блакітную кветачку, а Завея страсянула галавой, заматляла сваімі кудламі і сыпнула з мяшка снегам.

Вясна знікла ў снежнай завірусе. Зіма ўзрадавалася сваёй сіле. Яна бачыла, як упалі шэранькімі камячкамі і схаваліся ў кустах жаваранкі, як паніклі і апусцілі галоўкі пралескі.

— Ха-ха-ха! — зарагатала Зіма. — Хто з нас дужэйшы? Дзе твае кветкі, Вясна? Чаму змоўк жаваранак? Я ўсё загубіла, усё памарозіла. А мая служка Завея замяла іх снегам, пахавала навекі.

Выйшла Зіма з-пад густых ялін на паляну, радасна паглядзела на

засыпаную снегам зямлю і гукнула зноў:

— Прыгажуня Вясна, хто тут гаспадыня, я ці ты?

Пачула гэта ласкавае Сонца, выглянула з-за хмар і сваімі цёплымі праменнямі прайшлося па зямлі. Адразу падняўся ўгору жаваранак. Зноў палілася ў вышыні цудоўная песня Вясны і Сонца. Зноў падняла галоўку сіняя пралеска. Памытая снегавой вадой, яна яшчэ больш пахарашэла.

Застагнала ад лютай злосці Зіма, падхапіла Завею ды ходу далей, на поўнач.

## Фіялка

Увесну пад старою ліпаю расцвіла маленькая Фіялка. Яна з цікавасцю паглядзела навокал і ўбачыла, што ўсе яе суседкі яркія і высокія і над імі кружацца прыгожыя матылькі. А да яе, маленькай кветкі, ніхто не прылятаў, і яна самотна цвіла ў густой траве.

— Ах! — жаласна ўсклікнула Фіялка. — Чаму я такая няшчасная? Ні адзін матылёк не можа знайсці мяне. Лепш бы я зусім не цвіла.

І раптам яна пачула прыемнае гудзенне... Гэта Пчала закружылася над ёю і апусцілася на сінія пялёсткі.

— Як ты мяне знайшла? — спытала радасна кветка. — Я ж такая маленькая і непрыкметная!

— У цябе цудоўны пах, — прагула Пчала.

— Няўжо? — здзівілася Фіялка. — Нават лепшы, чым у тых жоўтых?

— Лепшы. Ты самая цудоўная з ранніх кветак. І я часта буду прылятаць да цябе.

Пчала дакранулася да кветкі, узяла кропельку духмянага нектару і паляцела ў вулей.

І маленькая Фіялка яшчэ пышней расцвіла, павесялела. Яна адчула сябе самай шчаслівай на веснавой зямлі. Пчала абмінула многа яркіх высокіх кветак, а знайшла яе, маленькую, непрыкметную, у траве.

## ВАСІЛЬ ВІТКА

### Вясна

Паміж снегу ў лесе — дзіва,
Хто ні гляне, скажа: ах!
Я агеньчык зіхатлівы
Радасна нясу ў руках.
Горнуцца дубы, бярозы
Голлем да майго цяпла.
Больш не вернуцца марозы —
Я пралеску прынясла.

### Сонейку

Соня,
Соня, Сонейка!
Зашумела голейка.

Пачынаецца
Вясна,
Прачынаецца
Сасна.

Точыць
Дзяцел
Долата,
Сыпле
Долу
Золата.

Соня, сонейка, ўставай,
Дзень шчаслівы пачынай,
І мне, любае, свяці
Ты заўсёды
У жыцці!

## ПАВЕЛ ТКАЧОЎ

### Зямля прачынаецца

Сяргейка саскочыў з ганка і пабег па сцяжынцы, што вядзе ў сад. Там хлопчык убачыў дзядулю. Ён зграбаў леташняе лісце.

— Навошта ты гэта робіш? — спытаў Сяргейка.

— Трэба, унучак, — адказаў дзед. — Збяром лісце — зямлі лягчэй дыхаць будзе. Яна ж цяпер пасля зімы прачынаецца.

Ніколі Сяргейка не чуў, што зямля дыхае. Мусіць, дзядуля жартуе.

— Як жа яна дыхае?

— А ты прыглядзься больш уважліва, — сказаў дзед. — Тады і ўбачыш.

Сяргейка паглядзеў у адзін бок, у другі. У ранішніх праменнях сонца падымаліся ледзь прыкметныя струменьчыкі па́ры...

**Тэматыка чытання:**

# З ЧАГО ЧАЛАВЕК ПАЧЫНАЕЦЦА...

*Добра, калі ты змалку*
*Можаш вітаць людзей.*
*Раніцай: — Добрага ранку!*
*А апоўдня: — Добры дзень!*
*Увечары пры сустрэчы*
*Знаёмым сказаць:*
*— Добры вечар!*
*А соннаму сонейку нанач*
*І ўсім добрым людзям:*
*— Дабранач!*

В. Вітка

## ЕЎДАКІЯ ЛОСЬ

### Казка пра Ласку

Ціха, дзеці,
Паслухайце казку
Пра дзяўчынку харошую —
Ласку!

Дзе жыве яна,
Як выглядае,
З кім сябруе,
Каму памагае.

***

Неяк Ласку угледзеў
Сяргейка,
Хоць і слёзы блішчалі
На вейках.

Захварэў неўспадзеўкі
Хлапчына.
Сінява залягла
Пад вачыма.

Парашкі ён глытаў
І пілюлі,
Смеху хлопчыка
Доўга не чулі.

І тады да ягонага
Ложка
Падышла, нібы цень,
Басаножка.

Падышла неўзаметку
Малая,
За плячыма —
Каса залатая.

— Ты Сяргейка? —
Пытае ласкава
І плыве каля ложка,
Як пава.

— Ты хвараеш?
Замучылі лекі?
Пацярпі,
Не хвалюйся, маленькі!

Хочаш — коўдру тваю
Я папраўлю!
Хочаш — кветак у шклянку
Пастаўлю!

Каля хворага
Без адпачынку
Завіхаецца
Тая дзяўчынка.

Лоб малога пагладзіла,
Бровы, —
І Сяргейка заснуў,
Як здаровы.

І у сне ўжо,
Што быў нібы казка,
Ён пытае:
— Скажы, калі ласка,
Хто ты?
— Ласка.
— Якая?
— Такая,
Што маленькім
Заснуць памагае.

— Дык застанься са мной,
Мая Ласка!
— Я спяшаю ў калгас,
Да Тараскі!

І, махнуўшы хусцінкаю
Белай,
Неўпрыкметку пайшла,
Паляцела.
Ціхі хлопчык
Ажно засмяяўся:
Ён з хваробай сваёй
Развітаўся!

***

Пасварылася з Надзяй
Ларыска.
І за што?
З-за малочнай ірыскі!
Да дзяўчынак прыходзіла
цёця.
Надарыла цукерак блазноце.
І дражэ, і «падушак»,
і «мішак»...
Немалое багацце ў малышак!
Адно цешся з салодкіх
І еш
Ды сябровак частуй ты...
Дык не ж!

Стала крыўдна старэйшай —
Ларысцы,
Што ў Надзеі —
Яшчэ і ірыскі!

Вось старэйшая,
Каб не журыцца,
Адабрала ірыскі
Ў сястрыцы.

Хто паможа
Надзейцы ціхмянай?
Хто ёй верне
Прысмак адабраны?

Можа, цёця?
Яна на рабоце.
Можа, мама?
На працы таксама.

Памагла ёй
Дзяўчына-краса,
За плячмі —
Залатая каса.

І адкуль яна толькі
Ўзялася,
Як пазнала,
Што спрэчка ўзнялася?

На маленькіх нагах
Неабутых
Падышла да дзяўчынак
Надзьмутых.

Белай хусткаю
Твар абмахнула,
На сястрычак
Лагодна зірнула.

— Я завуся, — гаворыць ім, —
Ласкай.
Вы паслухайце
Простую казку!
Я прыйшла
Ад Сяргейкі-
Хварэйкі,
Я прыйшла
Ад Тараскі-
Падпаска.

Сумаваў той без ласкі
Са статкам,
Калі ў поле падаўся
За таткам.
А пасля пабыла я
За морам,
За бязмежным
Блакітным прасторам.

Там чакаў мяне
Бедны, пануры
Хлопчык з чорнаю-
Чорнаю скурай.

У краіне,
Дзе сонца багата,
Гэты хлопчык
Застаўся без таты.

Тату ворагі злыя
Забілі,
Бо змагаўся ён
Супраць насілля.
Супраць гора змагаўся
Адважна,
Клікаў волю
Ў свой край неабсяжны...

Пацямнелі,
Як быццам ад ночы,
Васільковыя
Ласчыны вочы.

Залатую касу
Запляла,
Пацішэлых сястрыц
Абняла.

І тады запытала
Ларыса:
— А як хлопчыка клічуць?
— Патрысам.

І ўжо шэпчуцца ціха
Дзяўчынкі...
Ім цяпер
Не да прыкрых учынкаў!
Трэба другу
Пісьмо напісаць,
Падарунак яму
Пераслаць.

І пачула тут госця:
«Патрысік!
Шлём табе мы салодкіх
Ірысак.

І дражэ,
І «падушак»-малышак,
Толькі з'елі мы
Некалькі «мішак».

З падарункам прымі,
Калі ласка,
Нашу светлую
Шчырую Ласку!

Не гаруй,
Мы цябе не забудзем
І пра татку
Раскажам мы людзям.

Будзем дружныя мы
Між сабою
І навек
Пасябруем з табою!..»

***

Вось вам, дзеці,
І ўся мая казка
Пра дзяўчынку харошую —
Ласку.

Ласка ўсіх вас
Пабачыць жадала,
Але часу ў яе
Дужа мала.
А таму покуль стрэнецца
З вамі,
Будзьце, дзеці,
Ласкавыя самі!

## ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ

### Рэчка, рэчанька мая

Я не хачу, каб рэчка высыхала,
Дзе чую ўсплёскі рыбак залатых,
Дзе човен скача ля свайго прычала,
Калі бягу па травах лугавых;

Дзе лёд зімой іскрыцца ў сто вясёлак
І дзе бушуе ўвесну крыгаход,
Плыві, рака, паміж бароў вясёлых,
Каб зелянелі сосны круглы год!

Каб жаўранак гукаў вясну і лета
І не кранула птушачку бяда!
Каб не знікала з нашай студні светлай
Сцюдзёная і смачная вада!

Я не хачу, каб цінай безгалосай
Заплеснеў бераг, на якім стаю.
Прашу людзей, прашу я ўсіх
дарослых:
— Абараніце рэчаньку маю!
Я падрасту і вам дапамагу —
І рыбкі залатыя зберагу.

## ПЯТРУСЬ БРОЎКА

### А ты хоць дрэва пасадзіў?..

Дзе дваццаць год таму назад
Ляжаў дзірван акамянелы —
Расцвіў прыгожы, буйны сад,
Паплыў удаль, як ветразь белы...

Нямала тут вясновых дзён
Папрацавалі слаўна людзі,
Каб кожнай яблыняю ён
Усхваляваў нам сёння грудзі.

Ён так святло сваё разліў,
Глядзіш, нацешыцца няможна...
...А ты хоць дрэва пасадзіў? —
Няхай сябе спытае кожны.

**Сымонка**

Ён да працы
Прагнасць мае,
Ён і ў песнях самы звонкі,
У каго ні запытаеш,
Хваляць спрытнага Сымонку.
З першых дзён
Вайны-нягоды
Бацькі ў хлопчыка не стала —
Хоць дванаццаць год ад роду,
Гаспадарыць ён удала.
Неяк раз
Прыйшлі з калгаса,
Каб зрабіць падруб хаціне,
Дык, сякеру ўзяўшы, разам
Працаваў між іх хлапчына.
Раз прыйшоў Дзядок рухавы:
— Дай табе гарод засею.
Адказаў Сымон ласкава:
— Дзякуй, я і сам умею!
Наш Сымонка
Ветлы з кожным,
Ля старэйшых стане з краю.

Часам вельмі ўжо сур'ёзна
Наш Сымонка развbooжае.

Падбягуць, бывае,
Дзеці,
Пазавуць на гульні з крыкам.
Ён жа буркне: — Не да гуляў,
У мяне сям'я вяліка!
На лугу Касцы сышліся
Летняй роснай раніцою,
Бачаць, аж Сымон з'явіўся,
Ды з даўжэзнаю касою!
Хлапчука
Там абступілі
Ды сказалі ўважна, шчыра:
— Не, табе тут не па сіле,
Пачакай гадкі з чатыры.
Каб дзіцця
Замарнавалі,—
Не такія мы суседзі!
Бацьку ж мы паабяцалі,
Што цябе як след дагледзім.
Мы йшчэ самі
Не паслаблі,
За касой паходзіць кожны.
Вось табе у рукі граблі,
І па сіле гэта можна!

І Сымон пайшоў лугамі
Заграбаць у копы сена,
Хоць малы яшчэ гадамі,
А працуе ён адменна.
Як на полі,
Так і ў школе —
Не згультаіць ні гадзіны.
Каб хто лаяў,
Не, ніколі!
Толькі хваляць ўсе хлапчыну.

## ВАСІЛЬ ХОМЧАНКА

### Салдацкая крыніца

Ля нашай вёскі салдаты былі на вучэнні.

Была спёка. Адзін салдат захацеў піць. Ён дастаў з чахла рыдлёўку і расчысціў крынічку, што выбівалася з-пад зямлі ля старой алешыны. Салдат прагнаў смагу і пайшоў сваёй дарогай.

Другі салдат крынічку паглыбіў. Яна забруіла, напоўнілася да берагоў. Салдат набраў вады ў біклагу для сяброў, сам напіўся.

Назаўтра салдаты прынеслі да крынічкі бярвенцы і зрабілі зруб. Адзін з іх сплёў коўшык з бяросты і павесіў яго каля крыніцы на суку алешыны.

Праз тыдзень салдаты паехалі. А крыніца засталася. Вада льецца цераз бярвенцы, і па лузе паўз вёску бяжыць ручаёк, вясёлы, звонкі, чысты, як сама крыніца. Уся вёска п'е тую ваду.

Дзеці, якія калісьці чарадой бегалі за салдатамі, цяпер ужо выраслі. Сучасныя дзеці, вядома, не ведаюць, як прыязджалі ў вёску салдаты, а ўсё адно называюць крыніцу салдацкай. Так і гавораць:

— Хадзем на салдацкую крыніцу.

Добрую памяць аб сабе пакінулі салдаты.

### Самы лепшы малюнак

Маці падмятала падлогу, а Пеця сядзеў за сталом і маляваў.

— Мама, я цябе намалюю, — сказаў ён.

— Намалюй.

І Пеця намаляваў маці з венікам у руках.

Потым маці чысціла пыласосам дываны. А Пеця таксама яе намаляваў.

Прыбраўшы ў кватэры, маці памыла на кухні посуд, наскрэбла бульбы. Пеця намаляваў яе і за гэтай працай.

Усе малюнкі расфарбаваў каляровымі алоўкамі. Прыгожая атрымалася маці.

Прыйшоў бацька з работы. Пеця адразу ж да яго, пахваліўся:

— Тата, зірні, якую я маму намаляваў. Вось яна падлогу падмятае, а вось — з пыласосам. А тут толькі талеркі мые. Праўда, я добра намаляваў?

— Добра, — згадзіўся бацька.

— А які самы лепшы малюнак?

— Той, які ты не намаляваў.

— Які ж гэта?

— Дзе і ты памагаеш маме прыбіраць кватэру, мыць посуд, бульбу скрэбці.

## УЛАДЗІМІР ДУБОЎКА

### Як унук дзеду дапамог

### 1

Казачка гэта
вельмі старая,
ходзіць па свеце
з краю да краю.

Казачку гэту
ведаюць людзі,
ды нагадаць ім
лішнім не будзе.

Недзе далёка
ў вёсцы маленькай
век дажываў свой
дзедка старэнькі.

Старасць — не радасць:
сядзе ля міскі,
так і ліецца
з кожнае лыжкі...

Пазалівае
чысты абрус так
ён і заціркай,
ён і капустай.

З гэтай прычыны
дзеда старога
есці саджалі
каля парога.

Дзеда старога
з міскі шчарбатай
так і кармілі
мама і тата.

**2**

Дзедаў унучак,
мамін сыночак,
ножык узяўшы,
сеў у куточак.

Нешта майструе,
нешта складае.
Будзе, напэўна,
цацка якая.

Маці пытае:
— Любы сыночак,
што ты майструеш,
сеўшы ў куточак?

Што ж гэта будзе —
скрыначка, быццам?
— Будзе, матуля,
гэта — карытца.

Вырасту я,
як вы дзеда старога,
вас пасаджаю
каля парога.

Маму і тату
буду карміць так
поснай заціркай
проста з карытца.

Тата на маму,
мама на тату
глянулі моўчкі:
хто вінаваты?

### 3

З гэтага часу
дзеда старога
больш не саджалі
каля парога.

Разам з сям'ёю
ён і абедаў.
Гэта памог так
унучак дзеду.

Казачка гэта
вельмі старая,
ходзіць па свеце
з краю да краю.

Хто пра яе
і забудзецца, можа,
унучак маленькі
зноў дапаможа:

ён пачытае.
Хоць ведаюць людзі,
але напомніць
лішнім не будзе.

## Чые рукі прыгажэйшыя

### 1

На беразе ракі індыйскай, Джамны,
жылі даўней прыгожыя тры дамы.
У кожнай муж быў, так сказаць,
вяльможа,
затым пра хлеб іх клопат не трывожыў.
Не мелі клопату і пра уборы,
ім не хапала толькі з неба зораў.
Ніхто не прымушаў іх турбавацца
наконт якой бы ні было там працы.
Паспаўшы ўдосыць і на мяккім ложку,
яны і пачыналі дзень патрошку.
Спачатку падавалі ім сняданне,
пасля былі з суседкамі спатканні.
Яшчэ пасля — ішлі яны на Джамну,
вось гэтыя прыгожыя тры дамы.

2

З усмешкай на сваіх цудоўных тварах
яны з сябе свае здымалі сары.
Пасля залазілі ў ваду па пояс,
а над вадой імкліваў звонкі голас.
Яны сябе лічылі цудам свету,
і ўсе былі павінны ведаць гэта.
Гармідар той прыгожы і прыемны
даходзіў нават і да шахт падземных,
дзе людзі голыя крышылі камень
сваімі збітымі у кроў рукамі,
каб збудаваць цяжкой падземнай
працай
надземным дамам добрыя палацы...

3

На беразе ракі індыйскай, Джамны,
не сумавалі гэтыя тры дамы.
Пра тое-сёе крыху размаўлялі,
а гутаркі і час плылі на хвалях.
Але дайшлі да рук сваіх, урэшце.
Тут згода кончылася, хоць іх рэжце!
— Мае, — адна сказала, —
цуда свету, —
і вы павінны ўсе згадзіцца з гэтым!
— Ніякай згоды, — кажа ёй
другая, —
мае такія рукі, добра знаю! —

Такое самае пачулі і ад трэцяй:
— Мае найпрыгажэйшыя на свеце! —
Няма ў іх згоды, бо яны і суддзі:
гарачых спрэчак і вада не студзіць.

**4**

Якраз на тое каля іх кульгае
бабуля нейкая — галодная, старая.
Яна сказала:
— Трэці дзень не ем я.
Гарачыня спустошыла нам землі...
А можа, хоць скарыначку дасцё вы? —
Бабуліны іх не кранулі словы.
Галодных сыты зразумець не можа,
пакуль самога лёс не патрывожыць.
Да гэтых дам, над Джамнаю
індыйскай,
наконт скарынкі не хадзі і блізка.
А ўсё ж ткі трэба скарыстаць старую!
Адна яе пытаннем і частуе:
— Дапамажы нам скончыць
нашы мукі:
ў якой з нас лепшыя красою рукі?
— Чакайце крыху, —
кажа ім старая, —
прыйду, як толькі ежу адшукаю... —
І пакульгала прэч ад іх з кіёчкам
па чыста вымытым вадой пясочку...

5

Праз гоні двое, ля ракі таксама,
жанчына простая сядзела пад кустамі.
Усё жыццё яна працуе ў полі,
сваім гарбом сваю стварае долю.
Вятрамі біта і дажджамі мыта,
яна нічым ад сонца не закрыта.
Ад сонца яснага яна ўся чорна,
і лёсу горкаму яна пакорна.
Прыйшла, каб смагу ўтаймаваць
вадою,
перадыхнуць хоць крыху над ракою.

6

З кійком старая да яе кульгае,
сардэчным словам і яе вітае.
— Даруй, дачушка, за маё пытанне:
ці засталася крошка ад снядання? —
Сказала у адказ ёй маладзіца:
— Сядай, бабуля, ў засень, на травіцы.
Няхай збіраюць крошкі ліхадзеі!
З табой сняданне напалам падзелім,
каб падужэла ты ў сваёй дарозе,
каб весялей было табе, нябозе. —
Паснедалі яны тады абедзве,
хоць сонца і стаяла на абедзе.
Старой была вялікая падмога.

Падзякавала. Стала зноў на ногі.
Пасля ўзяла яе руку сваёю
і павяла ля Джамны, над ракою.

## 7

Прыйшлі да дам. Яны былі ля рэчкі,
свае ніяк не паканчалі спрэчкі.
Сказала ім старая, гэным дамам:
— Цяпер адказ на запытанне дам вам.
На рукі гэтай маладзіцы гляньце:
яны і чорныя, яны аж з глянцам.
Яны парэпаны, яны пабіты,
яны салёным потам перамыты.
Яны мяне, якую лёс знясіліў,
да новага жыцця уваскрасілі.
Няма на свеце ім красою роўных,
а прыгажэй за вашы — безумоўна!
Бо характво усё ідзе ад працы,
пабудавала праца і палацы.
Хоць беленькія вашы, як лілеі, —
дабра не твораць і тварыць не ўмелі!

## 8

Сказала так і адышла старая.
Пайшла ў свой бок і маладзіца тая.
На беразе ракі індыйскай, Джамны,
пазналі ўсё ж ткі сорам тыя дамы.

## Праўдзівы хлопчык

У нас, а можа, і не ў нас,
у старадаўні, даўні час

жыў мудры чалавек, які
не меў ні сына, ні дачкі.

Было ў яго багацця шмат,
ды ён багаццю быў не рад, —

адзін заўсёды, нібы цень,
хоць стане ноч, хоць
прыйдзе дзень.

Не чутна звонкіх галасоў
з яго разложыстых садоў.

Не прабяжыць малы ў пакой
з гульнёй вясёлаю сваёй.

Самота сумная адна
ад сонца ўсходу да цямна...

Аднойчы скрозь, з канца ў канец,
прайшла вядомка, што мудрэц

узяць надумаў у сыны
хлапца з тутэйшай староны.

А ў тым краі было ў людзей
па пяць, па шэсць і больш дзяцей.

Вядомка ўзварушыла ўсіх:
бацькоў старых, дзяцей малых.

Як ні кажы, прываба ёсць
зайсці ў такую прыгажосць!

Няблага будзе для хлапца
прайсці навукі ў мудраца.

У дзень, прызначаны старым,
дзве сотні сталі перад ім.

Адзін другога прыгажэй,
для сэрца шчырага мілей.

Звіняць вясёла галасы.
Палац змяніўся ад красы.

Прыйшоў мудрэц. Зірнуў на іх.
Пасля сказаў, як гоман сціх.

— Вітаю ўсіх сардэчна я.
Падзяка вам усім мая

за тое, што на заклік мой
прыйшлі такою грамадой.

Каб не пакрыўдзіць вас нічым,
даю адзін іспыт усім.

Усім па зернетку даю.
Іх пасадзіце вы ў зямлю

і дагледайце, каб праз час
па кветцы вырасла у вас.

Пасля прыходзьце зноў усе.
Вазон хто лепшы прынясе,

вазьму за сына я таго,
за бацьку буду для яго. —

Усе па зернетку ўзялі,
пайшлі саджаць іх у зямлі.

Праз час, прызначанай парой,
ідуць вясёлай грамадой

да мудраца хлапцы усе,
і кожны свой вазон нясе.

Здаецца, што дзівосны сад
закрыў бязмежны далягляд.

Якія кветкі, цуд які
узгадавалі хлапчукі!

І толькі ў аднаго — зямля,
а ў ей ні кветак, ні былля...

Мудрэц спыніўся перад ім:
— А што з вазончыкам тваім?!

Зямля ў ім ёсць. А кветкі дзе?!
Чаму не так, як у людзей? —

Здатанаваўся* і панік
маленькі гэны працаўнік.

Пасля сказаў ён у адказ:
— Насенне, што я ўзяў ад вас,

я пасадзіў у свой вазон
і паліваў не мала дзён.

Пушыў зямельку шмат разоў,
ды ўсё няма з яго расткоў... —

Сказаў тады хлапцу мудрэц:
— Ты, любы хлопча, маладзец!

Насенне — дрэннае было.
Ўзысці — ніколі б не магло.

Твае сябры схлусілі мне:
ўзраслі іх кветкі на мане, —

сваё насенне кожны ўзяў
замест таго, што я даваў...

Праўдзівы хлопчык — ты адзін.
Пры мне і будзеш жыць, як сын...

***

За сына ўзяў яго мудрэц.
На тым і казцы ўсёй канец.

---

**Здатанаваўся* — збянтэжыўся

## ПРЫКАЗКІ

За разумнай галавою і рукам лёгка.

Дрэнныя тыя рукі, што не ведаюць ніякай навукі.

Старога паважай, малога павучай.

Ласкавае слоўка, як сонейка, грэе.

Хто з сонейкам ідзе на работу — працуе з ахвотай.

Добрае жалеза не ржавее, добры чалавек не забываецца.

Чалавек без сяброў — што дрэва без каранёў.

### Тэматыка чытання:

## СМЯЕЦЦА, РАДУЕЦЦА ЛЕТА...

*Абдымаюць вятры прыветна,*
*Ціха лётаюць матылі...*
*Гаманлівае, звонкае лета*
*Зноў ідзе па духмянай зямлі...*

Г. Бураўкін

## ЯКУБ КОЛАС

### Лета

(Урывак)

Прыйшло і лета. Куды ні глянь — усюды зелена, усё расце, усё наліваецца. Лісце на дрэвах вырасла ва ўвесь рост свой і весела трапечацца на сонцы. Весела пазірае стары лес, што разросся за сялом і цягнецца па краях поля, як разак, пастаўлены зубамі ўгору. Кусты арэшніку, рабіны, чаромхі густа разрасліся ўнізе і далёка параскідалі свае зялёныя галіны. Так зелена, так густа, што, здаецца, не пралезеш у лес! Птушкі аж глушаць сваімі галасамі, сваім шчэбетам. Некаторыя, раннія, ужо вывелі дзетак і клапатліва шчабечуць каля сваіх гняздзечак, як нянькі каля калыскі. Колькі кветак, колькі ўсялякіх матылёчкаў, мошак і пчолак!..

Шчыраю рукою ўбрала лета ўвесь божы свет.

## Канец лета

Лецейка ты, лета,
Гучна песня спета,
Весела было.
Бралі поўнай чарай
Шчодрасць тваю, дары —
Сонца і святло.
Цешыла ты дзетак,
Ды ласкала гэтак —
Матчынай рукой,
Воляй маладою,
Цёплаю вадою,
Чыстаю ракой,
Полем і лясамі,
Спевам-галасамі
Ясных дзён тваіх.
Мыла іх расою,
Сонцавай красою
Уцірала іх.
Чарай асалоду
Чэрпалі, як воду,
Поўнаю за край.
Залатое лета,
Дык прымі ж за гэта
Шчырае «бывай!»

## АРТУР ВОЛЬСКІ

### Чарнічка

У засені сосен,
Дзе мох ды іглічка,
Расла-даспявала
Красуня-чарнічка.

Калі на світанку
Не бачыла хмарак,
Расой умывала
Свой кругленькі тварык.

А потым на сонейку
Плечыкі грэла,
Нібы негрынятка,
Яна загарэла.

Быў друг у чарнічкі —
Зялёны лісточак.
Схаваў ён яе
Ад вавёрчыных вочак.

Складала вавёрка
Грыбы на палічкі,
Але не прынесла
Чарняўкі-чарнічкі.

І вожык праходзіў
Сцяжынкаю блізкай.
Павёў у паветры
Кірпатаю пыскай.

Але і яму,
Не мяняючы звычкі,
Лісток не дазволіў
Пакрыўдзіць чарнічкі.

Шукала спажывы
Мядзведзіца ўранку.
І вось на чарнічную
Выйшла палянку.

Расселася, тлустая,
Як сярод хаты.
І сонца схавала
Спіною кашлатай.

Грабе сабе злева,
Грабе сабе справа,
І злева і справа —
Мядзведжая страва.

Няўжо для чарнічкі —
Апошні дзянёчак?
Ды не пахіснуўся
Зялёны лісточак!

Ва ўвесь свой расточак
Устаў абаронца...
І вось ужо зноў
Паказалася сонца.

Ах, што за лісточак!
Такі невялічкі,
Мядзведзіцы нават
Не выдаў чарнічкі.

**Дожджыкава песня**

Еду, еду на кані
я па белым свеце.
— Дожджык, дожджык,
секані! —
дружна просяць дзеці.

Памагчы я вельмі рад.
Будзе ў вас парадак.
Палію ахвотна сад,
перайду да градак.

Так прыемна абіваць
летні пыл з лістоты.
Толькі рэчку паліваць
штосьці няма ахвоты.

Не канчаецца вада
ў бочцы-самалейцы.

Але сам я, вось шкада,
не трымаю лейцы.

Выбірае шлях каню
фурман мой — вятрыска,
то кіруе ў вышыню,
то ганяе нізка.

То пускае пакрысе,
то засвішча пугай.
І вязе мяне, нясе
над усёй акругай.

Шэры конік на бягу
не трасе шматколку,
толькі гойдае дугу —
радугу-вясёлку.

## СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ

### Лета

Прыходзіць лета звонкае
Птушынаю гамонкаю,
Над сінімі азёрамі
Яно ўзыходзіць зорамі,
А пахне медуніцамі
І спелымі суніцамі.
Прыходзіць лета сцежкамі

З малінай, сыраежкамі,
Частуе на пагорку
Арэхамі вавёрку,
На возеры, ля берага,
Гукае зайца шэрага.
Прыходзіць лета звонкае,
Шуміць бярозкай тонкаю,
Гамоніць лес густы,
Дык не праспі і ты:
У спёку або ў дождж
Імчыся басанож...
Куды ні глянь — усюды
Цябе чакаюць цуды,
Цябе чакаюць сцежкі
І радасныя ўсмешкі,
Лугі, лясы, палі
І шчасце на зямлі.

## Дзяцел

Я на елку палячу —
І галінкі палячу:
Дзюба ў мяне доўгая,
Буду стукаць доўга я.
Назіраю я гады,
Як буяюць ягады:
З журавін зрабіў каралі —

Журавы мяне каралі,
А суніцы ледзь паспелі,
Іх дразды склявацъ паспелі.
Я спалохаў іх як след,
І прастыў птушыны след.
Прахаплюся я са сну
І на елку ці сасну
Зноў на досвітку лячу —
Дрэва хворае лячу.

## У лесе

Хто, гуляючы па лесе,
На высокі дуб палезе?
Хто, прыйшоўшы у лясы,
Не заўважыць след лісы?
Я на пень усеўся лысы,
Бачу — тут гулялі лісы,
Я на дуб узлезці б мог,
Каб пад ім быў мяккі мох.
Пад бярозаю ляжу
І бярозавік ліжу:
Смага паліць, а вады
Не знайсці, бо авады,
Быццам хмара, наляцелі —
Пухіры гарацъ на целе,
Я другі адзену ўбор
І пайду гуляць у бор.

## ВІТАЛЬ ВОЛЬСКІ

### Лета

У чэрвені — першым летнім месяцы — каласуе жыта, пачынаюць чырванець суніцы. Пахне мёдам канюшына.

Змаўкаюць птушыныя спевы. У большасці лясных птушак вывеліся птушаняты. Клапатлівыя бацькі безупынна носяць у гнёзды чарвякоў, вусеняў, слімакоў, мушак. Нялёгка ім накарміць сваіх дзяцей. Сядзяць малыя ў гняздзе, шырока разявіўшы раты, і наперабой просяць есці. Толькі давай і давай!

Надыходзіць ліпень. Ліпень у нас самы гарачы месяц. Гэта — сярэдзіна лета. Дні стаяць спякотныя. Высока ззяе ў ясным небе яркае сонца, і пад яго пякучымі праменямі млее зямля.

У ліпені наспяваюць ягады — суніцы, чарніцы, маліны, парэчкі. Цвіце ліпа, грэчка. Пчолы напаўняюць свае соты духмяным мёдам.

За ліпенем наступае жнівень — апошні месяц лета. У жніўні пачынаецца жніво. З самай раніцы да вечара на шырокіх палях стракочуць жняяркі, камбайны: гэта механізатары ўбіраюць з палёў багаты ўраджай. У садах паспяваюць яблыкі, грушы, слівы. Сонечныя прамені ўжо не такія гарачыя: яны цяпер толькі грэюць, але не пякуць, як у ліпені.

## КЛАЎДЗІЯ КАЛІНА

### Чэрвень і Сонейка

Бегае Чэрвень з саменькага ранку і да вечара па садах, палях, лясах, і ні ўпынку, ні адпачынку яму няма. Усюды трэба паспець, усё дагледзець.

Не паспеў абабегчы ўсе сады, паглядзець, ці добрая завязь на дрэвах, як на поле пара: на жыта зірнуць, падрасціць лён, каб даўжэйшы рос, папрасіць Ветра, каб прыгнаў хмару з даждж ом ды астудзіў ад спякоты зямлю...

А тут яшчэ трэба ў лес завітаць, дагледзець сунічкі, павярнуць іх да Сонейка, каб сокам наліваліся. А Сонейка ўжо на схіле, хутка і вечар...

— Ох, які кароткі дзень! — скардзіцца Чэрвень. — Сонейка, памажы мне, свяці даўжэй.

Сонейка слухае Чэрвеня і кожныя суткі ўсё болей прыбаўляе дня.

Чэрвень за дзень усюды пабывае: паглядзіць, як у лесе даспяваюць сунічкі, загляне ў вожыкаву схованку, пацікавіцца, як гадуюцца малыя важанияткі, і ў гнёзды птушыныя зазірне. Так за турботамі не заўважае, як бяжыць час. І вось чутна, як звіняць на лузе косы, пачалася касавіца... Новыя клопаты ў Чэрвеня.

— Сонейка, будзь ласкава, прыбаў яшчэ дня! Людзям сена трэба высушыць, — просіць зноў Чэрвень.

Сонейка слухала Чэрвеня, прыбаўляла дня, прыбаўляла ды і перастала.

— Усё! — кажа. — Болей не магу прыбавіць ні хвілінкі... Ночка крыўдзіцца, зусім кароценькая стала. Не паспее згаснуць неба на захадзе, як ружавее на ўсходзе!

— І за гэта дзякуй! — кажа Чэрвень.— І так ты мне памагло. Я і садавіну падгадаваў, я і жыта выкаласіў, і лён падрасціў, і ягады сокам наліў... І шмат іншай работы зрабіў. Не сорам майму брату Ліпеню будзе ў вочы глянуць.

Вось чаму ў Чэрвеня самы доўгі дзень і самая кароткая ноч. Гэта Сонейка дружыць з Чэрвенем і памагае яму.

# 3 клас

## Тэматыка чытання:
## З КРЫНІЦ НАРОДНЫХ...

*Ад прадзедаў спакон вякоў*
*Мне засталася спадчына...*

Я. Купала

## БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ПЕСНІ

### Зімовыя песні

### На новае лета...

На новае лета
Радзі, Божа, жыта,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Жыта, пшаніцу,
Усяку пашніцу,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Дай табе, Божа,
Пане гаспадару,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Піва варыці,
Сынкоў жаніці,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Гарэліцу гнаці,
Дачок аддаваці,
Шчодры вячор
Багаты вячор!

Залезь на баляску
І дастань каўбаску,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Стань на драбінку
І дастань сланінку,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Кошычак маку
Да таго прысмаку,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

**Там за садамі трава-мурава...**

Там за садамі трава-мурава,
Шчодры вячор, багаты вячор!

На той мураве — бела бяроза,
На той бярозе — залаты росы.
Як узняліся буйныя ветры,
Абцерусілі залаты росы.
— Ідзі, Ганначка, пазбірай росы
І купі сабе трое надоб'е:
Перша надоб'е — медзяны кубак,
Друга надоб'е — срэбна талерка,
Трэце надоб'е — залаты персцень.
Медзяны кубак — к запіваннечку,
Срэбна талерка — к дараваннечку,
Залаты персцень —
то к вянчаннечку.

**Узышло, узышло тры месяцы...**

Узышло, узышло тры месяцы...
Гэй, каляда, каляда!
Тры месяцы, ўсе тры ясны.
Было ў маткі тры сыночкі,
Паўставалі, паўмываліся,
Паехалі аж на места.
А на месце тры таночкі,
Тры таночкі, усе дзявочкі:
Адзін любіць берасцянку,
Другі любіць кабрынянку,
Трэці любіць каманьчанку.

5 Зак. 2082

### Ой, пад вярбою, пад зеляною...

Ой, пад вярбою, пад зеляною,
Святы вечар!
Ой, там стаяла мужаў грамада,
Мужаў грамада, вяліка рада.
— Станьма мы, братцы, у вяліку раду,
Пастроймa мы, братцы, залаты човен,
Леньма-паленьма да свайго пана.
А наш бо пан — слаўны багатыр,
Слаўны багатыр, дарага плаціў,
На месяц плаціў па сто чырвоных,
Па сто чырвоных, па вараным кані.
На тым кані залатое сядло,
А на тым кані залата грыва,
Залата грыва персцень укрыла.
На тым сядле пышнае дзіця,
Пышнае дзіця — малады Іванка.

### Го-го-го, каза

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра!
Паварачайся,
Не забывайся.

То на ножанькі,
То на рожанькі,
То на капыцікі
Залаценькія.

Павярніся зграбна,
Павярніся складна,
Кажы, дзе хадзіла?
Дзе што рабіла?

Дзе каза паходзіць,
Там жыта зародзіць,
А дзе пагайсае,
Там павылягае.

Дзе каза бывае,
Там шчасце вітае,
А дзе не бывае,
Там яно мінае.

## Веснавыя песні

### Вясна красна...

Вясна красна,
Што ж ты нам прынясла?
З пунькі сянцо
Вынесла, вынесла.
З току саломку
Вытрасла, вытрасла.

З клеці зярно
Вымела, вымела.
На гары бабкі
Сядзелі, сядзелі,
Кулаком зямлю
Калацілі, калацілі.
Да нявехначак
Судзілі, судзілі.
— Ой, мая ж нявехна
Дурмі-дурак, дурмі-дурак,
Зімку прала, —
Усё спала, усё спала.
Кросна ткала, —
Драмала, драмала.
Вось мая дачушка
Разумна, разумна,
Зімку прала, —
Не спала, не спала,
Кросна ткала, —
Ляшчала, ляшчала.

**А ляцела сойка цераз чыста поле...**

А ляцела сойка цераз чыста поле,
Вясна красна, дзень цёплы!
Ды яна схапіла Іванаву жонку.

А бяжыць жа хлопчык, шапку
зняўшы,
Шапку зняўшы, галаву задраўшы.
— Сойка, сойка, аддай маю жонку.
Мая жонка тонкая пралля,
Тонкая пралля, звонкая ткалля.
Тонка прала, беленька бяліла,
Кашулечкі шыла і мяне любіла.

## Жніўныя песні

### Наш гаспадар маладзенькі

Наш гаспадар маладзенькі,
У яго конік вараненькі.

*Прыпеў:*

Ой, люлі, люлі, люлі,
Ой, люлі, ой, люлі.

Ён ўсё поле аб'язджае
Да й на жнейкі паглядае.

*Прыпеў.*

Ой вы, жнейкі маладыя,
Вашы сярпы залатыя.

*Прыпеў.*

Паспрыялі да вы полю,
Да і жыту ядраному.

*Прыпеў.*

Да і жыту ядранаму,
Да і коласу налітому.

*Прыпеў.*

### Закракатала шэра вутанька на рацэ...

Закракатала шэра вутанька на рацэ —
Заплакала родна матулька па дачцэ.
— Не плач, родна матулька, па мне.
Мамка, пойдзеш у чыста поле
авёс жаць,
А я пайду на сіне мора хусты праць.
Ранняю, вячэрняю зарою
Да й сайдуцца нашы галаскі з табою.

## ЛЕГЕНДЫ

### Адкуль пайшлі беларусы

Калісьці жыў чалавек па прозвішчы Бай. А як прыйшла яго гадзіна смерці, дык ён склікаў сваіх сыноў і падзяліў усю сваю маёмасць. Толькі аднаго сына запамятаваў, які быў на паляванні. Прозвішча гэтаму сыну было Белаполь.

Неўзабаве пасля смерці бацькі вярнуўся Белаполь, а браты яму і кажуць:

— Вось бацька адказаў табе сваіх сабак, ды яшчэ наказаў, каб ты іх пусціў па волі; колькі яны зямлі аббягуць у дзень, дык гэтая ўся зямля твая будзе.

Белаполь злавіў дзвюх птушак. Адну пусціў на поўдзень, другую на захад. Затым загадаў сабакам: «Хапайце!»

Як пабеглі тыя сабакі за птушкамі, дык ажно зямля закурылася. А па іх слядах дзве рэчкі працягнуліся, у адзін бок прайшла Дзвіна, а ў другі бок — Дняпро.

Вось у гэтых абшарах Белаполь і пачаў сяліцца ды заводзіць свае лады...

У гэтага Белаполя ад розных жонак яго развяліся розныя пляменні пад прозвішчам Беларусы. Яны і да гэтага часу там ходзяць, зямельку скародзяць ды жыта сеюць.

## Бусел

Вандраваў калісьці па белым свеце Бог. І заблукаў ён да нас на Беларусь. Бачыць — прыгожая тут зямля. Векавыя пушчы, ураджайныя палеткі, не злічыць рэк і азёраў, бруістых крыніц са сцюдзёнай вадой...

Адно кепска: развялося шмат усялякіх паўзучых гадаў. Няма ад іх жыцця ні людзям, ні жывёле. Паспачуваў Бог нашым прашчурам. Узяў вялізную торбу і сабраў туды markings рознае плюгаўства. Ніводнай жабы ці гадзюкі не пакінуў.

Вядома, стаміўся Бог ад такой нялёгкай работы — ён ужо старэнькі быў. Не хапіла самому сілы падняць і занесці тую торбу, каб укінуць у бяздонную багну-дрыгву. Таму і гукнуў на дапамогу хлопца, які сена касіў на лузе. Узваліў Бог яму торбу на спіну ды загадаў не развязваць па дарозе.

А дзяцюк, як на тое, аказаўся вельмі цікаўны. Закарцела яму зір-

нуць, што там у торбе варушыцца ды жудліва сыкае. Схаваўся ён за бухматы куст вербалозу і развязаў торбу. Як развязаў — дык самлеў ад страху. А гады тым часам вылезлі і зноў распаўзліся па ўсёй зямлі.

Ведама, Бог не схацеў другі раз з імі пэцкацца. Начапіў ён парожнюю торбу неслуху-касцу на плячо — выправіў яго збіраць выпушчанае плюгаўства. Толькі дзяцюк злавіў першую жабу — ператварыўся ў бусла.

З таго часу і дыбае бусел, нібы касец, па лугах-балотах. Босы, з чырвонымі нагамі, у белай кашулі і з чорнаю торбаю за спінай. Потым Бог злітасціваўся над небаракам, паслаў яму на падмогу жонку-бусліху і дзетак-буслянят. А жыць дазволіў у вёсцы, сярод людзей, каб не забыліся, што вядуць свой пачатак ад чалавечага роду. Людзі таксама помняць пра гэта, таму ніколі не крыўдзяць буслоў, шануюць іх, як родных братоў.

## Пра возера Свіцязь

Калісьці ўладаром возера быў мірскі князь. І вось ён задумаў даведацца, ці праўда, што на дне возера стаіць затоплены горад Свіцязь, як гэта гавораць у народзе.

Рыхтаваўся ён тры тыдні. Пабудаваў вялікі карабель, сплёў невад, паклікаў ксяндза. І вось, калі закінулі невад і пачалі выцягваць яго, то быў ён лёгкі. Рашылі, што нічога няма. Але, калі выцягнулі апошняе крыло, убачылі ў невадзе цудоўную дзяўчыну з белым тварам, доўгімі распушчанымі валасамі. Адны ад здзіву анямелі, другія кінуліся ўцякаць. Тады дзяўчына загаварыла голасам, падобным да голасу ручая, які бег у гэтае возера:

— Вы задумалі дзёрзкую справу, парушылі спакой возера. Але я раскажу вам пра яго. На тым месцы, дзе сёння возера, стаяў некалі горад. Князь, які валодаў горадам, быў у хаўрусе з навагрудскім князем Міндоўгам. Аднойчы напаў на Нава-

грудак з магутным войскам суседні цар. Князь разам са сваёй дружынаю паехаў на дапамогу Міндоўгу. У горадзе засталіся старыя, жанчыны, дзеці і сярод іх прыгожая князева дачка. Ворагі разбілі магутнае войска Міндоўга і княжацкае войска і падышлі да горада Свіцязя. Тады перад князёўнай з'явіўся аднекуль стары і сказаў, што ператворыць горад у возера, а людзей у кветкі. Горад сапраўды адразу пачаў знікаць, а на месцы яго разлілося возера, па якім плавалі цудоўныя кветкі-цары.

Расказаўшы гэта, дзяўчына знікла. Больш яе ніхто ніколі не бачыў. Як успамін пра гэта, кожную вясну цвітуць на возеры кветкі-цары.

## Пра зязюлю

Жылі-былі брат і сястра. Брат быў вельмі бедны, а сястра — дужа багатая. Аднойчы пайшоў брат да сястры, каб хоць кавалкам хлеба дапамагла. Сястра скупая была,

сказала, што ключы ад клеці згубіла. І пачала яна нібы шукаць ключы, а брат стаяў, стаяў пад акном, чакаў, чакаў і нарэшце не вытрымаў і пайшоў. На дарозе паваліўся і памёр ад голаду. Сястра зразумела, што зрабіла дрэнна і стала клікаць брата:

— Якуб, Якуб, вярніся, ключы знайшліся!

Праз сваю скупасць яна зрабілася зязюляй і цяпер увесь час кліча:

— Якуб, Якуб!

Толькі чуваць:

— Ку-ку, ку-ку!

## КАЗКІ

### Баран — бок абадран

Жыў-быў дзед, а ў таго дзеда быў баран. Вось і захацеў той дзед зарэзаць свайго барана. Толькі пачаў рэзаць, трошкі бок абадраў, ажно баран ускочыў ды ўцёк і схаваўся ў нару лісіцы. Прыйшла лісіца ў сваю нару, ажно там нехта сядзіць. Спужалася лісіца і пытаецца:

— Хто там?

А баран ёй:

— Я, баран — бок абадран, чатыры нагі, два рагі, як дам рагамі, дык ты кверху нагамі.

Лісіца спужалася і пайшла ваўка прасіць:

— А воўчанька ты мой, а кумочак мой, хадзі дапамажы маёй бядзе, паглядзі, хто гэта ў мяне ў нары сядзіць.

Паслухаў воўк лісіцу, пайшоў з ёй у нару выганяць барана. Прыйшоў ды сарп-сарп носам, нюхае:

— Хто там?

— Я, баран — бок абадран, чатыры нагі, два рагі, як дам рагамі, дык ты кверху нагамі.

Воўк спужаўся і ўцёк. Пайшлі яны з лісіцай ды к мядзведзю, сталі мядзведзя прасіць:

— Мядзведзенька, баценька, хадзі дапамажы нашай бядзе, паглядзі, хто ў лісіцынай нары сядзіць.

Паслухаў мядзведзь іх, пайшоў з імі да нары. Прыйшоў і пытаецца:

— Хто там?

— Я, баран — бок абадран, чатыры нагі, два рагі, як дам рагамі, дык ты кверху нагамі.

Мядзведзь спужаўся і ўцёк. Ідуць яны, ідуць каля саду і бачаць — ляціць пчолка. Давай яны пчолку прасіць:

— Пчолка, душачка, хадзі паглядзі, хто ў лісіцынай нары сядзіць.

Паляцела з імі пчолка. Прыляцела і пытаецца:

— Хто там?

А баран ёй:

— Я, баран — бок абадран, чатыры нагі, два рагі, як дам рагамі, дык ты кверху нагамі.

А пчолка як уляцела ў нару, як села на барана ды давай яго кусаць за абадраны бок. Баран выскачыў і пабег.

*Апрацоўка А. Якімовіча.*

## Дзедава рукавічка

Жыў дзед з бабай. Паехаў дзед у лес і згубіў рукавічку. Прыскакала да рукавічкі лягушка і пытаецца:

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

Ніхто не адгукаецца. Яна залезла ў рукавічку і стала жыць.

Трохі счакаўшы, паўзе рак. Прыпоўз да рукавічкі і пытаецца:

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

А лягушка гаворыць:

— Сама паня-пацягуня. А ты хто?

— А я — рак-тарабун. Ці можна мне?

— Лезь!

Трохі счакаўшы, бяжыць зайчык. Прыбег да рукавічкі і пытаецца:

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

— Сама паня-пацягуня і рак-тарабун. А ты хто?

— А я — па бярэзнічку прыгун. Палезу і я да вас?

— Лезь!

Трохі счакаўшы, бяжыць лісіца.

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

— Сама паня-пацягуня, рак-тарабун ды па бярэзнічку прыгун. А ты хто?

— А я — лісіца, добрая маладзіца. Палезу і я да вас?

— Лезь!

Лісіца ўлезла і сядзіць. Трохі счакаўшы, ідзе воўк.

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

— Сама паня-пацягуня, рак-тарабун, па бярэзнічку прыгун і лісіца, добрая маладзіца. А ты хто?

— А я — з-за куста хапун. І я палезу да вас?

— Лезь!

Улез і воўк. Трохі счакаўшы, сунецца мядзведзь. Падышоў да рукавічкі і пытаецца:

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

— Сама паня-пацягуня, рак-тарабун, па бярэзнічку прыгун, лісіца, добрая маладзіца, ды з-за куста хапун. А ты хто?

— А я — зверху прыціскун. Пусціце мяне к сабе!

— Не, ужо няма куды.

— Ну, я зверху сяду!

Узлез наверх, як ціскануў, так звяры і разбегліся ўсе.

### Сабака і воўк

Быў у аднаго гаспадара сабака. Шчыра служыў ён гаспадару, ды

і не агледзеўся, як пастарэў. Горш сталі бачыць яго вочы, і цяжэй яму стала вартаваць гаспадарова дабро. Тады скупая гаспадыня перастала карміць яго, а потым і зусім пачала з двара праганяць.

«Чым так жыць, — думае сабака, — лепш няхай мяне воўк з'есць».

Надумаўся ён і пайшоў у лес шукаць ваўка. Ідзе ён лесам, а тут насустрач і воўк бяжыць.

— Куды, сабака, ідзеш? — пытаецца воўк.

— Да цябе.

— Чаго?

— З'еш ты мяне, воўча...

І расказаў ён ваўку пра сваю бяду. Бачыць воўк, што сабака надта худы — яшчэ зубы паломіш, і кажа:

— Не, цяпер я цябе есці не буду. Трэба, каб ты трохі патлусцеў.

— Як жа я патлусцею, — кажа сабака, — калі мяне гаспадыня зусім не корміць?

— Нічога. Мы зробім так, што яна цябе з ахвотаю будзе карміць.

— Дзе там! — пакруціў хвастом сабака. — Гаспадыня мая вельмі скупая.

— Слухай ты мяне, — кажа воўк. — Ідзі дадому і сядзі там на агародзе. Адвячоркам, як пачне цямнець, я прыбягу і ўхаплю лепшага гаспадаровага падсвінака. Ты наробіш брэху, пабяжыш за мною, і я табе аддам падсвінака. Гаспадар убачыць гэта і загадае гаспадыні добра карміць цябе. А праз месяц, як патлусцееш, — прыходзь да мяне, тады я цябе з'ем.

Сабака падумаў і згадзіўся.

Адвячоркам прыбег воўк, ухапіў падсвінака і павалок цераз агароды.

Тут сабака як наробіць ляманту, як кінецца за ваўком...

Пачуў гэта гаспадар, выскачыў з хаты, бачыць: воўк падсвінака валачэ цераз агароды, а сабака яго даганяе, адбірае.

— Туйга! Туйга! — закрычаў гаспадар на ўсю сілу. — Кусі яго, Лыска!

Воўк тым часам кінуў падсвінака, а сам ходу ў лес.

— Малайчына, Лыска! — пахваліў гаспадар сабаку, прывёў на кухню і загадаў жонцы добра карміць яго.

Жыве Лыска прыпяваючы. А праз месяц зрабіўся такі тлусты, аж шэрсць блішчыць. І пра дагавор з ваўком забыўся.

Вось аднойчы сабраліся ў гаспадара госці. П'юць, гуляюць, песні спяваюць. Нямала тут і Лыску перапала — цэлую кучу касцей пад стол яму накідалі.

Наеўся Лыска ды выйшаў на двор — у сваю будку. Глядзіць — аж у будцы воўк чакае яго.

— Чаго ты тут? — здзівіўся сабака.

— Па цябе прыйшоў, — адказвае воўк. — Памятаеш наш дагавор з табою?

Спалохаўся сабака — не хочацца яму на воўчыя зубы трапляць. Вось ён і кажа:

— Не еш ты мяне, воўк. Я цябе за гэта добра пачастую самаю смачнаю ядою.

— Адкуль жа ты возьмеш?

— У майго гаспадара госці. Там пад сталом поўна касцей — нават з мясам. Хадзем!

— Баюся. Яшчэ заб'юць мяне там.

— Не бойся, не заб'юць, — кажа сабака. — Я цябе правяду так, што ніхто і не ўбачыць.

Згадзіўся воўк і пайшоў за сабакам. Лыска пакінуў яго ў сенцах, сам убег у хату, махнуў хвастом і патушыў лучыну.

— Цяпер бяжы пад стол, — паклікаў ён ваўка. Воўк так і зрабіў.

Сабака накарміў ваўка, нават віном напаіў. Сядзяць яны сабе пад сталом ды зюкаюць паціху. А тым часам госці заспявалі вясёлыя песні. Воўк слухаў, слухаў ды кажа сабаку:

— Мне таксама спяваць хочацца.

— Маўчы лепш, — раіць сабака.

Воўк памаўчаў крыху ды зноў за сваё:

— Не вытрымаю, — кажа, — аж язык свярбіць, гэтак спяваць захацелася.

І зацягнуў на ўсю хату басам:

— Ау-ау!

А сабака таксама не вытрымаў ды давай падпяваць яму:

— Гаў, гаў! Цяў, цяў!..

Пачулі гэта госці, ухапілі хто качаргу, хто чапялу, набілі ваўка і выкінулі яго з хаты разам з сабакам. Ачухаўся воўк і кажа сабаку:

— Ну і накарміў жа ты мяне! Я табе не дарую гэтага.

— Сам вінаваты, — кажа сабака. — Трэба было маўчаць.

— Не, — не згаджаецца воўк, — гэта ты вінаваты. Навошта ты завёў мяне ў хату?

Спрачаліся яны, спрачаліся, нарэшце воўк кажа:

— Калі так, давай будзем ваяваць: хто каго зваюе, той таго і з'есць. Збірай сваё войска і прыходзь да мяне ў лес.

— Што ж, — кажа сабака, — няхай будзе так.

Назаўтра ўзяў ён барана, ката і пеўня сабе ў памочнікі ды пайшоў на вайну з ваўком.

А воўк запрасіў да сябе ў ваякі мядзведзя, дзіка і зайца. Сабраў ён сваё войска, выйшаў на ўскраек лесу і чакае.

— Палезь ты, Міхайла, — кажа ён да мядзведзя, — на елку ды паглядзі, ці не ідзе сабака са сваім войскам.

Мядзведзь узлез на елку, прыгледзеўся і кажа:

— Ідзе!

— Ну, дык злазь! — кліча воўк. — Будзем ваяваць.

— Не, не злезу, — адказвае мядзведзь.

— Чаму?

— Страшна.

— Што ж там за войска такое, што ты гэтак спужаўся? — пытаецца воўк.

— Такое войска, што я ніколі і не бачыў, — адказвае мядзведзь калоцячыся. — Адзін ваяка, тоўсты і калматы, з віламі ідзе; другі —

грозны, вусаты, ззаду піку нясе; трэці — у шапачцы чырвонай, са шпорамі на нагах, шабляю махае... Першы ідзе, галавою трасе ды ўсё крычыць: «Бэ! Я ўсіх пакалю, на вілы пасаджу!» Другі сярдзіта чмыша, па баках азіраецца і ўсё мармыча: «Мне, мне іх падай!» А трэці, ганарысты такі, крычыць: «Куды, куды ісці! Я адзін усіх паб'ю!»

Дзік пачуў гэта ды хутчэй у мох па самыя вушы зашыўся. А воўк бачыць, што не паспее схавацца, — стаў на заднія лапы і стаіць. «Хавайся за мяне, — кажа ён перапалоханаму зайцу. — Яны падумаюць, што я — пень, і абмінуць нас».

Прыходзіць сабака са сваім войскам, бачыць — нідзе нікога няма.

Тут якраз барану рогі засвярбелі. Глядзіць ён — побач нейкі пень стаіць. Разагнаўся баран ды — трах! — рагамі ў пень. У ваўка ад гэтага і галава раскалолася. Паваліўся ён дагары ды і ногі выцягнуў. Заяц выскачыў з-пад ваўка, але сабака згледзеў яго і адразу злавіў.

Дзіку ў гэты час, як на бяду, села муха на вуха. Паварушыў ён вухам, каб сагнаць яе, а кот падумаў, што там мыш. Кінуўся туды ды давай мох разграбаць. Так і дзярэ дзіка вострымі кіпцюрамі! Цярпеў, цярпеў дзік, а потым усхапіўся ды ходу...

Певень напужаўся дзіка, залопаў крыламі, узляцеў на елку і нарабіў крыку:

— Куды, куды?

Мядзведзь падумаў, што гэта самы грозны ваяка да яго дабіраецца, залез са страху аж на верхні сук. Сук не вытрымаў, зламаўся, мядзведзь грымнуўся вобземлю і забіўся.

З таго часу больш і не сябруюць сабакі з ваўкамі.

*Апрацоўка А. Якімовіча.*

## Казка пра быка і яго сяброў

Пасвіўся на лузе бык. Убачыў ён каля рэчкі туман і напужаўся: падумаў, што зямля і вада гараць.

«Пабягу я лепш адгэтуль на край свету!» — парашыў бык.

Задраў хвост і пабег.

Сустрэўся яму па дарозе казёл:

— Бык, куды бяжыш?

— На край свету.

— Чаго?

— У нас зямля і вада гарацць. Баюся, каб і мне не згарэць.

— Пабягу і я з табою.

— Бяжы.

Бягуць яны, а насустрач ім парсюк:

— Куды бежыце?

— На край свету: у нас зямля і вада гарацць! Баімся, каб і нам не згарэць.

— І я з вамі пабягу.

— Бяжы.

Бягуць яны ўтрох. Сустракае іх гусак:

— Куды бежыце?

— На край свету: у нас зямля і вада гарацць! Баімся, каб і нам не згарэць.

— І я з вамі пабягу.

— Бяжы.

Бягуць яны ўчатырох. Сустракае іх певень:

— Куды бежыце?

— На край свету: у нас зямля і вада гараць...

— І я з вамі пабягу.

— Бяжы.

Беглі, беглі, прыбеглі ў лес. А тут і зіма надыходзіць. Бык кажа:

— Ну, хопіць бегчы: зімою зямля не загарыцца. Давайце будзем хату рабіць ды запасы на зіму рыхтаваць.

Парсюк кажа:

— Мне хаты не трэба: я выкапаю сабе яму, нанашу туды моху на падсцілку, жалудоў на харч ды буду зімаваць. Мне і так цёпла будзе!

Казёл кажа:

— А я карою пракармлюся, у дупле нагрэюся.

— А ты, гусак? — пытаецца бык.

— У мяне пер'е цёплае, я дзюбу ў яго схаваю ды так перазімую.

— А ты, певень?

— А мне што, я і пад ялінкаю перазімую.

Што рабіць? Узяўся бык адзін хату будаваць. Нанасіў бярвёнаў, моху, збудаваў цёплую хату і жыве сабе ў ёй без бяды.

Насталі лютыя маразы. Парсюк круціўся, круціўся ў яме, не вытрымаў ды пайшоў да быка:

— Пусці, бык, у хату: сцюдзёна вельмі!

— Не, — кажа бык, — не пушчу: ты ў мох закапаешся, табе і так цёпла будзе!

— Калі не пусціш, — кажа парсюк, — дык я падкапаю лычам падрубу — твая хата абернецца, ды яшчэ і цябе самога задушыць.

Напужаўся бык: хочаш — не хочаш, трэба пускаць парсюка ў хату.

— Ну, добра, ідзі: удвух весялей будзе.

На другі дзень прыходзіць казёл:

— Пусці, бык, у хату!

— Навошта табе хата: ты ў дупле перазімуеш!

— Ну, калі не пусціш, дык я разганюся, стукну рагамі ў сцяну

і праб'ю дзірку: мароз залезе ў хату, табе холадна будзе.

Што рабіць быку — пусціў казла.

— Добра, — кажа, — хата ў мяне не малая: хопіць і траім месца.

На трэці дзень прыходзіць гусак:

— Бык, бык, пусці ў хату пагрэцца!

— Не пушчу!

— Чаму?

— У цябе пер'е цёплае, ты ў яго дзюбу схаваеш ды і так перазімуеш!

— Ну, калі не пусціш, дык я дзюбаю ўсю страху расцягаю, табе холадна будзе.

Спужаўся бык — пусціў і гусака.

На чацвёрты дзень прыходзіць певень:

— Пусці, бык, у хату!

— А хіба табе пад ялінкаю не цёпла? — засмяяўся бык. — Не пушчу! У мяне ўжо і так цесна.

— А калі не пусціш, я ўвесь пясок са столі зграбу: дух з хаты выйдзе, і ты замерзнеш.

Спужаўся бык — пусціў і пеўня. Жывуць яны ў хаце ўпяцёх.

Ідзе мядзведзь. Убачыў хату.

— Хто тут жыве? — пытаецца.

— Бык, казёл, парсюк, гусак і певень, — адказваюць з хаты.

— Пусціце і мяне пагрэцца.

— Не, не пусцім! Ты нам не кампанія.

Мядзведзь стукнуў лапаю ў дзверы, праламаў іх і ўвайшоў у хату.

Тут бык выставіў рогі ды прыпёр мядзведзя да сцяны. А казёл давай яму рагамі ў бок лупіць, а парсюк зубамі за жывот ірваць, а гусак у нос дзяўбці... А певень узляцеў на лаву ды давай крычаць: «Кудах-кудах! Куды-куды!»

Ледзьве жывы выскачыў з хаты няпрошаны госць. Ідзе ён кульгаючы па лесе, сустракае воўка.

— Дзе быў, сусед? — пытаецца ў яго воўк. — Чаму ты такі хмуры?

— Ой, — кажа мядзведзь не сваім голасам, — трапіў я да страшэнных разбойнікаў. Адзін мяне віламі да

сцяны прыціснуў — не павярнуцца. Другі ражнамі ў бок таўчэ. Трэці абцугамі кішкі выцягвае. Чацвёрты спіцаю ў нос коле. А пяты, у чырвонай шапачцы, ззаду шабля крывая, на нагах шпоры, бегае па лаве ды ўсё крычыць: «Падай, падай яго сюды!» Добра, што я ўцёк, бо не ведаю, што б гэты пяты разбойнік зрабіў са мною...

З таго часу больш ні мядзведзь, ні воўк у тую хату не заглядвалі.

*Апрацоўка А. Якімовіча.*

## ЯРАСЛАЎ ПАРХУТА

### Як рабілі вясёлку

(Казка)

Пры азярыне між кветак і траў гулялі ў хованкі праменьчыкі. Іх было ажно сем — Фіялетавы, Сіні, Блакітны, Зялёны, Жоўты, Аранжавы і Чырвоны. Раптам праменьчык Фіялетавы сказаў:

— Надакучыла тут. Хачу на другі бераг азярыны!

Абапёрся адным канцом на купіну, выгнуўся дугою, другі канец

апусціў на процілеглы бераг і засвяціўся ад радасці.

Убачыў праменьчык Сіні, як брат ягоны раскашуе, і таксама сказаў:

— На той бераг хачу!

Пераскочыў азярыну, далучыўся да праменьчыка Фіялетавага, і ўжо на пару заззялі яны над зямлёю.

Зайздросна стала праменьчыку Блакітнаму, і ён, доўга не думаючы, кінуўся да братоў.

У небе цяпер тры стужачкі каляровыя гарэлі.

Праменьчык Зялёны не вытрымаў, шугануў увысь і адтуль гукнуў:

— Гэй, там, на зямлі! Да нас гайда! Тут прасторна! І відаць далёка!..

Праменьчык Жоўты павагаўся, а тады ўзяў і таксама пераскочыў азярыну. І атрымаўся ладны паясок — пяцікаляровы.

«А я хіба горшы?» — падумаў праменьчык Аранжавы і кінуўся следам.

У небе ўжо гарэў шасцікаляровы паясок. Бачачы такое дзіва, праменьчык Чырвоны сказаў:

— Браты, а мяне прымеце ў сваю кампанію?

— Прымем! Прымем! — пачуліся галасы. — Не марудзь толькі...

Праз хвіліну ў небе над азярынай павісла незвычайная стужка. У ёй былі ўсе сем колераў — чырвоны, аранжавы, жоўты, зялёны, блакітны, сіні і фіялетавы. І радавалася ім усё жывое на зямлі. А паколькі тая стужка гарэла надзвычай весела, то людзі і назвалі яе проста і ясна — Вясёлка.

## Котавы казкі

(Урыўкі)

Сядзеў Котка на загнетку.
Баяў Котка казкі дзеткам...

Ды аднойчы надвячоркам
Басаніж пабег на горку,
Снегу з рызыкі паеў
І ангінай захварэў.

Котка трапіў у бальніцу.
Трэба ж Котку падлячыцца.
Не трывожцеся, сябры, —
Там што трэба дактары!

Ну а казкі тыя, дзеці,
Расказаць вы мне даверце.
Бо калісь для нас малых
Котка шэры баяў іх.

*Сказ цяпер я павяду*
*пра лянота-злыбяду*

## Мурашык

Вам вядома, малышы,
Як працуюць мурашы.

...А ў мурашніку адным,
Што ў бары стаіць сівым,

Вырас неяк абібок.
Ён ад дому — ані крок!

Усяго што мог рабіць —
У цянёчку лынды біць.

Да таго ж хвальком ён быў,
Кулаком у грудзі біў:
— Хоць сягоння я магу
Ліса цапнуць за нагу
І, як толькі захачу,
Хвост на памяць адкручу!.

Ліс пачуў — і тут як тут:
— Хто жадае мне пакут?!

Зледзянела ўся душа
У задзіры Мураша.
Ды назаўтра на суку
Выхваляўся Павуку:
— Калі так — да матузка
Прывяжу Маладзіка.
Светла бегаць будзе ў гай —
Хоць іглiцу ты збірай!

А Павук стары са сну
Ножык точыць аб сасну...

Скалануў малога страх
(Не сусед, а проста жах!).
Патырчма на дол зляцеў
І на доле тым самлеў.

Потым — зірк туды, сюды:
Мора перад ім вады!
— Цётка Люгашка, —
сказаў, —
На той бераг перапраў!
Стаў прасіцца ў Страказы:
— Да сваіх ты завязі!

— Заляцець магла б я ў бор —
Не заводзіцца матор.

Пра бяду пачуў Слімак —
Не смяяўся зроду так:
— Як хвасты круціць — дык
мог,
А цяпер — ні рук, ні ног!..

Сеў Мурашык пад кустом,
Слёзы льюцца ручаём:
— Што рабіць мне? Як мне
быць?
Як мне мора пераплыць?

Раптам бачыць: з-за гары
Коцяць нешта Камары.
— У арэхавай шкарлупцы
Будзеш ты нібыта ў шлюпцы!
Так што, браце, не бядуй,
Бяры тычку і кіруй!

Шчыра кажучы, з нязвычкі
Дрэнна слухалася тычка.
Ды нарэшце наш герой
Пераплыў на бераг свой.

А на беразе на тым
Мітусіліся браты:
— Вечна ў нешта ўліпнеш
ты!..
Брацца ўжо за розум час!

Не падводзь ты болей нас!
І Мурашык б'е чалом:
— Перастану быць
хвальком!

**Тэматыка чытання:**

## МОЙ РОДНЫ КУТ! ЯК ТЫ МНЕ МІЛЫ...

*О, край родны, край прыгожы!*
*Мілы кут маіх дзядоў!*
*Што мілей у свеце божым*
*Гэтых светлых берагоў,*
*Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,*
*Дзе бары-лясы гудуць,*
*Дзе мядамі пахнуць грэчкі,*
*Нівы гутаркі вядуць?*

Я. Колас

## УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

### Беларуская песня

Дзе мой край? Там, дзе вечную
песню пяе Белавежа,
Там, дзе Нёман на захадзе помніць
варожую кроў,
Дзе на ўзвышшах Наваградскіх
дрэмлюць суровыя вежы

І вішнёвыя хаты глядзяцца
у шырокі Дняпро.
Ты ляжыш там, дзе сіняя
Прыпяць ласкава віецца,
Дзе Сафія плыве над Дзвіною,
нібы карабель...
Там, дзе сэрца маё з першым
крокам, як молат, заб'ецца,
Калі б нават сляпым і глухім
я прыйшоў да цябе.
Што сляпым? Нават мёртвым
успомню высокія зоры,
Над ракою чырвонай і цьмянай
палёт кажаноў,
Белы ветразь на сініх, на гордых,
як мора, азёрах,
І бары-акіяны, і неба — разлівы
ільноў...

## Белавежа

Самая славутая ў Беларусі пушча, вы ведаеце, якая? Белавежская. Яна на захадзе нашай рэспублікі, на мяжы з Польшчай. А самая галоўная ўкраса пушчы, вы ведаеце таксама, — белавежскі зубр. Гэта — цар звяроў, якія насяляюць пуш-

чу, Ён самы вялікі і дужы. Можа паваліць рагамі дрэва, разбурыць сцяну з бярвенняў, можа нават на лясной дарозе спыніць матацыкл і машыну. Але ён рэдка гэта робіць. Зубр — рахманы і спакойны звер, калі яго не чапаюць.

А вось — алень. У яго на галаве — рогі, як разгалістыя галіны з вострымі сукамі. Хто скажа, што гэта не магутная зброя, якою можна абараніцца і адагнаць ад сваёй сямейкі любога ворага?

А дужыя прыгожыя асілкі, каб умелі гаварыць, што б яны сказалі нам?

— Мы таксама гаспадары пушчы. У рагах і ў нагах у нас нязменная сіла, а завёмся мы — ласі.

— А мы — дзікі,— сказалі б нам, каб умелі гаварыць, невялічкія і смешныя паласатыя парасяткі. Так, яны з пароды свіней, толькі дзікія, таму і завуць іх — дзікі. Побач з малымі іх бацька — страшны і грозны, з доўгім лычом. У яго абапал пашчы два вострыя, як нажы, іклы. Ён вартуе

сваю сямейку — чацвёра маленькіх паласацікаў. Калі яны падрастуць, палосы знікнуць. Дзеці стануць як іх бацькі — укрыюцца бурым шчаціннем і адгадуюць сабе таксама вострыя іклы.

Пушчу ахоўваюць людзі. Тут звяры ведаюць, што чалавек — іх друг і заступнік.

## ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ

### Зямля з блакітнымі вачамі

Зямля з блакітнымі вачамі —
Святло азёр, прастор лугоў!
Тут называюць Васількамі
На Беларусі хлапчукоў.

Звіняць крыніцы, як цымбалы,
Сцяжынкі свецяць у лясах.
Палі, узгоркі, перавалы —
Прасторны шлях, далёкі шлях!

Краіна славы партызанскай,
Краіна міру і даброт!
Ты — наша гордасць,
Наша казка,
Як сонца, шчодры твой народ.

## ПЯТРУСЬ БРОЎКА

### Беларусь

Зямля Беларусі! Вачамі азёраў
Глядзіш ты ў празрыстыя высі нябёс,
Начамі, што яблыкі, падаюць зоры,
Знікаюць па водах, па чорных разорах,
Па травах, абсыпленых кроплямі рос.

Былога быліны, старога паданні
Плывуць, як аблітыя сонцам чаўны,
Па краю зялёным, прасторах
бяскрайніх
Ад Нёмна да Сожа, ад Буга да Гайны,
Па хвалях Дняпра і шырокай Дзвіны.

Бацькоў нашых слава на іх
узбярэжжах,
Гамоняць пра гэта бары-байкары,
Гамоняць пра гэта і Полацка вежы,
І Турава сцены, і шум Белавежы,
І роднага Мінска сівыя муры...

## ВІТАЛЬ ВОЛЬСКІ

### Беларускае мора

«Беларускае мора».

Мне прыходзяць на памяць гэтыя словы. Так нярэдка называюць Нарач.

І сапраўды, гэта самае вялікае возера Беларусі.

Плошча яго — восемдзесят квадратных кіламетраў. Найбольшая глыбіня — трыццаць пяць метраў. Знаходзіцца яно на паўночным захадзе Мінскай вобласці.

Нарач адносіцца да азёр, якія не зарастаюць раслінамі. Вада ў гэтых азёрах чыстая, празрыстая, багатая на кісларод. Такія вялікія і глыбокія азёры называюцца аліγатрофнымі. У іх адбываецца безупынны рух вады ад ветру і ад глыбінных плыней. Дзякуючы гэтаму прыбярэжная паласа не ператвараецца ў балота і возера застаецца чыстым і адкрытым. Над Нараччу амаль заўсёды дзьмуць вятры.

Паўночныя і паўночна-ўсходнія берагі Нарачы ўзвышаныя, паўднёвыя і заходнія — нізкія.

На паўднёвым усходзе з возера выцякае рэчка Нарач, якую мясцовыя жыхары называюць Нарачанкай. Звілістай стужкай прабіраецца яна

сярод топкага балота, якое зарасло хмызняком і чаротам, у раку Вілію, прыток Нёмана.

На поўначы бераг возера закругляецца, набываючы правільную форму чашы, да краёў напоўненай вадой. З усходняга боку паўз возера ўецца дарога, абапал якой высяцца сосны, расце ядловец. Справа цягнецца цудоўны, сухі і вясёлы сасновы бор. Злева наступаюць на бераг хвалі.

На паўднёвым беразе лясоў няма. Да вады спускаюцца спадзістыя ўзгоркі. На іх расце толькі трава. Бераг нізкі, з зараснікам трысця і чароту.

На ўсходзе возера Нарач злучаецца вузкім пралівам між пясчаных кос з возерам Мястра, плошча якога — трынаццаць квадратных кіламетраў. Непадалёку знаходзіцца возера Мядзель і маленькае возера Баторын.

З вяршыні кургана каля вёскі Мікольцы можна ўбачыць усе гэтыя азёры Нарачанскай групы.

Паўночную частку Беларусі нездарма называюць краем блакітных азёр. На поўнач ад Нарачы іх налічваецца некалькі тысяч, і малых, і вялікіх. Усе яны ўзніклі дваццаць — дваццаць пяць тысяч гадоў назад.

Вучоныя лічаць, што магутны ледавік, насунуўшыся ў чацвёрты раз з гор Скандынаўскага паўвострава, пакрыў усю гэтую мясцовасць пластом лёду таўшчынёю ў сотні метраў. Рухаючыся з поўначы на поўдзень, вялікія масы лёду драбнілі цвёрдыя пароды, цягнулі іх з сабою і пакідалі на сваім шляху буйныя валуны, дробныя каменні, гліну і пясок. З матэрыялаў, прыцягнутых ледавіком, утварыліся марэны — высокія грады абломкаў горных парод. Пры гэтым узгоркі чаргаваліся з глыбокімі лагчынамі.

Калі ледавік пачаў раставаць, частка вады затрымалася ў лагчынах і нізінах, утварыўшы азёры. У спадчыну ад ледавіка засталіся не толькі гэтыя блакітныя азёры, не толькі

шматлікія камenні, вялікія і дробныя, на палях Мінскай і Віцебскай абласцей, але і прыгожы, хвалісты рэльеф мясцовасці.

Марэнныя грады былі прыроднымі плацінамі, якія затрымалі расталую ваду ледавіка. Яны ўтварылі найбольш буйныя азёры, у тым ліку і Нарач — «Беларускае мора».

## ЯКУБ КОЛАС

## Вясковая дарога

Вузкаю крывою стужкаю праходзіць меж палеткаў вясковая дарога. На кожным кроку разбілі яе калдабоіны; шчыра ўсыпаў пясок, багата на ёй каменння. То ўзбяжыць яна на горку, то спусціцца ў лагчынку, цёмнаю норкаю марскане ў лес, пад стрэху хмурных ялін, абагне курган, узгорак, роўнаю палоскаю ляжа на полі, перасячэ гай, прарэжа луг, ускочыць у вёску, згубіцца тут на мінутку і потым зноў выскачыць у поле і зноў пабяжыць калясіць грудзі зямлі.

Люблю я гэту вузкую, гэту трасучую мужыцкую дарогу. Ідзеш адзін у полі па гэтай дарозе. Яркае сонца аблівае твар зямлі мяккім цёплым светам. Бугаркамі параскідаліся па небе хмаркі, як крыгі вясною; то круглыя, то пляскатыя, плывуць яны дзе чародкамі, адна за адною, а дзе адзінока ў адну старану неба і прападаюць на краі зямлі, усё роўна як уваходзяць у зямлю. Над полем кружацца жаваранкі; крычыць дзесь-то ў небе коршун, трапечацца ястраб на адным мейсцу. А дарожка ўсё цягнецца і цягнецца, як разбэрсаны клубок ніцей, узбягае на горкі, абыходзіць балотцы. Ціха бывае часамі на гэтай дарозе! Рэдка праедзе тут панская брычка, запрэжаная параю або тройкаю добрых, сытых коней; калі-нікалі празвініць тут паштовы званок. Часцей сустрэнецца простая мужыцкая каламажка, каторую дробным трушком пранясе худзенькі мужыцкі конік, падымаючы пыл і пясок, насохшы

на сонцы, доўгім слупам; пратарахцяць драбіны сваімі рассохшыміся лёсткамі і скрыпучымі, даўно не еўшымі дзёгцю, калёсамі. Цэлы абоз фурманак праедзе ціхім крокам з бочкамі са смалою або вугаллем. Пройдзе мужык-працавік у лапцях з загарэлым тварам, на катораым відаць невясёлыя думкі; убогі, абвешаны торбамі, з расхлістанаю грудзінаю, у рванай адзежы...

А ўкруг, куды ні кінь вокам, параскідаліся нецікавыя абразы нашага роднага краю, чуць-чуць закрытыя туманам, як невясёлаю думкаю, — так знаёмыя, так поўныя ціхага, смутнага хараства. Там і сям чарнеюць бародкі і кудзеркі хваёвага лесу, раскіданага па краях поля; узгоркі, зарошшыя маладым хвойнікам і купчастым ялаўцом. Цёмная ёлка, дзівам уцалеўшая ад рукі чалавека, нудна стаіць наводшыбе ад лесу і калыхае касматымі лапамі; кучка бярозак, лагчынкі, балотцы. А там — зялёная купа са-

довых дрэў панскіх садоў, багатая дваровая будова весела і горда выскачыць з-за горак, чорнаю плямаю кінецца ў вочы мужыцкая вёска, хораша абрысуецца белы яблык царкоўнай вежы...

Усё гэта так знаёма, так блізка сэрцу беларуса!

## Тэматыка чытання: З УСМЕШКАЙ І ЎСУР'ЁЗ...

*Не за трыдзевяць зямель*
*Адплывае карабель,*
*Не за сінія нябёсы*
*Мы ляцім шукаць дзівосы,—*
*Азірніцеся, сябры:*
*Колькі цудаў на двары,*
*Колькі ў наваколлі —*
*Не злічыць ніколі!..*

В. Зуёнак

## ВАСІЛЬ ВІТКА

### Травінка

Чалавек пабудаваў горад. А каб яму нічога не замінала, пасек дрэвы, якія былі, зраўнаваў зямлю

і заліў асфальтам — вуліцы, двары і ўсе сцежачкі. От, думае ён, кругом харашыня і чысціня, як на стале, хоць кашу стаў і хлеб кладзі. Але нядоўга цешыўся чалавек такой харашынёй. Нідзе ні дрэўца, ні цянёчку, ні халадку. Ні ветрык не зашуміць у лісці, ні птушка не абзавецца.

Засумаваў чалавек. «Што рабіць?» — думае. Трэба саджаць дрэвы. Узяў рыдлёўку — грукаў, грукаў у асфальт, у камень — не можа прабіць ямачкі. Трэба машына. Прыкаціў машыну. Уключыў матор на ўсю магутнасць. Трасецца, калоціцца машына, грукаюць малаткі, крышацца стальныя свярдзёлкі — ледзь-ледзь прагрызаюць тую цвердзь. Змарыўся чалавек, знямогся, сеў адпачыць. Чуе — пад асфальтам нехта як бы ціхенька скрабецца. Ці не мышка? Падышоў, нахіліўся, аж гэта кволенькая зялёная травіначка.

«Ого! — сказаў чалавек.— Калі ў цябе столькі сілы, дык навошта мне сваю траціць! Расці сабе, травінка!» А тая, убачыўшы сонейка, абрадавалася і пачала расці проста на вачах — расце, расце... Чалавек слухае, як патрэсквае асфальт пад нагамі, і раптам бачыць, што адна за адной падымаюцца купінкі, а з кожнае — то галінка, то лісток. «Хто ты?» — пытаецца ён у аднаго. «Я — дубок», — адказвае адзін. «А я — клёнік», — адказвае другі. «А я — каштан!» — «А я — ліпка!» — «А я — ружа!» — «Няўжо? — здзівіўся чалавек. — Вы якраз мне і патрэбны. Цяпер я вас буду шанаваць і даглядаць».

Усе дрэвы і кветкі так абрадаваліся, пачалі так дружна расці, што цяпер гэты горад называецца горад-сад. Птушкі там гнёзды ўюць, дзетак выводзяць, а пад вокнамі ў людзей свішчуць салаўі...

## ЗМІТРОК БЯДУЛЯ

## Скарб

Ля рэчкі, пад вольхай, хохлік знайшоў ракавінку. Уладзіў у ёй кузню і давай чырвонцы каваць. Праца ў яго заўсёды кіпела ўночы, калі, бадай, усе жывыя істоты спалі, калі спяваў адзін салоўка і месячык рэчку фарбаваў.

У кузні ў хохліка было некалькі памочнікаў. Светлячок раскладваў агонь на горне. Цвыркун працаваў малатком пры кавадле. Жаба дзьмухала кавальскімі мяхамі.

Пад карэннямі вольхі, ля рэчкі, крот выкапаў патаемныя падзямеллі, дзе хохлік хаваў свой багаты скарб — скрыні з золатам. Разнеслася вестка па ўсёй ваколіцы ля рэчкі, што хохлік вельмі багаты і мае незлічоныя скарбы пад вольхай.

— Сама сваімі вушамі чула, — казала маленькая плотачка ў рэчцы, — цэлымі начамі куе ды куе ў сваёй кузні, грукае і стукае і нам, рыбкам, проста спаць не дае.

— Сама сваімі вачыма бачыла, — казала варона, — усё там у яго ў кузні блішчыць і блішчыць. Свеціць як маланка, ажно вочы слепіць мне, старой. І я мусіла сабе купіць цёмныя акуляры, бо доктар драч напужаў мяне, што зусім аслепну пад старасць, калі не буду асцерагацца. Адно гора з гэтым хохлікам.

— Ку-ку! Ку-ку! Раз-два! Тры-чатыры! — кукавала зязюля на вольсе. Яна ў цёплыя раніцы сядзела на дрэве ды ўсё лічыла багацце хохліка. Але зязюля ў лічбах надта не кемная: лічыць-лічыць, заблытаецца ды зноў спачатку пачынае, і гэтак штодня.

— З-з-з-м-м-м! З-з-з-м-м-м! — гудзеў авадзень над рэчкай. — Гэта ж проста бяда, аднаму ўсё, а другому нічога. Я лётаю-лётаю, б'юся як рыба аб лёд, і нічагуткі не маю, а хохлік увесь свет захапіў.

— Ш-ш-ш! — казаў чарот. — Не шуміце так, не грыміце ды не зайздросьце. Працуйце, дык і вы будзеце

мецъ. Я вось сведка, як хохлік са сваёй сям'ёй працуе да поту.

— Дурань, дурань, дурань! — крыкнуў дзяцел чароту. — Не лезь, куды цябе не просяць. Маўчы ды годзе. А вось давайце, браткі, будзем дзяліць хохлікава дабро!

— Давайце! Давайце! — крыкнулі вераб'і.

— І мы, і мы да кампаніі! — загудзелі камары.

— Калі ўсім, дык і нам! — закудахталі куры.

Падняўся шум, гармідар, крыкі. Наляцелі з усіх бакоў звяры і птушкі, мухі і ўсе жывыя істоты, хто толькі даведаўся аб багацці хохліка. Усе рынуліся да хохліка ў кузню, каб яго абрабаваць.

Але хохліка таксама ўлегцы не возьмеш. Ён схаваў свае скарбы спрытна. Закопваў па ўсёй ваколіцы ў розных мясцінах — па лясах, па лугах, пад крушнямі, пад дрэвамі. Не было лапінкі зямлі, дзе ні ляжалі б яго скарбы. Але ніхто

іх знайсці не можа. Грабуцца куры на сметніках. Капаюцца птушкі на палях. Порацца звяр'ё пад карчамі, рыба ў вадзе. Шукаюць, шукаюць, але нічога з гэтага не выходзіць.

Наслухаўся малы Саўка ад свайго старога дзеда, каторы жыў у млыне ля рэчкі, шмат баек аб багатых скарбах. Яны захаваны ў зямлі, іх усе шукаюць пад карчамі і знайсці не могуць.

— Іх трэба шукаць апоўначы ў купальскую ноч, калі кветка папараці цвіце, — казаў дзед, — тады можна іх знайсці.

Вось у купальскую ноч, калі дзед ужо спаў, малы Саўка выйшаў ціхенька з хаты. Узяў з сабою рыдлёўку і пабрыў скарбаў шукаць. Убачыў ён здалёку агеньчык, які блішчаў на полі ля крушні і вабіў да сябе.

— Гэта, пэўна, скарб! — падумаў Саўка і пайшоў на гэты агонь. Ён да агню, а агонь ад яго далей і далей, і завёў агонь хлопчыка ў самы

цёмны гушчар. Страшна і жудасна было ў гушчары. Дрэвы, як жывыя істоты, шапталіся паміж сабою і нібы дзівіліся, што такі малы хлопчык не баіцца адзін швэндацца ў лесе па начах. Тым часам агонь знік, а замест агню залаты пеўнічак заблішчаў на карчы.

— Вось дзе скарб! — узрадаваўся Саўка і трах рыдлёўкай пеўнічка па галаве. Пеўнічак запяяў і знік, а замест пеўнічка паказаўся залаты зайчык. Саўка зрабіў тое самае з зайчыкам. Паказалася залатая лісічка... Затым — залаты ваўчок... Залаты мядзведзь... Але ён дзіка раўнуў і глынуў Саўку.

Ачухаўся Саўка праз некалькі хвілін. Ажно стаіць ён пад зямлёй, а на яго глядзіць і ўсміхаецца хохлік, малюсенькі і тоненькі, як травінка, прыбраны ў шоўк і ядвабу. На галоўцы ў яго залатая карона з дарагімі каменнямі.

— Вось ты і папаўся, Саўка, у мае рукі! — сказаў хохлік.

— А я ж цябе не баюся, — загарачыўся Саўка. — Зачэпіш мяне, дык я цябе вось адным пальцам задушу! — і паказвае хохліку свой палец. Але як глянуў сам на свой палец, дык адразу анямеў ад страху: палец цянюткі, як павуцінка. Тады давай Саўка аглядаць усяго сябе. Ажно ён сам такі ж маленькі, як хохлік. Тут Саўка спужаўся і заплакаў.

— Не плач, — сказаў хохлік. — Давай цяпер, калі ты ростам такі, як я, будзем аглядаць мае скарбы пад зямлёю.

— На волю хачу, да дзеда! — яшчэ галасней заплакаў Саўка, бо ў яго ўжо адпала ахвота скарбы глядзець.

— Вось табе і адважны, — пачаў кпіць з яго хохлік, — звяроў страшных не баяўся, а цяпер плачаш. Сорам, а яшчэ такі хлопец! Глянь, Саўка, налева і дзівіся!

Як глянуў Саўка налева, дык адразу плакаць перастаў, бо сярэбра-

ныя палацы замігацелі пад зямлёй. Увёў хохлік Саўку ў палацы. Як заблішчалі залатыя сцены і дарагія каменні на сталах, дык Саўка аж засмяяўся з радасці і забыўся аб усім на свеце.

— Гэта мае палацы, — тлумачыў яму хохлік. — Я тут жыву з усёй маёй вялікай грамадой. Мы ўсе вельмі багатыя. Мая грамада разышлася па ўсіх кутках зямлі на працу. Кожны хохлік мае багатыя скарбы — куе і куе золата і дае багацце таму з людзей, хто шчыра працуе. Матка-зямля мае шмат багацця. Яна шчодрая да тых, хто любіць працаваць. Без мазалёў і поту ніякіх скарбаў не знойдзеш.

Раптам пачуўся шум пад зямлёй. З усіх бакоў, з усіх шчылін пачалі сыпацца хохлікі, як залатыя сняжынкі, як брыльянтавы мак, як жывы каляровы дождж. Малюсенькія-малюсенькія, драбнюткія-драбнюткія і многа-многа, ажно ў вачах мігацела, гледзячы на іх.

А ўсе, відаць, працаўнікі заядлыя, майстры адукаваныя: хто з сякерай, хто з рыдлёўкай, хто з малатком, хто з мяшочкам за плячыма, а хто з такім дзіўным інструментам, што Саўка і не ведаў, што гэта.

— Гэта мая сямейка на вячэру прыйшла... Гэй, ты! — паклікаў хохлік аднаго з кампаніі. — Як расце поле таго ратая, што раней за ўсіх у вёсцы на шнур свой выходзіць?

— Вельмі добра расце... Я сам даглядаю жытнія зярняткі, кармлю іх зямельным сокам і паю расіцай.

— А ты што сягоння зрабіў? — строга крыкнуў ён другому.

— Я глядзеў за тым, каб сад добра расцвітаў, каб вецер без пары кветак не зрываў.

— Ну, глядзі, бо гаспадар дзень і ноч у садзе капаўся, трэба, каб яблыкі былі, як гарбузы, а грушы — як кулакі.

— А ты, жэўжык, што рабіў? — звярнуўся ён да трэцяга.

— Я пільнаваў агарод з агуркамі.

Лічыў і лічыў, бо трэба, каб сёлета было шмат агуркоў. — І хохлік пачаў лічыць па пальцах. — Пяць коп гаспадару; шаўцу, што яму боты шыў, — тры капы; кавалю за рыдлёўку — тры капы; хлопчыку, які ваду цягаў, — тры...

— Ах ты такі і сякі! — зазлаваўся стары хохлік. — Чаму ты гэтакі скупы? Глядзі, каб усім было не меней як па дзесяць коп!

— Буду старацца, — пужліва сказаў працаўнік.

Падышоў новы хохлік з кнігай і пачаў чытаць аб тым, як хлопчыкі ў школах вучацца, хто стараецца і хто толькі мух ловіць. Доўга чытаў ён аб гэтым, пералічваючы ўсіх сяброў і знаёмых Саўкі.

— Рыхтаваць старанным хлопчыкам самыя найлепшыя гасцінцы, а гультаям і абібокам нічога не даваць! — загадаў старшы хохлік.

Пасля розных распытванняў працавітыя хохлікі селі вячэраць. Чагочаго там не было на вячэру: самыя

найлепшыя прысмакі, якія толькі ёсць на зямлі. Саўку, як госцю, вядомая рэч, пападаліся найсмачнейшыя кавалкі.

Павячэраўшы сытна, Саўка заснуў і не паспеў азірнуцца, як апынуўся на ложку сваім у дзедавай хаце.

З таго часу болей Саўка не шукаў скарбаў, бо ведаў, што матка-зямля мае іх у сабе вельмі шмат, але дае толькі тым, хто працуе. І Саўка ўзяўся за навуку, каб навучыцца працаваць.

## Музыка

Пастушок Васілька з самых малых дзён любіў іграць на жалейцы. Іграючы, яму ніколі не было нудна са статкам сваім у самым дзікім гушчары, на самых глухіх палянах сярод балота.

Ён іграў і іграў. Так шчыра іграў, ад усёй душы, ажно сам цешыўся, і ўсё навокал яго цешылася. Васілька любіў усім сэрцам сваю

жалейку. Моцна любіў. Ён мог забывацца палуднаваць, але іграць ён ніколі не забываўся. І таму ён навучыўся іграць вельмі прыгожа.

Гэта ўцяміла ўся ваколіца. Гэта ведаў яго статак. У гэтым перакаваліся лес, поле, рэчка, рыбкі, птушкі, звяры, казюлькі і ўсе самыя драбнюткія стварэнні на паляне.

Бывала, як зайграе Васілька вясёлую песеньку, дык неба весялілася, сонца смяялася, дрэўцы ківаліся ў такт. Зляталіся розныя птушкі, збягаліся розныя звяры, спаўзаліся розныя гáдзіны слухаць ігру пастушка. Рэхі каціліся ад дрэва да дрэва, ад горкі да горкі, ад лугу да лугу і склікалі ўсіх. Усім істотам было весела і добра ад яго песняў.

А калі пастушок іграў жаласлівую песню, дык сумна рабілася на полі. Краскі слязамі расістымі пакрываліся. Дрэўцы і кусты нямелі, а высока над полем хмаркі затулялі яснае неба. Усе жывыя істоты апускалі галовы і глыбока за-

думваліся. Але і смутак-жаль ад трэляў жалейкі быў усім прыемны, як свежы ранішні туман, і салодкі, як ліпавы мёд. Усім нечага надзвычайнага жадалася пры яго ігры. Усіх Васілька зачароўваў. Над усім ён панаваў са сваёй жалейкай, якая мела ў сабе вялікую сілу.

Прыходзілі на адукацыю да настаўніка ўсе, хто толькі меў сэрца жывое. Ён іх вучыў старанна, бо чым болей музыкаў было вакол, тым болей ён радаваўся. А вучыў ён не проста, але па нотах. Нотамі ў яго былі не такія нямыя і мёртвыя значкі і круцёлачкі на паперы, а ўся жывая зямелька са сваімі рознакаляровымі краскамі, траўкамі, дрэвамі і серабрыстымі крынічкамі. Блакітнае неба са сваімі свечкамі-зоркамі, размаітымі хмаркамі, пераліўнымі зарніцамі і фарбамі. Гэта ўсё было нотамі для пастушка, гутарлівымі, спяваючымі і рухлівымі. Па іх вельмі лёгка было вучыцца.

Першага навучыў пастушок сваёй музыцы салоўку. Салоўка быў яго найлепшым вучнем. Калі адукаваны салоўка спяваў апоўначы ў бярэзніку, дык не то што блізкія істоты, але і далёкія зоркі ў небе слухалі з прыемнасцю і перамірգваліся ад дзіва паміж сабой, кажучы: «Глядзіце, сястрычкі, такі малы шэры жэўжык, а якія слаўныя трэлі выводзіць».

Пасля салоўкі вучыўся ў пастушка жаваранак. Гэта была не такая здольная птушачка, як салоўка, але з грахом папалам і жаваранак патрапіў бы іграць вяселле лёгкім хмаркам пад вясновым небам над свежым пуховым чарназёмам.

Пасля салоўкі і жаваранка вучыліся і іншыя птушкі. «Усе пяюць, усе іграюць, — падумаў хлопчык. — Увесь свет пад сонейкам мае сваю музыку». Вялікая пашана з'явілася ў хлопчыка да ўсяго свету.

«Давай, — падумаў хлопчык, — зайграю для сонейка, якое пануе над усім светам!»

І вось у адну пекную раніцу хлопчык яшчэ цямнютка выгнаў статак у поле. На прасторы ён зайграў на сваёй жалейцы. Зайграў прыгажэй, чым заўсёды. Уся пекната летняй зямлі адбілася ў яго песні.

Гэткай прыгожай музыкі яшчэ ніхто на свеце не чуў. Гэта была песня без слоў, бо хлопчык іграў для сонейка, а сонейка без слоў добра разумела. Дзівіўся статак. Дзівіліся дрэвы, птушкі, рэчка, неба. Дзіву давалася ўся зямля.

— Калі для сонейка, дык і мы да кампаніі! — сказалі ўсе істоты ў полі і ў лесе.

І вось на ўсходзе сонейка на лузе пачалася вялікая музыка: усе стварэнні на зямлі і сама зямля ігралі і спявалі, кожны на свой лад, на тысячы-тысячы галасоў.

Увесь свет выглядаў велізарнай скрыпкай з незлічона многімі струнамі. Гэта было так хораша, так цудоўна прыгожа, ажно само сонейка вельмі ўзрадавалася. Спусцілася сонейка з неба на сваіх лёгкіх

прамяністых скрыдлах і пацалавала маленькага хлопчыка ў самыя вусны. Пацалунак быў такі лёгкі, што пастушку здалося, нібы кволы ветрык толькі крануўся яго твару. Пацалунак быў такі шчыры, што хлопчык да самай магілы аб ім не забудзе.

А сонейка было такое радае і добрае, што задумала апрануць зямлю ў багатыя вопраткі, у шаўковыя і залатыя колеры. І ззяць, ззяць і радаваць усіх.

З-пад аксамітнай і пурпуровай хмаркі ўзышло яно, гарачае і бліскучае. Узышло ды ўсміхнулася. Усміхнулася ды яшчэ вышэй паднялося і абсыпала сваімі промнямі зялёны ўзгорак, дзе стаяў пастушок. Пастушок выглядаў ці то сярэбраным, ці то залатым. Праменні красавалі, як агнёвыя васількі, на яго галаве. Праменні пырскалі яму ў твар дыяментавымі снапамі. Праменні сыпаліся бліскучымі іскрамі, каляровым макам з яго вачэй. Здавалася, што ў пастушковых вачах

драбнюткія хохлікі крэсяць агонь бесперастанку.

Хлопчыку так добра зрабілася на душы, што яму захацелася глянуць на сябе. Ён падышоў да рэчкі, каб зірнуць у яе, як у люстэрка.

— Глядзі, глядзі ў мяне, — сказала рэчка, — бо твая душа чыстая і празрыстая, як мая вада!

Зірнуў хлопчык у ваду і сам сябе не пазнаў. Такі ён стаў прыгожы! Гэты цуд утварылі над ім летняе сонейка і надзвычайнае шчасце, якое азарыла яго ўсяго...

## ЕЎДАКІЯ ЛОСЬ

### Маці

Маці родная, маці мая!
Ты на шчасце мяне нарадзіла.
Над калыскай спявала начамі,
Каб я дужай і смелай хадзіла.
Смела мерала далі вачамі.

Дзякуй, маці, што мне падарыла
Ты любоў да зямлі маёй роднай,
Дзе ўсміхаецца сонца так міла,
Дзе бягуць хвалі рэк мнагаводных,

Дзе гамоняць вятры на прадвесні
З маладой сакавітаю рунню.
Дзе звіняць салаўіныя песні.
Лес іграе на тысячах струнаў...

## СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ

### Сонечная сцежка

Жоўты лісцік тапаліны
Ціха падае з галіны,
І лісты, лісты наўкол
Апускаюцца на дол:
Высцілае лістапад
Сцежку ў наш дзіцячы сад.
Спрытна ходзяць ножкі
Сонечнай дарожкай.
Кожнай раніцай з ахвотай
Мы прыходзім на работу:
Ляльку трэба расчасаць
І кружочкі напісаць,
Збудаваць пясчаны дом,
З'есці кашу з малаком
І кату пачысціць боты.
Ой, як многа ў нас работы!

## Зазімак

Пажоўклая галінка на бярозе —
Прыкмета нечаканай сівізны.
Прыціхла ўсё ў чаканні і ў трывозе:
Бліжэй зіма, далёка да вясны.

За ноч пясок на беразе астыне,
Замоўкне жураўліны пералёт,
Счарнеюць у гародчыку вяргіні,
І заіскрыцца ў лужах тонкі лёд.

Астынуць сонца кволыя праменні,
У хмарах затрымаецца зара,
Замоўкне ўсё ў глыбокім
задуменні —
Вось і настала зімняя пара.

## УЛАДЗІМІР ЯГОЎДЗІК

### Кнігаўка

Добрая ў балотнай і вадзяной жыўнасці варта. Пільная, адважная. Не хаваецца і не ўцякае ад небяспекі, а кідаецца насустрач ёй і голасна, каб усе пачулі, дапытваецца, хто б ні завітаў: «Чый ты? Чый ты?» З дабром ідзеш — не пакрыўдзішся

на чуйных кнігавак-вартаўніц. Намер зламысны затаіў — балотныя насельнікі ўжо ведаюць: блізка чужак, трэба хавацца.

З выраю кнігаўкі вяртаюцца ранняю вясною, калі на палетках і балотах яшчэ ляжаць шэрыя лапікі снегу. Гнёзды свае ладзяць проста на купінах, з леташніх сухіх травінак. Потым, як пацяплее, адкладваюць туды яйкі і старанна грэюць-выседжваюць іх, пакуль не праклюнуцца птушаняты. Кнігаўкі — клапатлівыя і смелыя бацькі. Я неаднойчы бачыў іхнія паветраныя бойкі з нахабнымі варонамі, ахвотніцамі да лёгкае спажывы. А вось бадзяжнага ці пастушковага сабаку, які ласы да птушынага мяса, кнігаўкі перамагаюць хітрасцю. Лятаюць блізенька, назаляюць яму, вымушаюць даганяць сябе. І ўсё далей адводзяць ад безабаронных птушанят.

Ад золку і да змяркання вартуе балота кнігаўка. Дагаджае птушынай грамадзе, перад якою калісьці

вельмі правінілася. А было гэта, як сведчыць паданне, так...

Даўным-даўно надарылася на Беларусі надзвычай спякотлівае лета. З дня ў дзень няшчадна смажыла сонца, не сунімаўся, абпальваў усё жывое вецер-сухавей. Высахлі азёры, рэкі і крыніцы. Пабедавалі людзі, а потым сышліся дружнай талакой і выкапалі ў кожнай вёсцы па глыбокаму калодзежу — здабылі сцюдзёную ваду. А птахам і звярам лясным — хоць уцякай куды вочы глядзяць. Сабраліся яны на раду і таксама надумалі дакапацца да вады, каб наталіць нясцерпную смагу. Шчыра ўсе ўзяліся за работу. Адна кнігаўка адмовілася корпацца ў зямлі. «Мне, каб напіцца, — сказала яна, — хопіць і расінкі!» Моцна пакрыўдзіліся, раззлаваліся на кнігаўку птушкі і звяры. Напусціліся на гультайку: «Ты вады не прасіла! Дык ніколі не зможаш напіцца ні ў рэчцы бягучай, ні ў возеры стаячым, ні ў крыніцы празрыстай. А каб наталіць смагу,

мусіш чакаць дажджу заліўнога. Інакш ні табе, ні дзецям тваім не жыць на балоце!..»

Так і збылося. Дакапаліся птушкі і звяры да вады, зноўку вярнулі на Беларусь азёры, рэкі, крыніцы. Хапае ім цяпер вады. Адна кнігаўка ўсё ніяк не можа напіцца, лятае і крычыць: «Піць хачу! Піць хачу!..» Блізка да вады, а дзюбку памачыць не адважваецца. Баіцца, каб не прагналі з роднага балота. І ўдзень і ўночы слугуе птушынай грамадзе, вартуе яе ад ліхой бяды.

## Рак

Навучу цябе, мой маленькі сябар, цікавай скорагаворцы. Слухай, запамінай. Потым паспрабуй пераказаць. Ды голасна і як мага хутчэй.

Ехаў грэка цераз рэку.
Бачыць грэка: ў рэчцы рак.
Сунуў грэка руку ў рэку,
Рак за руку грэку — цап!

Не бяда, калі на першы раз заблытаўся язык. На тое і скорагаворка.

А вось цікаўнага грэку мне шкада. Пэўна, зваліўся ў рэчку, вымак да апошняй ніткі небарака. Бо клюшні ў рака — што абцугі кавальскія. Нікому не раю здароўкацца, калі ён яшчэ не выкупаны ў кіпні і не стаў чырвоным.

Жывуць ракі ў азёрах і рэках. У норках, пад карчамі ці каменнем. Спажываюць усё, што патрапяць злавіць: чарвякоў, рыбу-малечу, іншую дробную вадзяную жыўнасць. Загіне хворая рыбіна — яны тут як тут, нават хваста ад яе не пакінуць. Не даюць забрудзіцца вадзе і тым прыносяць вялікую карысць.

Дзіўнае стварэнне — рак! Вусаты, з сярдзітымі, нібы прылепленымі вачыма. Аднак самае дзіўнае, бадай, як ён поўзае і плавае. Хвастом наперад! А ўсё таму, расказвае паданне, што з вусачом здарылася вось якая прыгода...

Калісьці на Беларусі панавала ноч. Доўгая-доўгая. Цёмная-цёмная. Можа, і дасюль панавала б, але прыйшоў добры чараўнік і вярнуў

на нашу зямлю сонца. Потым склікаў усіх сляпых і кожнаму даў вочы, каб маглі цешыцца сонечным святлом. Апошні заявіўся рак. Надзьмуўся, нават не прывітаўся.

— А ты дзе дасюль бадзяўся? — спытаў яго чараўнік.

— У карчах блытаўся, — прабурчаў рак.

— То вазьмі сабе вочы, што засталіся, — падаў кош чараўнік, — больш ніякіх няма.

Знайшоў рак у кашы вочы, памацаў іх клюшнямі ды шпурнуў на зямлю.

— Сабе вазьмі гэтыя лупачы, а мне такія непатрэбны!

І павярнуўся, каб паўзці да сваіх карчоў.

— Ах ты, няўдзячны паганы рак! — зазлаваў на ганарліўца чараўнік і прыляпіў яму абы-куды вочы. — Дык ведай, калі яны табе непатрэбны, будзеш поўзаць хвастом наперад, а глядзець заўсёды назад!..

Так яно і сталася. Кожны можа ўпэўніцца.

## Ласка

Прыгожае імя далі нашы прашчуры гэтаму маленькаму звярку. Дый сам ён прыгожы: на спінцы буравата-карычневае футра, па баках і на жывоціку — белае. А зімою ўвесь становіцца белы. Людзі нават гульню ў гонар ласкі прыдумалі. Цікавую гульню, вясёлую. Праўда, шмат хто з дзяцей ад яе хаваецца. Але ж не надта схаваешся, калі хтонебудзь з дарослых прыгорне цябе да сябе і пытаецца:

— Ласка, ласка,
Дзе была,
Што ты ела,
Што піла?

І сам жа дзядзька-жартаўнік адказвае за ласку:

— Ела я травіцу,
А піла вадзіцу.
Тут мох,
Тут балота,
Тут пень,
Тут калода,
Тут глыбокая крыніца,
У ей сцюдзёная вадзіца...

Дай напіцца!
Дай напіцца!..

Хацеў бы, а не ўцячэш ад дужых рук, што цябе казычуць. Пакуль не папросішся праз смех і слёзы ці не абароніць мама альбо тата. Так і ад ласкі — ніводная мыш не ўцячэ, калі трапіць ёй на вочы. Самая глыбокая нара не ўратуе шэрую, бо звярок аднолькава добра палюе і на зямлі, і ў норах. Адольвае ласка і агідных пацукоў, хоць сама нярэдка меншая за гэтых ненажэрных шкоднікаў. Таму людзі радаваліся, калі такі нястомны паляўнічы сяліўся каля іхняга жытла. Сваё гняздо звярок будуе і ў дуплах старадрэвін, і ў чужых норах, і нават, здараецца, пад падлогаю ў хаце. Аблюбаванае месца старанна высцілае сухім сенам ці саломаю, мышынымі шкуркамі і птушынымі пёркамі. Цёпла, утульна ў такім дагледжаным гняздзечку дзіцянятам ласкі. І корму заўсёды хапае, бо адна ласка за ноч знішчае шмат мышэй і пацукоў. Яна так

зацята палюе на іх, што часам пудзіць свойскую жывёлу. Пачуе гаспадар непарадак у хляве, зазірне праз дзверы з ліхтаром — ніякай шкоды няма. Падумае: «Пэўна дзядок-дамавік ці дзядок-гуменнік сваволіў». А назаўтра, калі выпадала вольная хвіліна, расказваў дзецям, што хтосьці ўначы заплёў конскую грыву ці падаіў карову...

Вось так, дзякуючы маленькай ласцы, з'явіліся цікавыя казкі, якія мы ўсе вельмі любім слухаць.

# 4 клас

## Тэматыка чытання:
## РАДЗІМА МАЯ ДАРАГАЯ...

*Я — беларус, я ганаруся,*
*Што маю гэтае імя.*
Н. Гілевіч

### ЯНКА КУПАЛА
### Сын і маці

Сын

— Мамка, мамка, нам сягоння
Гаманілі ў школе
Аб якойсьці Беларусі,
Што жыве на волі.

Хоць я слухаў вельмі шчыра
(Не люблю іначай),
Ды ніяк не мог уцяміць,
Што ўсё гэта знача.

Маці

— А вось тое, мае дзеткі,
Глянь-зірні наўкола:
Бачыш гэтыя сялібы,
Хаткі нашых сёлаў;

Гэта поле — шнур ля шнура —
Ўзгоркі і лагчынкі,
На узмежку грушу-дзічку,
Крыж каля пуцінкі?

Бачыш логі, сенажаці,
А на іх — крыніцы,
Далей — бор зялёны, гонкі,
Што увысь глядзіцца?

А там далей, дзе ўжо вока
Дасягнуць не можа,
Тое самае пабачыш, —
А ўсё так прыгожа!

Сотні вёсак і мястэчак,
Гарадоў нямала,
Рэк бурлівых, пушч гамонкіх
З неапетай хвалай.

Там плывуць Дняпро, і Сожа,
Ды Дзвіна, і Нёман,
Белавежы, Налібокаў
Там чуваці гоман.

Гарады — Мінск, Віцебск, Вільня,
Магілёў, Гародня
І Смаленск з сцяной цаглянай —
Разляглі выгодне.

Аб вялікай нашай славе
Сведчаць на свет цэлы, —
Як жылі мы, панавалі
Ў родным краі смела.

Во ўсё гэта, мае дзеткі,
Ад межаў да межаў
Беларусяю завецца
Й да цябе належа.

Сын

— А! Ўжо сцяміў! Дык багат я,
Меўшы столькі цудаў:
Гэткім чынам я ніколі
Служкаю не буду.

Ну, а йшчэ скажы мне, мамка,
Бо я не развяжыў:
Што такое беларусы,
Як настаўнік кажа?

Маці

— Ах, які ты йшчэ дурненькі,
Каб не скеміць гэта!
Ну, паслухай: усе людзі,
Што ад лета ў лета,

Ад пакон вякоў жылі тут
І жывуць сягоння,
Носяць світкі, носяць лапці
Ды былі ў прыгоне,

Ўсе — і ты, і я, суседзі,
Хто, па-твойму, прусы?
Дык жа ўцям: на Беларусі
Жывуць беларусы!

Ды яшчэ, каб лепей ведаў,
Мушу табе ўспомніць:
Беларусы беларускай
Гутаркай гамоняць.

Сын

— Вось яно што! Праўда, мамка,
Ўжо сабе ўтлумачыў:
Беларус я! Ох, дам пытлю,
Хто скажа іначай.

Ну, але яшчэ не ўсё тут
Ясным мне здаецца:
Што такое беларускай
Гутаркай завецца?

Маці

— Ой, дурненькая варона,
Што з табой чыніці!
Як жа йначай беларусы
Могуць гаманіці?

Як жа мы з табой гуторым
Вось у гэту хвілю?
Як жа я пяю над зыбкай
Для малой Марылі?

Ды паслухай, як на вёсцы
Кажа дзядзька, цётка;
Як пяюць улетку жнеі
За сваёй работкай;

Як бабуля баіць казкі
Аб нядолі-долі;
Як начлежнікі спяваюць
На начлезе ў полі?!

Сын

— Ну, ўжо знаю, знаю, мамка!
Як у люстры бачу,
Пакажу я ўсяму свету,
Хто я дый што значу!

## ВАСІЛЬ ВІТКА

### Спадчына

Спадчына. Якое простае слова, і які няпросты яго сэнс! Сапраўды, цяжка ўявіць сабе чалавека без гісторыі, без кроўных сувязей з роднай зямлёй, без адчування сваіх вытокаў, без памяці, без душы, без роду і племені.

Кожны з нас паасобку і ўсе мы разам складаем народ, Радзіму, пачуццё любові да якой глыбокае і вялікае ў кожнага сумленнага чалавека. Усіх нас яднаюць галоўныя рысы характару: любоў да роднай зямлі, пашана да яе самых запаветных багаццяў і духоўных каштоўнасцей...

Памяць народа — гэта самае вялікае багацце, якое і называецца спадчынай. Род і народ яднаюцца адным дарагім словам — Радзіма. Гэта родныя і блізкія табе людзі, твая сям'я, твае продкі, памяць пра іх добрыя справы.

Спадчына — гэта і калыханка, якую спявала табе маці, і казка, якую расказвала бабка, і твая першая кніга, з якою ты прыйшоў у школу, і кніга, якую каля пяцісот гадоў таму назад надрукаваў наш вялікі асветнік Францыск Скарына.

## ВІТАЛЬ ВОЛЬСКІ

## У Белавежскай пушчы

Чалавеку, які ўпершыню трапляе ў Белавежскую пушчу, спачатку цяжка зразумець, дзе ён знаходзіцца, — так велічна і разнастайна прырода гэтага першабытнага лесу. У промнях ранішняга сонца таямнічымі здаюцца завалы і бураломы. Аджыўшы свой доўгі век, ляжаць аброслыя мохам дрэвы-гіганты. Побач з імі цягнуцца да сонца маладыя дрэўцы. Якіх толькі няма парод у гэтай лабараторыі прыроды! Нават на невялікім участку тут можна сустрэць да пяцідзесяці парод лесу: сасна, елка, дуб, бяроза, граб, клён, ліпа, алешына... Гэты спіс можна доўжыць.

Белавежская пушча — гэта адзіны ў Еўропе буйны масіў лесу, які захаваў свой першабытны характар. Ён размешчаны ў Беларусі на мяжы з Польшчай і займае тэрыторыю ў семдзесят чатыры тысячы гектараў.

З сівой, глыбокай старадаўнасці ідзе гісторыя пушчы. Яшчэ ў трынаццатым стагоддзі ля горада Камянца была ўзведзена круглая вартавая вежа, белая па колеры, ад якой, як мяркуюць, і атрымаў назву навакольны лес. Зараз Белая вежа стаіць ужо далекавата ад пушчы, але з'яўляецца нямой сведкай даўняй мінуўшчыны. Цяпер у пушчы дзяржаўны запаведнік...

Паўсотні відаў млекакормячых жыве ў запаведніку, але найбольшую каштоўнасць пушчы ўяўляе, вядома, зубр — рэдкі прадстаўнік жывёльнага свету, які захаваўся да нашых дзён яшчэ з ледніковага перыяду.

## УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

### Зямля пад белымі крыламі

(Урывак)

*Зараз вясна. Над усёй нашай краінай, наставіўшы белыя ветразі крылаў, планіруюць буслы. Іх многія і многія тысячы — хто лічыў? На вільчыках сялянскіх хат, на дрэвах, на калонах старых разбураных палацаў, на слупах капліц сярод маладога зялёнага жыта. Гнёзды паўсюль.*

*І таму мне здаецца, што ў гэтыя — і не толькі ў гэтыя — дні зямлю нашу, Беларусь, можна назваць «зямлёю пад белымі крыламі». І не здзіўляйцеся, дзяўчаты і хлопцы, на дзіўную назву кнігі, якая трапіла да вашых рук.*

*Да пэўнай ступені бусел — сімвал Беларусі... Вось так і планіруюць, планіруюць буслы. А мне пад іхні палёт асабліва добра думаецца пра Беларусь, нашу з вамі радзіму. І для вас я і хачу, наколькі хопіць маіх ведаў і здольнасцей, расказаць пра яе...*

*Я аб'ездзіў на Беларусі амаль усё. Няшмат засталося нават глухіх куткоў, дзе я не пабываў бы. Таму я насмельваюся сказаць, што ведаю сваю краіну і яе людзей. І менавіта таму, дарагія дзяўчаты і хлопцы, я стану гаварыць з вамі толькі аб тым, што сам бачыў і чуў. Гэта будзе кніга, напісаная сведкам, які многае (што датычыць сучаснасці) бачыў на ўласныя вочы. І я дужа хацеў бы, каб вы мне верылі, нават калі я стану вам расказваць самыя незвычайныя рэчы. Таму што жыццё багацейшае, чым мы яго ўяўляем. Жыццё часам бывае настолькі падобнае на казку, што нельга не ўскрыкнуць: «Ды не можа гэтага быць!»*

## Зямля мая беларуская

ВЁСКА, О РОДНАЯ ВЁСКА МАЯ!

Дык вось, вёска. Яна не такая, як на Украіне або на Доне. Там не рэдкасць вёскі ў 200–300–1000 двароў.

У нас 20–30 двароў — гэта ўжо вёска. Мала таго, на захадзе яшчэ й дагэтуль досыць многа хутароў, хаця людзі паступова і кідаюць іх. Ёсць, праўда, і вялікія вёскі, двароў на 1500, такія, як Рубель на Століншчыне. Але іх мала, напэўна, некалькі соцень, не больш.

За выключэннем некаторых раёнаў Палесся, беларускую хату ніколі не беляць знадворку, толькі ўнутры. Але старая беларуская вёска, тым не менш, прайграючы ў вясялосці знешняга выгляду перад вёскай, скажам, карпацкай або малдаўскай, мае нейкі дужа мілы, задумлівы і паэтычны каларыт, дзякуючы прысадам вялікіх дрэў на вуліцах і ў завулках, векавым дубам на сядзібах, вялізным дзічкам на былых межах, садкам і, урэшце, таму, што калі не адразу за хатамі, то хаця б на гарызонце амаль абавязкова відаць лясы ці пералескі, што калі не тут жа, то непадалёку — рака, рачулка ці возера. Шмат

зяляніны, шмат вады, шмат неба над галавою.

У нас хату часта будуюць талакою, з тоўстых і смалістых сасновых бярвёнаў. Таму што лесу ўсё яшчэ многа. Па той самай прычыне амаль няма глінабітнай падлогі, як на поўдні СССР, а ёсць падлога з дошак. Столь, вядома, таксама дошкавая, зверху, на гары, на яе насыпаецца пілавінне, для цеплыні. Стрэхі раней былі саламяныя або, на поўдні, з чароту, які даўжэй служыць. Таму даўжэй, што, калі страху растрэплюць вятры і дажджы, чарот можна зняць і зноў перакрыць ім хату. І так два-тры разы. Але і тады часта сустракаліся «шчапяныя» дахі. Цяпер гонтавы дах бывае на хаце часцей за ўсё. За ім ідзе шыфер. Чарапіца сустракаецца досыць рэдка. Дахі двухскатныя. Шатровыя або напаўшатровыя досыць рэдкая рэч.

Хата заўсёды будуецца вокнамі на вуліцу, уваход калісь быў, у

пераважнай большасці выпадкаў, з двара, а цяпер усё часцей з вуліцы. Франтон часта аздабляецца разьбою. На Давыд-Гарадоччыне, напрыклад, на ўсіх хатах знак сонца і расліны вакол яго. Разьба і навокал акон і на аканіцах. Не ўсюды, але часта. Раней хату абкружала прызба, цяпер хаты, вядома, на фундаментах.

Для прыкладу апішу некалькі вёсак. Спачатку хутар. Расолы Астравецкага раёна на Гродзеншчыне.

Цэнтральная база саўгаса досыць далёка. Да бліжэйшай станцыі Гудагай некалькі кіламетраў лесам, палямі, пералескамі. Паўсюль раскіданы грады ўзгоркаў, а на іх сіні зубчасты лес. Між градаў палі канюшыны, залатыя лапікі стральчастага лубіну. Праз густыя зарасці чорнай вольхі бяжыць вясёлая і чысцюткая, на дзве трэці зацененая дрэвамі рачулка Лоша. «Лоша» па-літоўску «стронга». І стронга сапраўды водзіцца тут. На беразе рэчкі прыткнуліся наводдаль адна

ад адной некалькі спраўных хат са студнямі, пунямі і адрынамі, у якіх так добра спаць на сене. Крыху далей, у звіліне Лошы, векавыя дрэвы былога фальварка. Ад дома засталіся толькі прыступкі ганка, якія вядуць у нікуды. А ля дарогі высачэзны крыж з неашкуранага, крывога дубовага ствала з гэткай жа папярочынай. Кажуць, што крыж пастаўлены былой гаспадыняй фальварка ў памяць аб павешаным правадыры паўстання 1863–1864 гг. Каліноўскім, якога яна кахала.

Другі край рэспублікі. Паўдзённы. Лахва Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці. Рака з непрыгожаю назваю Смердзь ёсць, аднак, адна з найпрыгажэйшых рэчак, якія мне даводзілася бачыць у маім жыцці. Недзе кіламетраў за дзесяць да ўпадзення ў Прыпяць рака пачынае драбіцца на рукавы. Атрымоўваецца некалькі астравоў, злучаных драўлянымі мастамі. На гэтых астравах хаты, што патанаюць у садах. Вада

рукавоў цёмна-зялёная, з сонечнымі плямамі, бо над імі вербы ўтвараюць суцэльныя тунэлі. І ў гэтых тунэлях, у імгле, цэлыя чароды чаўноў. Тут цудоўныя новыя пабудовы. У прыватнасці, школа. І, нібы вакол мала вады, тут яшчэ і шмат сажалак, дзе разводзяць карпаў.

Той самы поўдзень, але Мазыршчына. Вёска Данілегі. Гэта адна з тых мясцін, дзе жыхары яшчэ носяць па нядзелях і святах старадаўнюю народную вопратку. Хаты, выцягнутыя ў два рады, так густа абраслі дрэвамі, што здаюцца пагружанымі на дно глыбокага зялёнага возера. Некаторыя з іх пабелены і знадворку. Часам — крытыя трысцём. Вокны абведзены сінім. Наваколле — дрымучыя лясы. Трапляюцца дубровы па 400–500 год. Гэта менавіта тут стаіць у атачэнні шасцісотгадовых дубоў — «дуб Крывашапкі», «цар-дуб», «дрэва вечнасці» — вось колькі ў яго назваў. Яму тысяча гадоў. Размень-

вае другую тысячу. Немцы хацелі спілаваць яго і вывезці ў Германію, але партызаны паставілі варту. Не ведаю, ці трэба было. Немцам усё адно гэта не ўдалося б. З якою тэхнікай падступіцца да дрэва таўшчынёю з вялікі пакой?!

Возера Свіцязь, апетае Міцкевічам. Вялікі, амаль правільны круг, з усіх бакоў зарослы дужа старымі дубамі. Вада тут такая, што, калі нават проста выкупацца — валасы рыпяць дні два. У наваколлі яго тры досыць тыповыя вёскі. Міратычы, што працягнуліся доўгай паласою харошых хат. Тут захавалася даўно зачыненая чатырохсотгадовая драўляная цэркаўка з тыпу «патаемных». Назнарок малая, назнарок у гушчары, каб на час навалы і вайны не знайшлі. Яна славутая цудоўнай народнай разьбою.

Варонча. Вёска амаль гарадскога тыпу. Тут некалькі прадпрыемстваў. Але і гэта — вёска-музей. Тут, над запруджанай рачулкай, у гушчары,

стаяў — а можа, і цяпер стаіць — васьмісотгадовы дуб, звязаны з імем Міцкевіча. Унутры — дупло, у якім могуць паснедаць вакол стала чалавек дзесяць. Нават акенца ёсць, на другі бок. Можна высунуць галаву і глядзець проста з дрэва, як лясны дух. Наводдаль — руіны дужа даўняга касцёла і могілкі з цудоўнымі помнікамі з італьянскага мармуру. Тут пахаваны бацькі польска-беларускага паэта і фальклярыста Яна Чачота, блізкага сябра Адама Міцкевіча, а таксама — Верашчакі, сваяка Марылі Верашчакі, першага кахання паэта. Маёнтак Верашчакаў, Туганавічы, быў некалі побач. На яго месцы застаўся парк і «альтанка Марылі», некалькі ліп, пасаджаных кругам. Яны так зрасліся, што, каб адна не ўпала, унутр гэтага драўлянага круга нельга было б трапіць.

Як бачыце, амаль у кожнай беларускай вёсцы ёсць што паглядзець. Толькі трэба ведаць, што глядзець.

## Кацёл з каменьчыкамі

Давай з табой сядзем і пагаворым. Ты што, спаць збіраешся ці хворы? Тады заставайся ў цёплым ложку. А калі ты здаровы і ты здаровая, то давайце сядзем на пашчапаныя бярвенні, ля прызбы, на лаўкі, а каму зручна — той і проста на падлозе.

І ўявім мы, што памчалі мы на нашым дыване-самалёце ў вясёлкавы наш з табою край, у сівую нашу з табой даўніну.

Ці бачылі вы паўночныя нашы ўзгоркі? Яны не дужа высокія, але ўсё ж верас на іх на некалькі дзён робіцца сівы. Ад падмарозкаў.

І сівыя робяцца старадаўнія валуны, камяніскі, камні, каменьчыкі. А пасля пачынаюць пакрывацца шкляным, ружовым на ўсходзе лядком — за берагам, шматлікія нашы з табой азёры. А выкапаную бульбу даўно ўжо звезлі ў хаты і свірны, звалілі ў капцы.

Дык вось было гэта даўно, вельмі даўно, так даўно, што ў нашай з табой краіне яшчэ не было тады бульбы.

Стаялі тады на беразе маленькага чыстага возера — існае вочка зямлі — дзве хаты. У адной, багатай ды ганарлівай, жыў мужык Ігнат. Нядобры ён быў чалавек, жонку замарыў работай, дзеці ад хатняга рабства ў свет пайшлі. А гаспадар усё не ўтаймоўваецца, усё пад сябе грабе. Усё наваколле прыдушыў, глытай.

— Забыўся, што ў труны кішэняў няма, — горка пажартавала добрая Мар'я, бліжэйшая суседка. Бо яе хата бліжэй за ўсіх стаяла. Хата яшчэ з дзядоў, моцная, але зусім недагледжаная. Бо гаспадара ўзялі на вайну і засталася жанчына адна з маленькімі дзецьмі. Аж пяцёра, і кожнае на пстрычку ніжэй за другое. І кожнае ўвесь час галоднае.

Пакуль бацька быў, сяк-так перабіваліся, а тут...

Словам, запанаваў на нашай зямлі самы страшны, самы подлы

грэх, імя якому **Несправядлівасць.** Гэта калі адзін не можа заснуць, бо аб'еўся, а другі — бо галодны. А дзеці — дык тыя нават плачуць з голаду. Кепска. Ніколі не дапамагай **Несправядлівасці**. За іншае, можа, і даруюць. За гэтае — не.

...Позняя, халодная была вясна. Такое самае лета. А восень яшчэ горай. Завылі вятры, уздзьмуліся рэкі, пашалелі азёры. Сатлелі травы на паплавах. Ад бацькі чуткі няма. Прыйшла чарга Мар'і ісці па дапамогу да суседа. А той сядзіць, далоні пад азадак паклаў ды пыхкае, як вожык. Нажэрся свіння-свіннёю.

— Ну што?

— Пазыч мне, суседзе, меру ячменю ды меру фасолі. Я табе за гэта вясной адраблю.

— Адро-обе. Вясно-ою. Вясной усё наваколле адрабляць прыйдзе. А ты да таго часу ледзь ногі цягаць будзеш, а шчанюкі твае, можа, і не пацягнуць зусім. А можа, ты і ўдава цяпер. То й ён не адробіць. Не дам.

Рабіць няма чаго. Прыйшла бедная жанчына ў сваю халупу і, не запаліўшы нават лучынкі, упала на ўслон.

Цёмна. Цёмна за акном. Цёмна. Нізкія чорныя хмары, і выхаду няма.

Да іншых суседзяў бегчы? Памаглі б, але і там тое самае. А дзецям што? Дзеці не ведаюць, як дарослым хлеб дастаецца. Цяжкай працай, часам — прыніжэннем. Калі зразумеюць — пашкадуюць. А тут плачуць толькі на розныя галасы: «Сільна і слёзна», як у старых кнігах пісалі:

— Матухна!

— Зязюленька!

— Пакармі нас!

— Хлебца дай!

— Акраец!

Што рабіць беднай Мар'і. Вырашыла яна дзяцей падмануць.

— Вы ляжце зараз. Засніце. А я пайду бабоў назбіраю. Навару ды буду вас карміць.

Дзеці не засынаюць. Тады пайшла кабета, назбірала на полі дробных каменьчыкаў (а іх было сапраўды як бобу), высыпала ў кацёл і паставіла на агонь. Настолькі бедная была хата, што і печкі няма.

Варацца каменьчыкі. Паснулі дзеці. Супакоіліся. Разбудзіць матка — наядуцца. Варацца каменьчыкі — да канца свету ім варыцца. Да канца свету плакаць матцы.

Ажно ўваходзіць у хату нейкі чалавек. Сам доўгі, кашчавы, з кіем, торбай, адкуль нейкія травы тырчаць. І вочы пранізлівыя:

— Добры вечар у хату. Пусціце абагрэцца.

— Грэйся, добры чалавек. Толькі пачаставаць цябе няма чым.

— А што ж у катле варыш?

— Гэта, добры чалавек, каб дзяцей прысыпіць да заўтра, — і прыўзняла крышку катла.

— Гэт-та што такое?

— Камні. Муж у войску — можа, й забілі. Прасіла ў суседа чагосьці —

не даў. Толькі й засталося на гэтай зямлі беднаму чалавеку каменьчыкі есці.

— Што ж ён?! Дзецям не даў?! Проста дзецям?!

— Не даў.

— Д-добра, — сказаў незнаёмы. — Бяры кацёл. Пайшлі.

Прыйшлі на надзел. Незнаёмы паставіў кацёл, азірнуўся: ля хаты Ігнат стаіць. Цікуе. А што гэта яны там робяць? Чаго кацёл прынеслі?

А незнаёмы той быў Вялікі Чараўнік. Толькі чараваць яму ў жыцці дадзена было тысячу разоў і засталіся лічаныя разы. І нічога ён тым сваім чараўніцтвам не дабіўся. Як дагэтуль ішло, так і пасля.

«Але тут, — думае, — здужаю».

Узяў ён з катла жменю каменьчыкаў і са свістам, як з сявенькі, сыпануў па раллі. І яшчэ, і яшчэ, і яшчэ.

— Што ж ты, — паскардзілася Мар'я. — Так загон благі, а ты яшчэ й каменьчыкамі, што сабрала, падсяваеш.

— Маўчы, — сказаў той. — Глядзі, што будзе.

— Так ёй, — сказаў Ігнат. — Таксама мне, дзеці. Ва ўсіх дзеці. Муж на вайне. Гм, таксама мне, страшная штука вайна.

А незнаёмы сыпе і сыпе. Увесь загон каменьчыкамі засеяў. Россып. Дзецца няма дзе.

Мар'я плача. Ігнат смяецца. Балаган на кірмашы, і толькі.

— Глядзі, жанчына, — сказаў незнаёмы.

Тая зірнула — і вачам не паверыла: растуць каменьчыкі. Вунь ужо камяні сталі. Памерам з два кулакі.

— Збяры частку, пакладзі ў кацёл, — сказаў незнаёмы. — Пастаў варыць дзецям.

У Ігната вочы на лоб палезлі. А жанчына панесла кацёл з камянямі ў хату. Прыйшла — камяні яшчэ падраслі.

— Глядзі, жанчына, за адзін дзень я табе ўсё пакажу. Заўтра будзеш капаць. А ва ўсе наступныя

разы будзе гэта цягнуцца цэлае лета. Глядзі.

І тут камяні пачалі зарывацца ў зямлю. Як ружовыя, жоўтыя і белыя парсючкі. Ігнат аж счумеў. Вачыма толькі водзіць, нібы ў чужы гарох залез, а яго, злодзея, заспелі.

Пачакалі яны крыху — з'явіліся з зямлі парасткі, гусцець пачалі.

— Прынясі, кабета, матыку, — сказаў незнаёмы.

Тая прынесла. Расточкі ўжо ў кусцікі ператварыліся.

— Пацяпай вось так. Загарні ім ножкі ў кажушок... І яшчэ раз загарні.

А кусцікі ўжо амаль кусты.

І вось ужо на кустах заззяла мора кветак. Белыя, ружовыя, ліламатыя, ружова-белыя зорачкі. І ўсе з жоўтым сэрцайкам.

— Вось цяпер можаш яе памацаць на выбар, — сказаў незнаёмы. — Гэта як дзеці галодныя.

І выняў два камяні з-пад куста.

Пасля засумавалі кусты, пабляк-

ла іх лакіравана-шурпатая, зялёная зверху і матавая спадыспаду паверхня, пасохла гікаўё.

— Ну вось, заўтра будзеш капаць. На ўсю зіму хопіць, — сказаў незнаёмы. — І з суседзямі падзяліся.

— Ясна, — сказала Мар'я, бо ўжо далятаў з хаты сыты, некаменны дух. — З суседзямі найперш.

— Мне! Мне! — кінуўся Ігнат. — Мне перш за ўсё! Мне! Я іх кармлюпаю!

— І на работу наймаеш? — спытаў незнаёмы. Выняў адзін камень, і той закурэў у ягоных руках, а чалавек разламаў яго, пасаліў і стаў есці. — І не адмовіў ім у ежы, калі галадалі?

— Мне! Мне! Наймаю, кармлю.

— Добра, — сказаў незнаёмы. — Набяры мне кацёл каменьчыкаў са свайго поля. Ды хутчэй.

Ігнат чуйдух прыляцеў з катлом. Самых буйных, з кулак, камянёў нацягаў.

— Во! Во! У мяне ж і каменьчыкі.

Во ў мяне, дык камні з кулак. А гэтыя ж лайдакі, хіба ў іх камні. Слёзы, а не камні.

— Слёзы, — сказаў незнаёмы. — Дык хочаш, каб у цябе яшчэ больш стала? Усё ж ёсць. Што даў — такі і плод.

— Мне! Мне! У мяне і камні.

— Глядзі-і, — сказаў незнаёмы і сыпануў камяні па Ігнатавым полі. І яшчэ. Засеяў усё поле.

— Ну вось. Даў сёння хлеба яе дзецям?

— А што? Галадранцы. Самога з'ядуць, як мяккі будзеш.

Незнаёмы махнуў рукой.

Камні пачалі расці. Усе трох стаялі і глядзелі, як яны растуць: каменьчыкі — камні — камяні — камяніскі. Усё поле закрылі — Ігнат аж падскокваў.

— Ну чакайце, за такімі вы яшчэ й да мяне ўсе прыбяжыце. Прыйдзеце, любенькія, як прыпрэ.

Паглядзеў на яго незнаёмы, плюнуў.

— Ну вось, маеш, — сказаў.

— А чаму яны не зарываюцца?

— А таму, што вечна ім заставацца на вачах у людзей, як кожнаму скнарству, як кожнай жорсткасці, як кожнай нелюбові да людзей, як кожнай Несправядлівасці.

І пайшоў з жанчынай да яе хаты.

Кінуўся шчаслівы гаспадар да поля — не поле, а суцэльная каменная крушня. Валуны велічынёю з хату. На тысячу год наперад з зямлі вылезлі.

Пакуль дзеці, незнаёмы і жанчына елі ў хаце «камяні» — усё навакольле чула з-за каменнага мура дзікі рык і выццё. Выў і рыкаў Ігнат.

А пасля незнаёмы ўстаў.

— Пайду, — сказаў ён, закінуўшы за плечы торбу.

— Чым мне табе аддзякаваць?

— Нічым. Дабрынёю да людзей. Ды гэтага дабра ў цябе заўжды хапала.

— Пайду пагляджу, як сусед. Звар'яцеў, пэўна.

— Нічога. Я ж кажу... дабра ў нас хапала. Залішне.

І пайшоў у свет, абапіраючыся на кій. Пад касыя асеннія хмары. Насустрач пералётам, што, калючыя, каціліся яму пад ногі. Ужо зводдаль азірнуўся — Мар'я і дзеці глядзелі яму ўслед, маленькія на чорнай раллі.

— Гэй! А імя ёй будзе — Бульба! — крыкнуў ім незнаёмы. І так з'явілася на Беларусі бульба.

**Просім у хату, госцейкі нашы!**

Але зойдзем у хату, якой яна была яшчэ не так даўно, а часам сустракаецца і зараз. Спачатку трапляем у сенцы. Яны і зараз служаць для гаспадарчых мэт. Тут вёдры, цэбры з рознай рознасцю, маслабойкі (цяпер часта сепаратар) і г. д. Дзверы насупраць вядуць у камору, дзе таксама рэчы для гаспадаркі і на паліцах розныя прыпасы. Другія дзверы вядуць у халодныя пакоі. Іх адзін ці два. Раней гаспадыня ўлетку выносіла сюды кросны, ткацкі ста-

нок, бо ў самой хаце горача. Тут жа ўлетку спалі старэйшыя (для маладых служыла і служыць адрына з сенам). Тут узімку ляжаць на аўсянай саломе яблыкі, рассыпаныя тоўстым пластам жалуды для свіней, іншыя прыпасы. Раней зрэдку, а цяпер досыць часта ў халоднай палове ёсць і грубка, так што пры выпадку (наезд гасцей ці яшчэ нешта) можна размясціць процьму людзей. У мінулым стагоддзі, калі шафаў, вядома, не было, а ў куфры (скрыні) не ўсё змяшчалася, тут стаялі і «кублы» з лішнім адзеннем і іншым дабром.

У некаторых хатах да халоднай паловы была прыбудова, у якой спалі ў зусім нясцерпную спёку тыя, хто не хацеў ісці проста ў садок, пад дрэвы. Часам яе можна ўбачыць і зараз. Я аглядаў некалькі такіх, і «абстаноўка» іх заўсёды была аднолькавая: нізкая, дужа шырокая і доўгая, «скрыня» на ножках, у ёй сяннік, набіты сенам, мякенькай аўсянай саломай ці гарахавіннем,

радно, падушкі і полаг. Абавязкова. Ад камароў. Зроблены з радзіны, падобнай на марлю.

Вернемся ў сенцы. Ага, мы забылі яшчэ вось што. Лесвіцу, «драбіны», або проста бервяно з засечкамі, якое вядзе на гару, дзе вісяць шынкі і летнія каўбасы (зімнія каўбасы, залітыя салам, і само сала — у дзежках і гарлачах, у сенцах ці ў каморы).

Цяпер — у хату. Выгляд яе для кожнай мясцовасці быў розны. У даўніну бывалі хаты з комінам (цяпер комінам завецца пячны дымаход), плеценым і абмазаным глінаю конусам, пад якім на жароўні ці ў свечніку гарэла лучына, а дым ішоў комінам праз столь і страху. Бывалі хаты з вялізным, таксама абмазаным, каўпаком ля ачага, дзе ў зімнія ночы (там было цяплей) збіралася прасці і майстраваць уся сям'я. Ды і ў розных мясцовасцях хаты былі розныя. На два пакоі (трысцен і ўласна хата), на два пакоі з прыбудовамі і г. д. Але найбольш

тыповы выгляд быў такі. З трысцена, дзе елі летам і, хто хацеў, спалі зімой, і куды ўзімку бралі маладняк быдла, быў уваход у хату. Ля ўвахода, справа, мыцельнік, месца для мыцця посуду і кухонных рэчаў. Пасля печ. За печчу, па правай сцяне пол (нары). Пад полам складалі розныя рэчы. Але ўжо тады замест пола часта стаялі шырокія ложкі, адзін з завескаю, для гаспадара. Уздоўж астатніх дзвюх сцен ішлі шырокія лавы, часам з тканымі налаўнікамі. На іх сядзелі і ноччу маглі спаць, асабліва калі бывалі госці...

Перад лаўкамі — стол. Заўсёды дужа белы, бо яго часта скрэблі нажом. Стол і лаўкі часцей за ўсё былі з тоўстых дубовых дошак. Ля той сценкі, дзе дзверы, стаялі куфры і — узімку — гаспадыніны кросны.

З упрыгожанняў былі — абразы на покуце. Бывалі сярод іх і лубачныя, але здараліся й дужа цікавыя. Ці старажытныя, ці наіўныя, уніяцкіх

яшчэ часоў, дзе святыя былі ў беларускіх народных вопратках. Асаблівым поспехам карыстаўся святы Юры, які забівае дракона, і святы Мікола за сваё сялянскае паходжанне і за тое, што (па беларускай легендзе) аднойчы ўратаваў адзіную кабылку беднага мужыка, якая заблукала ў лесе. Не даў раздзерці ваўкам і памог ажарабіцца, а пасля прывёў гаспадару. Згодна павер'ю, калі жарабятка падрасце, то на ім паедзе той, хто дасць волю народу.

І яшчэ адно ўпрыгожанне — тканыя посцілкі (у шашачкі, у шэсць, дванаццаць і дваццаць чатыры «ніты», чынаватыя і інш.).

І, вядома ж, ручнікі. Мноства. Раней вакол абразоў і акон. Цяпер каля карцін і партрэтаў. Ручнікі ў нас на Беларусі таксама розныя, па мясцовасці, і дужа разнастайныя. Узоры іншыя, чым у суседзяў, хаця ёсць і падобныя. Галоўная розніца — менш «раслін і кветак». Арнамент часцей геаметрычны. Ме-

ней чорнага колеру. Пераважае «вясёлка», жоўты, чырвоны, сіні, блакітны і іншыя такія колеры.

Ну вось. А цяпер паколькі я кепскаваты танцор, то пайду танцаваць ад печы. Печ — гэта цеплыня. Печ — гэта здароўе застуджанаму. Печ — гэта і гарачая, смачная ежа. На поўначы печ дужа вялікая і простая, хіба што з «пячуркамі» для запалак і лучыны на распал. Затое на поўдні яна меншая і часам нагадвае архітэктурную спаруду. Дзясяткі выступаў і ніш, у якіх гліняныя збанкі, ліверы (пасудзінка з дзвюма дзірачкамі, «цякло, бы з лівера, з вачэй»). Тут ёсць дзе ўстанавіць спарыш (два гаршкі, злучаныя ручкай, каб насіць на поле абед), паставіць і «ўдаву» — гаршчок, падобны на абаранак. Печ уся распісана кветкамі, дзяўчаткамі з карамысламі і коннікамі — улюбёны матыў. Зараз у наш час печ выцясняецца плітамі і плітамі газавымі, але пакуль ёсць у многіх хатах.

Дзе печ, там і тое, што з печы.

## АРТУР ВОЛЬСКІ

### Беларусь

То ялінкі,
То сасонкі
Падпіраюць небакрай...
Прыгажэйшае старонкі
Не знайсці, як ні шукай.
Скачуць сонейка асколкі
Пасля дожджыку ў вадзе.
Весялейшае вясёлкі
Не пабачыш анідзе.
Пахне збожжа свежым хлебам,
Сыпле золата жніво,
Жаўрукі звіняць пад небам —
Славяць свету хараство.
На бярозе — белы бусел,
Пад бярозаю — ручай.
А завецца БЕЛАРУССЮ
Непаўторны родны край.

## ЕЎДАКІЯ ЛОСЬ

### Продкі

Мая Радзіма —
Жытні колас,
Сінь мурагу, язміну цвет.
Яна —

Пілы гарачы голас,
Калёс цяжкіх глыбокі след...
Мая Радзіма —
Дзе з-за бору
Ўзыходзіць месяц уначы,
Дзе ў братнім ладзе, у дружным
зборы
Жылі калісьці крывічы...
Валілі лес, аралі ляды,
Сушылі гуртам нераты
І да туманных даляглядаў
Ганялі спраўныя плыты.
Дзяцей бацькі вучылі строга
Любіць саху, пчалу, зямлю
І аднаму маліцца богу —
Нялёгкай працы мазалю.
Рабілі зрубы залатыя,
Нарогі, гонкія чаўны
І сцены белыя Сафіі
Над плынню быстраю Дзвіны.
Умеў мой продак човен ладзіць,
Паліць ікластыя карчы,
Таму, хто ў роспачы, —
дарадзіць,
Таму, хто ў горы, —
памагчы...

**Слоўнік:** *мурог* — мурава, зялёная трава; *ляда* — дзялянка высечанага лесу; *нерат* — сетка для лоўлі рыбы; *нарог* — частка плуга, якая падразае зямлю знізу; *ікласты* — клыкасты.

## ПРЫКАЗКІ

Зямелька — матка наша: і накорміць, і напоіць, і адзене.

Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка.

Родная зямля мякчэй, як чужая пярына.

У чужой старонцы не так свеціць і сонца.

Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднае крыніцы.

## Тэматыка чытання:
# НА НІЦЯХ БЕЛАЙ ПАВУЦІНЫ ПРЫНОСЯЦЬ ВОСЕНЬ ПАВУЧКІ...

*— Ой, восень мая,*
*Восень студзёная,*
*Чаго ты рана захаладала?*
*— Я й не ранецька,*
*Я й не позненька,—*
*Калі мая пара прыйшла:*
*Лісточак апаў, зямельку услаў,*
*Вось мая і пара прыйшла.*
*Рэчкі сталі, пазамярзалі —*
*Вось мая й другая пара.*

Беларуская народная песня

## ПЯТРУСЬ БРОЎКА

### Надыход восені

Вось і лета сышло,
Адспявалі калоссі,
Цяжка нам заўважаць,
Як з'яўляецца восень.

Непрыкметна зусім —
Прыплыве павуцінкай,
Гляне жоўтым лістком
З-пад зялёнай хусцінкі.

Усплыве туманом
Над рачулкаю соннай,
Устрывожыць дымком
З пахам бульбы пячонай.

Зачаруе агнём
Маладзенькай рабіны,
На адлёце крылом
Памахае бусліным.

А пасля,
А пасля
Ліст апошні сарвецца...
Ды не знаю, чаму
Ты мне, восень, па сэрцу.

## ВІТАЛЬ ВОЛЬСКІ

### Верасень

Верасень лічыцца па календары першым месяцам восені.

Сады і лясы змяняюць паступова сваю летнюю зялёную вопратку на асенняе ўбранне. Лісце на дрэвах пачынае жаўцець, набываючы розныя колеры і адценні. Сярод цёмных вечназялёных лапак ялін і сосен зіхацiць залатое лісце бяроз, ліп, клёнаў, вольхі.

У садах паспелі яблыкі, грушы.

У высокім сінім небе не чуваць ужо над полем звонкага спеву жаваранка. Не відаць у садах ні берасцянкі, ні чыжыка, ні шпакоў. Даўно ўжо няма салаўя. Па каменнях каля рэчкі не скачуць жвавыя пліскі. Усе гэтыя птушкі паляцелі на поўдзень, і мы іх не ўбачым да наступнай вясны.

Вада ў рэчках і азёрах празрыстая і халодная.

Мянтуз пакідае сваё летняе сховішча пад берагам і пачынае жыраваць у мелкай вадзе.

Плоткі, акуні, галаўні, язі і іншыя рыбы збіраюцца ў чароды і шукаюць глыбейшых мясцін.

Толькі шчупак па-ранейшаму палюе ў адзіноцтве, але і ён ідзе ў глыб вадаёмаў.

У пачатку восені рыбы ў рэках і азёрах харчуюцца асабліва ўзмоцнена. Яны назапашваюць тлушч, які дапаможа ім перажыць зіму ў халоднай вадзе пад лёдам. З надыходам

халадоў рыбы становяцца ўсё менш рухавымі і паваротлівымі.

Пакінулі свае дазорныя вышкі канюкі, пільныя абаронцы палёў ад шкодных мышэй-палёвак.

На апусцелых нівах палёўкам няма чаго рабіць. Яны перабіраюцца бліжэй да чалавека і да збожжа — у гумны, хлявы, скляпы і стайні. Следам за палёўкамі перасяляюцца сюды на зіму і ласкі. Ад маленькай і спрытнай ласкі палёўкам цяжка схавацца. Маючы доўгае гнуткае тулава на кароткіх ножках, ласка можа пралезці за мышамі ў самую вузкую шчылінку, у самую цесную норку.

Палёўкі застаюцца на зіму ў полі толькі ў тым выпадку, калі яны здолелі на працягу лета назапасіць у норках пад зямлёй дастатковую колькасць збожжа і насення розных раслін.

Перабіраюцца палёўкі і ў лес, калі там хапае арэхаў і жалудоў. Тут іх ловяць лісіцы і барсукі.

Восенню барсукі наведваюць часам агароды, дзе любяць пажывіцца морквай і буракамі.

Адкарміўшыся за лета, яны ў верасні пачынаюць рыхтавацца да халоднай зімы.

Барсукі прыводзяць у парадак нару, выкідваюць з яе living рознае смецце, высцілаюць сваё логава лісцем і сухой травой, затыкаюць мохам усе выхады з нары, каб было цяплей. Адначасова яны робяць і харчовыя запасы, якімі жывяцца позняй восенню, калі не выходзяць з нары па некалькі дзён. З надыходам халадоў, звычайна ў сярэдзіне лістапада, тлустыя і лянівыя барсукі засынаюць у сваіх логавах, таксама як і мядзведзі ў бярлогах.

Чародамі збіраюцца на балотах у верасні дзікія качкі і жыруюць, рыхтуючыся да выраю.

Маладыя жоравы таксама збіраюцца разам з бацькамі ў вялікае падарожжа. Яны вучацца лятаць строем, трыкутнікам і, пакінуўшы

роднае балота, дзе нарадзіліся і выраслі, робяць для практыкі пробныя палёты над ваколіцай.

Харчуюцца жоравы цяпер не толькі на балотах, дзе яны ядуць розных чарвякоў, лічынак, жабак і карэнне балотных раслін, але і на палях. У канцы лета і ў пачатку восені яны трымаюцца бліжэй да палеткаў, куды прылятаюць харчавацца на золку. Асабліва любяць яны гарох.

Адлятаюць жоравы ад нас у кастрычніку. Гучным крыкам, нібы баявымі трубамі, абвяшчаюць яны ўсяму свету аб тым, што пачынаюць свой вялікі пералёт у цёплыя краі на зімоўку. Адзін за адным, у стройным парадку, узнімаюцца ў паветра і адразу набіраюць вышыню трыкутнікі жораваў. На чале кожнага кліна ляціць стары вопытны павадыр. Ляцяць яны высока над зямлёй. Першы вялікі прыпынак жоравы робяць у вусці Дуная. Так далятаюць яны да Егіпта.

На чужыне, у час зімоўкі, жоравы трымаюцца разам, вандруючы ўздоўж рэк. Яны дабіраюцца ўверх па Ніле аж да вытокаў яго ў Судане і Эфіопіі. Потым ляцяць назад і з надыходам вясны вяртаюцца на радзіму.

Набліжаючыся да родных мясцін, жоравы разбіваюцца на асобныя групы, а далей — на пары і гняздзяцца на балоце, дзе нарадзіліся, на купінах, каб можна было з вышыні свайго гнязда аглядаць ваколіцы...

У верасні ночы становяцца халоднымі. Раніцай на траве, на лістах хмызняку зіхацяць буйныя кроплі халоднай і чыстай расы. Над балотамі, над паплавамі сцелецца густы туман.

## СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ

### Журавы

Як пачулі журавы
Шум асенні баравы,
Паляцелі на імшары,
Пазбіраліся па пары,

Сталі дружна ў карагод,
Цешаць танцамі народ.
— Гэй, цыбатыя танцоры,
Вам ляцець у вырай скора!
Не таміце лёгкіх ног,
Не тапчыце мох, быльнёг.
Не тапчыце, журавы,
На балоце журавін.

### ЯКУБ КОЛАС

## Восень

Пуста ў лузе. Толькі стогі
Парыжэўшыя стаяць,
Ды гракі каля дарогі
Цэлы дзень адно крычаць.
Грэчка зжата. Гола ў полі:
Жыта звезена даўно.
Толькі плаваюць на волі
Кучы хмар, як валакно.
Дожджык сее беспрастанку;
Вецер свішча, так, як звер...
Колькі лужын каля ганку!
А гразі... гразі цяпер!..
Ссохлі травы. Ўсё павяла;
Слоць, плюхота, холад, цьма...
Эх, скарэй бы закрывала
Зямлю чорную зіма!

## Тэматыка чытання:
# З РОГА ЎСЯГО МНОГА...

*Хочаш знаць усё і ўсіх —*
*Сябрам будзь цікавых кніг.*

А. Александровіч

## ВАСІЛЬ ВІТКА

### Вавёрчына гора

(Казка)

Пра Веру-Вавёрачку,
Пра яе гора-горачка,
Пра яе маленькіх дочак,
Пра вавёрчын малаточак,
Пра птушынага пасла —
Даўганосага Бусла,
Пра жыццё-быццё лясное
І яшчэ пра тое-сёе.

Забалелі ў Вавёрачкі зубкі —
Не можа раскусіць арэхавай
шкарлупкі.
Плача Вера-Вавёрачка:
— Ой, гора маё,
Горачка... —
Сабралася ўся вавёрчына радня.
Думаюць, гадаюць усю ноч да дня:

Як тут быць,
Што рабіць?
Прыкладаюць дочкі
Мамачцы прымочкі,
Грэюць унучкі
Бабульцы анучкі.
Яшчэ болей баляць вавёрчыны
зубкі —
Не можа крануць арэхавай
шкарлупкі.
Вестку паслалі старэйшаму сыну,
Той адразу ўсе справы пакінуў
І праведаць хворую маці прыехаў,
І прывёз поўны мех ёй арэхаў.
Ён не знаў, што баляць у Вавёрачкі
зубкі,
Што не можа крануць яна імі
шкарлупкі.
Госцю маці гаворыць:
— Сыночак,
Ты прывёз бы мне малаточак.
Не трудзіла б я зубкі,
Не верадзіла,
Малатком бы шкарлупкі
Біла.
— Што ж, — кажа сын, —

У маёй старане
Ёсць каваль — лепшы мой друг,
Ён можа скаваць для мяне,
Што я захачу, — нават плуг.
— Мне плуг не патрэбен,
сыночак,
Хай зробіць ён мне малаточак.
— Мама, —
Гаворыць ёй сын у адказ, —
Я дам тэлеграму.
Ён зробіць ураз. —
Сарваў сынок
Дубовы лісток —
Тэлеграма гатова:
«Я жывы і здаровы.
Толькі баляць у мамачкі зубкі —
Не можа кусаць арэхавай
шкарлупкі.
Прашу, дружок,
Зрабі малаток».

Сказалі сёстры брату:
— Навошта
Табе самому хадзіць
На пошту?
Мы самі знаем, дзе стары граб.

Даўно мы хацелі
Збегаць на тэле...
Даўно мы хацелі
На тэле-
Граф.

— Ну, што ж, імчыце, —
Сказаў браток, —
Занясіце лісток,
Вазьміце квіток.
— Нясіце, — сказала мама, —
Каб сёння ж
Дайшла тэлеграма.
Няхай сам начальнік на бланку
Паставіць пячатку,
Што гэта «маланка»...

Імчацца шустрыя сёстры,
Мільгаюць дрэвы
І вёрсты.
Прымчаліся
Ў самы гушчар.
Што тут такое?
Пажар!

Усё у агні — і лісцё і галіны,
Але здагадаліся сёстры,
Што гэта

Прыбеглі
На самы разгар лета,
І палаюць агнём
Не галіны,
А спеюць
Чырвоныя арабіны.

Імчацца далей сёстры няспынна,
Мінаюць гушчар
І пажар арабінны.
І вось перад імі
Новая пацеха:
Дрэва,
А на дрэве — арэхаў, арэхаў!
А спеленеча-ча-ча-чкія,
А жоўценеча-ча-ча-чкія,
А поўненеча-ча-ча-чкія,
А на вяршэча-ча-ча-чку, —
Шкада,
Не ўзялі з сабою
Мяшэчачка.

І тут яны ўспомнілі,
Што баляць у матулі зубкі,
Што не можа яна раскусіць
арэхавай
Шкарлупкі.

Хутчэй жа,
Хутчэй,
Хутчэй туды,
Туды,
Дзе растуць
Старыя дубы!

Лістамі сцежку
Сцеле
Граб,
Прыбеглі сёстры
На тэле-
Граф.
Шматпавярховы дом —
Высознае дрэва
З акном-дуплом,
Уваход налева.
Калі ўмееш — чытай сам,
Што напісана над аконцам:
«Прыём тэлеграм
Да захаду сонца».

Ваверкі ў дупло
Лапкамі: стук-стук,
А ім у адказ:
— Хто тут?
Хто тут?

Не лезьце ў дупло —
Ужо сонца зайшло!

Сталі сёстры прасіць:
— Дзядзюхна начальнік,
Тэлеграму трэ адбіць,
Гэтак мы імчалі,
Гэтак беглі
Праз гушчар,
Праз агонь,
Праз пажар...
Хворая ў нас маці,
Дзядзюхна Дзяцел...

Падабрэў начальнік,
Непрыступны маўчальнік,
Акуляры надзеў,
На лісток паглядзеў.
— Добра, — кажа, — пашлю
Заўтра ўранку кавалю.

— Як гэта заўтра ўранку?
Нам загадала мама,
Каб вы паслалі з Маланкай
Нашу тэлеграму.

— З Маланкай? —
здзівіўся Дзяцел. —
А дзе ж яе ўзяці?

Не працуе бесперастанку
У мяне на пасылках Маланка.
Бывае
І яна выхадная.
— Хай тады кавалю на дом
Заімчыць тэлеграму Гром.

— Гром? — усміхнуўся
начальнік. —
Гром?
Ён толькі з работы
І спіць
Непрабудным сном.

— Хто ж перадасць тэлеграму,
Хто ж?
— Дождж, — сказаў ім
начальнік, —
Дождж!

І застукаў
Начальнік,
Непрыступны
Маўчальнік,
Дзюбаю: тук-тук,
Тоўстаю: ток-ток —
І з лістка
На лісток

Пацёк
Ручаёк...

Бягуць вавёркі дадому
І чуюць,
Як іх тэлеграму
Кроплі друкуюць:
«Тук-ток,
Кавалёк,
Прышлі маме
Малаток.
Разбалеліся ў мамачкі зубкі,
Не можа раскусіць
арэхавай шкарлупкі».

Паплыў паток,
Пагнаў лісток,
Панёс удаль,
Дзе жыве каваль —
Стары Воран,
Як вугаль, чоран.
Прыйшла тэлеграма якраз у час,
Кавалю не дае спакою заказ.
Сон яго не бярэ,
Яда не лезе:
Як зрабіць малаток —
Няма жалеза.

— Знайсці жалеза я бяруся, —
Сказаў кавалю даўганосы Бусел.
Ён абуў чырвоныя боты
І палез
У балота.

А праз гадзіну ўжо Бусел
Вярнуўся:
— Так і так.
Ляжыць у канаве «тыгра» —
Нямецкі танк.

Пайшоў каваль
З прыладамі, —
Чоран Воран, —
Паставіў кавадла,
Распаліў горан,
Скінуў кажух,
Надзеў хвартух,
Узяў абцугі,
Прайшоў раз-другі.
Жалеза не відаць —
Гара іржы.
— З чаго мне каваць
Малаток —
Скажы?

Падумаў Бусел:
«Прыйдзецца, мусіць,
Самых дужых звяроў склікаць,
Каб забітага «тыгра»
Па костачках разабраць».

Прыйшоў мядзведзь,
Злуецца, равець,
Прыйшоў воўк —
Зубамі шчоўк, шчоўк,
Прыйшоў бабёр —
Хвастом пацёр.
Доўга так раўлі і вылі
І нічога
Не зрабілі.

Беглі ў гэты самы час
Маленькія зайкі,
Узяліся і — ураз
Развінцілі гайкі.

Тады гусі і сініцы
Знялі вежу,
Гусеніцы.
Наскублі яны сяк-так
З паганага «тыгра» шэрсці шматок.

Вось табе і хвалёны танк —
Ледзь хапіла вавёрцы
На малаток.
Добра сказаць —
Заказ гатовы,
А як паслаць
Яго ў бор сасновы?

Другі дзень Вавёрка малатка
чакае,
Можа, яна, бедная, з голаду канае.
Гэтак моцна баляць у Вавёрачкі
зубкі,
Што не можа крануць арэхавай
шкарлупкі.
Апусціліся галовы ніц
І ў зайцоў
І ў сініц,
Сядзяць у скрусе
Бусел
І гусі.
Стаў ад гора
Воран
Яшчэ болей
Чоран.

Паўзе Крот,
Зямлі повен рот:
— Ду-ду-ду, ду-ду-ду,
Я вашу бяду
Адной лапай
Развяду.
Сталі ўсе яго прасіць:
— Краточак,
Крот,
Браточак
Фядот,
Ты можаш зрабіць
Самалёт?

— Угу.
Я магу.

— Нам трэба, браточак,
Паслаць малаточак...

— Добра, — кажа ім Крот, —
Я зраблю самалёт.
Скідай, каваль,
Свой чорны хвартух,
Прынясі мне
Шырокі лапух,
А вы, зайкі, травы нарвіце,

Вяровачкі звіце,
Малаток
У вузялок
Завяжыце.
А цяпер, —
Кажа Крот, —
Я буду галоўны пілот.
Мяне вы прасілі.
Падымай, Бусел, крыллі,
Бяры ў дзюбу лапух —
Павязём малаток мы
Удвух:
Верхам сяду ў цябе я на шыі,
Паляцім мы пад хмары густыя,
Будзеш ты
Крыламі махаць,
А я
Буду табой кіраваць.

— Дзякуй, — Бусел яму у адказ. —
Гэта раз.
Памагла нам твая галава, —
Гэта два.
Ну, а болей не гавары, —
Гэта тры.
Памагатых такіх мне
Не трэба.

Калі ж хочаш
Пабачыць ты неба
І зайздросціш адно нам,
Буслам, —
Паспрабуй
Узніміся
Сам!

Цвёрдае слова —
Слова буслова.
Ўзяў лапух у дзюбу ён.
Варухнуў крыламі —
І ляціць наш паштальён
Лугамі,
Лясамі.
А куды ён ляціць —
Можа, боты шыць,
Можа, ніткі віць? —
Адкажыце
Самі.

Ну, вядома,
Ляціць да Вавёркі-галубкі,
Вельмі ж моцна баляць яе
зубачкі-зубкі.
Ён нясе ёй вузялок,
Там завязан малаток,

Каб Вавёрка зубоў не трудзіла,
Каб арэхі малаточкам біла...

У вавёрчынай жа хаце
Поўна шуму, весялосці,
Перадаў ім вестку Дзяцел,
Што ляціць сам Бусел ў госці.

Вось унучкі
Сталы засцілаюць,
А дачушкі
Пачостку стаўляюць,
Сын
Пясочкам ля самага дома
Высыпае пляцоўку
Аэрадрома,
Каб птушыны пасол мог спусціцца,
Паміж соснаў густых
Прызямліцца.
Гасця сустракаці
Выходзіць маці:
— Што на белым свеце чуваці —
На балоце,
На сенажаці?

— Ат, якія у нас навіны, —
Ёй адказвае Бусел, —

Вы ж самі ведаць павінны,
Што ўсе мы ў самоце і скрусе.
Як прыйшла тэлеграма, што
баляць у вас зубкі,
Не спалі мы цэлыя суткі,
Не зналі шчаслівай мінуткі.
Цяпер я спакойны
За ваш раток, —
Вось вам бранябойны
Малаток.

— Ай-яй-яй! — дзівяцца сёстры. —
Які ён цяжкі,
Які ён востры...
Мы хацелі другую адбіць
Тэлеграму,
Што даўно не баліць
Раток у мамы...
І няхай будзе сказана толькі між
намі —
Лепей грызці арэхі сваімі зубамі.
Мы хацелі,
Мы вельмі хацелі
Зноў збегаць
На тэле...
На тэле...

— Перастаньце! — на дочак
Прытупнула маці.—
Малаточак
Спатрэбіцца ў хаце...

Доўга ў іх ішла бяседа-
Гаворка.
Ўсе суседзі
Былі
У Ваверкі.
Стары Дзяцел
З сваім зяцем,
Тры сініцы-сястрыцы,
Цётка Ганулягля —
Шэрая зязюля,
Пяць зайцоў-малайцоў,
Удод-удавец —
Слаўны на дудзе ігрэц,
Два глухія глухары
Білі ў бубен
Да зары.

І я там быў
За тым сталом
І еў і піў
Разам з Буслом.

Што там было весялосці
І смеху,
Папаелі госці
Грыбоў і арэхаў.
Былі мёд і квас там,
Бульба, селядзец.
Хто праслухаў казку —
Той маладзец.

## СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ

### Жмуркі

Захацелі куркі
Пагуляць у жмуркі.
Раніцай за хатаю
Бегаюць стракатыя,
Чорныя і белыя,
Пудкія і смелыя.

Кажа Курка-рабка:
«Я ж усім вам бабка.
Не грабіце смецця,
Не лавіце мух.
Падыходзьце, дзеці,
І пастаньце ў круг.
Вунь яшчэ адна імчыцца.
Сталі ўсе?

Пачнём лічыцца:
Раз, два, тры, чатыры, пяць.
Каршуны не хочуць спаць,
Хочуць есці, хочуць піць,
Хочуць пеўніка ўхапіць,
Але курачка адна
Праглынула каршуна.
Раз, два, тры, чатыры, пяць.
А табе ісці шукаць».

Завязалі пеўню вочы
Шоўкавай травою,
Стала цёмна, як уночы,
Круціць галавою.
Ходзіць певень каля хаты
І ўздыхае горка:
Зніклі нават кураняты
Некуды з падворка.
Бегаў певень да змяркання,
І расла трывога,
Што не выканаў задання —
Не знайшоў нікога.
Слепнуць куры, як сцямнее,
Кожная гукае
І ніяк не зразумее,
Хто каго шукае.
Дзе куратнік — невядома,

Хто прыціснуў лапку...
І нарэшце ўсіх дадому
Пазбірала бабка.
Зноў яна старанна лічыць,
Бабка добрай ночы зычыць:
— Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Каршуны палеглі спаць.
Спіце, пеўнікі і куркі...
Заўтра ў што гуляць?
— У жмуркі!

## СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ

### Казка-быль пра рэпку

Бабку не прасілі,
Не прасілі дзедку,
Самі пасадзілі
Ў чыстым полі рэпку.

Ды на гэтым полі
Болей не бывалі,
Рэпку не палолі
І не палівалі.

Надыходзіць восень,
Як там з ураджаем?..
Гуртам бабку просім,
Дзеда запрашаем.

На пустым прагале,
Між хвашчу, асоту
Ураджай шукалі
Да сёмага поту.

Ураджай сабралі
У крысо паспешна.
Доўга рагаталі,
Хоць было не смешна.

Рагатала бабка,
Рагатала ўнучка,
Нават курка рабка
Сакатала гучна.

Сучка забрахала
Каля сваёй будкі.
Рэпы было мала,
Ўся была танюткай.

Смешна было мышцы,
Хвосцікам круціла,
Рэпка з вішню ў лыжцы,
Корань, нібы шыла!

Бабку не прасілі,
Не пазвалі дзедку,
Самі ж пасадзілі
Ў чыстым полі рэпку!

## ВАСІЛЬ ХОМЧАНКА

### Венікі

Пеця навязаў бярозавых венікаў на зіму, каб парыцца ў лазні, і павесіў іх пад страхой пуні.

«Хопіць нам на ўсю зіму», — цешыўся ён.

Прыйшла зіма, халодная і вельмі снежная, надзьмула высокія гурбы. Яблыні ў садзе па голле патанулі ў снезе. А каля пуні, дзе віселі венікі, гурба даставала да самай страхі.

Аднойчы выйшаў Пеця на агарод узяць венік і ледзь не заплакаў. Ад венікаў адны агрызкі засталіся. Усе венікі з'елі казулі ды зайцы. Толькі сляды свае пакінулі. Не адну, відаць, ноч звяры прыходзілі карміцца.

Пеця прывёў бацьку да пуні, паказаў:

— Во, усе венікі з'елі.

— З'елі і дзякуй сказалі.

— Каму?

— Табе. Падкарміў іх у суровую зіму, выручыў.

Наступным летам Пеця з сябрамі нарыхтаваў венікаў і звярам. Розных: бярозавых, асінавых, лазовых. А бацька стажок сена паставіў. Калі ласка, звяры, прыходзьце карміцца, толькі нашых венікаў не чапайце.

Звяры і прыходзілі. Нават лася бачылі, скуб сена са стажка.

## Дружба

Сяргейка нясмела заходзіць у татаў пакой. Тата нешта піша і не звяртае на яго ўвагі.

— Тата!

— Што табе?

— Я хачу, каб мы з табой ніколі не сварыліся.

— Добра, давай не будзем сварыцца.

— Ніколі-ніколі?

Тата згодна ківае галавой.

— Дай руку, — просіць Сяргейка.

Тата перастае пісаць, кладзе на стол аўтаручку і ўважліва глядзіць на сына.

Сяргейка таксама смела ўглядаецца ў татавы вочы, толькі крыху моршчыць нос.

— Што ж, вось мая рука, — кажа тата.

Яны паціскаюць адзін аднаму рукі і абяцаюць дружыць. А Сяргейка яшчэ прыгаворвае:

— Мірыцца, мірыцца і ніколі не сварыцца.

— Добра, — згаджаецца тата і пытае: — А цяпер скажы, што здарылася.

Сяргейка дастае з кішэні татавую люльку.

— Вось зламалася. Чэснае слова, сама. Я толькі ўзяў у рукі паглядзець, а яна ўпала на падлогу і зламалася.

Тата ўздыхае і ківае галавой: яму вельмі шкада гэтую люльку — дарагі падарунак знаёмага марака. Пасварыцца б на сына, каб не лазіў у шуфляду. Але як будзеш сварыцца? Толькі што паабяцалі дружыць і ніколі не сварыцца.

## Дзядоўнік

У маім двары расце куст дзядоўніку. Яго яшчэ называюць лопухам, калючнікам.

Летам, калі дзядоўнік зялёны і цвіце малінавымі кветкамі, да яго не падступішся — уколе.

— Пакуль расту і цвіту, не чапайце мяне! — строга папярэджвае ён усіх, натапырыўшы калючкі.

Увосень дзядоўнік робіцца шэрым, непрыгожым. І куды дзяюцца яго сіла і адвага! На ім выраслі і паспелі калючыя шарыкі-дзяды. І цяпер дзядоўнік ужо сам просіць, каб за яго чапляліся:

— Калі ласка, не абмінайце мяне.

І хто не абміне, таму дзядоўнік свае шэрыя шарыкі-дзяды дорыць.

Сабака прабяжыць, зачэпіцца — і ўвесь бок у дзядах. Свіння ў куст залезе — таксама начапляе на сябе дзядоў.

Сам я не раз чапляўся за дзядоўнік, калоўся, выскрабаў калючкі з адзення. Збіраўся нават выкапаць

той куст. Навошта яму, нікому не патрэбнаму пустазеллю, расці тут, у двары!

Аднойчы ранняй зімой, калі багата навалiла снегу, я выйшаў на двор і ўбачыў, што куст дзядоўніку стаў нейкі рухліва-стракаты, нібыта расцвіў яркімі кветкамі, пераважна чырвонымі. Толькі тыя кветкі былі жывыя, пырхалі і шчабяталі.

Гэта шчыглы і снегіры абляпілі куст. Карміліся семечкамі дзядоўніку, вылушчвалі з тых калючых шарыкаў.

Карміцеся, шчыглы і снегіры: для птушак цяжкая пара наступіла — доўгая зіма. А мой дзядоўнік няхай вас хоць трохі ды выручыць.

## УЛАДЗІМІР ДУБОЎКА

### Як сінячок да сонца лётаў

### 1

Быў час, калі агню нідзе
на свеце не было ў людзей.

І цеплыня ім, і святло —
усё ад сонейка ішло.

Зімой пакутаваў народ:
навокал сцюжа, снег і лёд.

Мароз гуляў, як гаспадар.
Амаль не грэла сонца з хмар.

Нагараваўшыся зімой,
прыйшлі да думкі ўсе такой:

— Ад сонца б іскрачку адну
прынесці ў нашу старану!

Тады б расклалі мы агонь
і грэліся каля яго.

А як бы гэта хто зрабіў,
калі не маюць людзі крыл?

Пасля надумаліся ўсе:
— Агонь нам птушка прынясе!

А птушкі дружна на зямлі
у часе тым з людзьмі жылі.

Пайшлі да птушак грамадой
з сваёй вялікаю бядой.

І вось гавораць птушкі ім:
— Далёка так не паляцім!

Не дапрасіліся ніяк!..
Адзін маленечкі сіняк

ляцець да сонца згоду даў,
чаго ніхто і не чакаў.

Вароны ўсе адразу ў крык:
— Ты прыкусіў бы лепш язык!

Не даляцець табе да хмар!
Загінеш ты!
Кар-р!
Кар-р!

Шкадуюць птушачкі усе:
— Маленькі вельмі ты, сусед!

Не ашчасліваш ты людзей,
асіраціш сваіх дзяцей...

А сінячок дае адказ:
— Бясспрэчна, я слабей за вас!

Але ж агню няма бліжэй,
а ён патрэбен для людзей!

І паляцеў да сонца так
адзін маленечкі сіняк.

**2**

Ляцеў, ляцеў і прыляцеў.
Там заспяваў вясёлы спеў.

Сваім вясёлым спевам тым
здзівіў ён сонейка зусім.

— Ды як жа ты сюды? Адкуль?
Такіх здарэнняў на вяку

яшчэ ні разу не было!
— Ляту з палескіх я балот! —

І расказаў пра ўсе, як ёсць,
маленькі гэты сонцаў госць.

— Нялёгкі людзі маюць лёс.
Мяне прасілі, каб прынёс

адну хоць іскрынку для іх
з агнёў палаючых тваіх!

— Прыдумаць не магу ніяк,
што і сказаць табе, сіняк!

Калі агню табе я дам,
як занясеш яго людзям?

Пакуль пабачыш ты свой бор,
ці сам згарыш, ці твой убор!

— Ляцець памалу буду я.
Не спаліць іскрынка твая!

— Ну, што, сіняк, з табой рабіць?
Агонь, як бачыш, сам гарыць!

Вазьмі лучынку, прыпалі,
Нясі, як зможаш, да зямлі!

Лучынку ўзяў ад сонца ён,
зацiснуўў дзюбкаю цаўё,

пасля лучынку прыпаліў
і паляцеў з ёй да зямлі...

3

Ляцеў, ляцеў і прыляцеў
ён да сваіх палескіх дрэў.

Ляціць над Прыпяццю-ракой,
Палессе бачыць пад сабой.

Яго вітаюць птушкі ўсе:
— Сіняк ляціць! Агонь нясе!

Вітаюць людзі ўсе яго:
— Сіняк ляціць! Нясе агонь!

Пачуўшы спевы, гоман той,
сіняк пачаў ляцець стралой.

Агонь узняўся, абхапіў
яго ад галавы да крыл.

Увесь убор гарыць на ім,
закрыў яго адразу дым.

Але не выпусціў ніяк
лучыну з дзюбачкі сіняк:

прынёс агонь, аддаў людзям,
застаўся хоць без пер'я сам.

Пазагараліся кастры,
ад іскры полымя гарыць.

А сінячок, хоць не памёр,
сядзіць галюткі ўвесь, без пёр.

Сумуюць птушкі навакол.
Адзін маленькі пасвісцёл

параду даў такую ўсім:
— Па пёрку мы яму дадзім!

Для нас не будзе страты ў тым,
а ўбор адновіцца на ім!

Адклад нідзе на лад не йдзе,
адразу ж памаглі ў бядзе.

Здаецца, што — адно пяро!
А колькі пёр з усіх сяброў!

Дапамагчы быў кожны рад,
па пёрку ўсе сабралі шмат.

І аднавіўся зноў убор
на сінячку з сяброўскіх пёр.

У кожнай птушкі колер свой
зімой бывае і вясной.

На той — чырвоны, сіні — ў той,
зялёны, жоўты — на другой.

Ён сам калісьці сіні быў,
пакуль агонь не абпаліў.

Не называлі б людзі так,
каб іншы колер меў сіняк!

Цяпер, па памяці старой,
застаўся ўсё ж ён з назвай той,

хоць многа колераў на ім,
хоць стаў стракаты ён зусім.

Адзін пугач не даў пяра,
яшчэ пры гэтым дакараў:

— Яго я лётаць не прасіў!
Узняўся тут страшэнны сквіл.

На грубіянства і дакор
аж загудзеў зялёны бор.

Напалі ўсе на пугача.
Хто дзюбай б'е, хто з-за пляча.

Пачаў даводзіць нешта ён,
калі ж далі з усіх старон,

схаваўся ціхенька ў карчы,
ад злосці керкае, сычыць.

Сядзеў да цёмнай ночы там,
бо вінаваты быў ён сам.

Ад той пары яго нідзе
не ўбачыш ты у ясны дзень.

Калі у гнёздах птушкі спяць,
тады ён можа вылятаць.

Ад той далёкае пары
такі парадак у бары.

А сінячку нядрэнна ў ім.
Ён не баіцца нават зім:

пагрэцца у зімовы час
ляціць у вёску ён да нас.

Не страшны тут яму мароз:
агонь ад сонца ён прынёс.

Пагрэцца мае права ён!
Такі парадак з даўніх дзён

ідзе у нашай старане,
і ён ніколі не міне!

# КАЗКІ

## Суп з сякеры

Ішоў салдат дарогаю. Падбіўся, прагаладаўся, а ў торбе — ні крошкі. Адна старая сякера без тапарышча, якую ён на дарозе знайшоў.

Зайшоў салдат у сяло. Пытаецца ў сустрэчнага мужыка:

— Хто тут у вас на харчы багацейшы?

Падумаў мужык і кажа:

— Ды вунь у трэцяй хаце адна баба жыве. Багацця ў яе хоць адбаўляй, а скупая, не дай бог.

Зайшоў салдат да скупой бабы, добры дзень даў. Разгаварыўся і папрасіў есці.

— А мой ты служывенькі, а мой ты саколік. Няма ж у мяне нічога — ні ў гумне, ні ў клеці. Сама галодная сяджу...

Дастаў салдат сякеру з торбы і кажа:

— Ну, нічога, старая, давай чыгун, будзем суп з сякеры варыць.

Здзівілася баба, але чыгун дала.

Укінуў салдат сякеру ў чыгун, наліў вады і паставіў у печ.

Паварыў трохі свой суп, пакаштаваў і кажа бабе:

— Нішто суп, не хапае толькі солі ды круп.

Пакаштавала і баба салдацкага супу.

— То, можа, падкінеш трохі? — пытаецца салдат.

Памулялася баба, але ўсё ж прынесла солі і круп.

Паварыў салдат яшчэ свой суп, пакаштаваў.

— Нішто, — кажа, — суп, не хапае толькі цыбулі ды здору або лою. Можа, падкінеш, бабка?

Падкінула баба ў салдатаў суп цыбулі і здору. І тут такі пах пайшоў, што салдат аж зачхаў на ўсю хату. Ды і ў бабы слінкі пацяклі.

Наеўся салдат супу з сякеры, бабу пачаставаў.

— Ай, служывенькі, — дзівіцца баба. — Век пражыла, а такой стра-

вы не ела: гэта ж і суп смачны, і сякера цэлая!

*Апрацоўка А. Якімовіча.*

## Лёгкі хлеб

Касіў на лузе касец. Змарыўся і сеў пад кустом адпачыць. Дастаў торбачку, развязаў і пачаў есці.

Выходзіць з лесу галодны воўк. Бачыць — касец пад кустом сядзіць і нешта есць.

Падышоў да яго воўк:

— Ты што ясі, чалавеча?

— Хлеб, — адказвае касец.

— А смачны ён?

— Дзіва што смачны!

— Дай мне пакаштаваць.

— Калі ласка!

Адламаў касец кавалак хлеба і даў ваўку. Спадабаўся ваўку хлеб. Ён і кажа:

— Хацеў бы я кожны дзень хлеб есці, але дзе мне яго даставаць? Парай, чалавеча!

— Добра, — кажа касец, — навучу цябе, дзе і як хлеб даставаць.

І пачаў ён вучыць ваўка:

— Перш-наперш трэба зямлю ўзараць...

— Тады і хлеб будзе?

— Не, браце, пачакай. Потым трэба забаранаваць...

— І можна хлеб есці? — замахаў воўк хвастом.

— Што ты, пачакай яшчэ. Раней трэба жыта пасеяць...

— Тады будзе хлеб? — аблізнуўся воўк.

— Не яшчэ. Дачакайся, пакуль жыта ўзыдзе, халодную зіму перазімуе, вясной вырасце, потым закрасуе, потым пачне наліваць зярняты, потым спець...

— Ох, — уздыхнуў воўк, — вельмі ж доўга чакаць. Але цяпер то я ўжо наемся хлеба ўволю!

— Дзе там наясіся! — перапыняе касец. — Рана яшчэ. Спачатку спелае жыта трэба зжаць, потым у снапы звязаць, снапы ў бабкі паставіць. Вецер іх правее, сонейка прасушыць, тады вязі іх на ток...

— І есці хлеб буду?

— Які нецярплівы! Спачатку трэба снапы абмалаціць, зярняты ў мяшкі сабраць, мяшкі ў млын завезці ды мукі намалоць...

— І ўсё?

— Не, не ўсё. Муку трэба замясіць у дзяжы і чакаць, пакуль цеста падыдзе. Тады ў гарачую печ пасадзіць.

— І спячэцца хлеб?

— Але, спячэцца хлеб. Вось тады і наясіся яго, — скончыў касец навуку.

Задумаўся воўк, потым пачухаў лапай патыліцу і кажа:

— Не! Гэтая работа занадта марудная і цяжкая. Лепш парай мне, чалавеча, як лягчэй ежу здабываць.

— Ну што ж, — кажа касец, — калі не хочаш цяжкі хлеб есці, параю табе лёгкі. Ідзі на выган, там конь пасецца.

Пайшоў воўк на выган. Убачыў каня:

— Конь, конь! Я цябе з'ем.

— Што ж, — кажа конь, — еш.

Толькі спачатку здымі з маіх ног падковы, каб не ламаць табе зубы аб іх.

— І то праўда, — згадзіўся воўк.

Нагнуўся ён падковы здымаць, а конь як стукне яму капытом у зубы...

Перакуліўся воўк ды ходу.

Прыбег да рэчкі. Бачыць — на беразе гусі пасуцца. «Ці не з'есці мне іх?» — думае. Потым і кажа:

— Гусі, гусі! Я вас з'ем.

— Што ж, — адказваюць гусі, — еш. Але спачатку зрабі нам адну паслугу перад смерцю.

— Якую? — пытаецца воўк.

— Паспявай нам, а мы паслухаем.

— Гэта можна. Спяваць я мастак.

Сеў воўк на купіну, задраў галаву і давай выць. А гусі крыламі — мах, мах! Узняліся і паляцелі.

Злез воўк з купіны, правёў гусей вачамі і пайшоў далей ні з чым.

Ідзе ды лае сябе апошнімі словамі: «Ці ж не дурань я, га? Навошта

я згадзіўся спяваць гусям? Ну, цяпер, каго ні сустрэну, — з'ем».

Толькі ён так падумаў, бачыць — на полі чарада авечак пасецца, а пастух спіць. Нагледзеў воўк у чарадзе самага большага барана, схапіў яго і кажа:

— Баран, баран, я цябе з'ем.

— Што ж, — кажа баран, — такая мая доля. Але каб не мучыцца мне доўга, ды і табе каб не ламаць зубы аб мае старыя косці, стань лепш вунь у той лагчынцы і разяў рот, а я ўзбягу на ўзгорак, разганюся і сам ускочу табе ў рот.

— Дзякуй за параду, — сказаў воўк. — Так і зробім.

Стаў ён у лагчынцы, разявіў рот і чакае. А баран узбег на горку, разагнаўся ды — трах! — рагамі ваўка ў галаву. Аж іскры пасыпаліся з вачэй у ваўка, свету ён не ўбачыў.

Ачухаўся воўк, пакруціў галавою і разважае:

— Цікава: з'еў я яго ці не?

А тым часам касец скончыў работу і ідзе дахаты. Пачуў ён ваўковы словы і кажа:

— З'есці не з'еў, але паспытаў лёгкага хлеба.

## ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ

### Скорагаворкі

Я гуляў адзін ля горкі
І збіраў скорагаворкі.

***Ці не лепшая — першая?***

Рагатун Рыгорка родам
З Рагачова горада.
Як захоча,
Зарагоча
Рагатлівым рогатам.

***Следам бяжыць другая,
і другая — не благая!***

Пiскляняты просяць проса,
Скачуць, босыя, па росах.
Фрося проса ім прыносіць,
Ажно косы Фросі ў просе.

***Як да рэчкі падышоў —***
***раптам трэцюю знайшоў***

На гародзе рос гарох,
А за рэчкай — грэчка.
Ох, ох, ох
ды ох, ох, ох,
Наш стары казёл Цімох
На гародзе рваў гарох,
Грэчку рваў за рэчкай.

***Вось табе, Рыгорка,***
***чацвёртая скорагаворка:***

Ліна з Нілам ловяць лівень,
Але лівень —
Не лянівы:
То лятае па алеі,
То люляе ён лілеі.
Ліна кінулася ўлева,
Ніл за Лінай,
Лівень згінуў
За калінай,
Каля млына.

## Тэматыка чытання:
# ОЙ, ЗІМА, ЗІМА, ЗІМА! ВЕСЯЛЕЙ ЦЯБЕ НЯМА!

*Мчыцца шпарка, мчыцца бойка*
*Па сумётах коней тройка.*
*Паганяе іх*
*Сама*
*Белакрылая зіма...*

У. Мазго

## РЫГОР БАРАДУЛІН
### Зіма

Гай маўчыць— лістоў няма,
Даль азябла сіняя.
Зноў да нас прыйшла зіма
Рупнай гаспадыняю.
Вымела без памяла
Поле з першапуткамі.
Хустку з галавы зняла,
Рунь малую ўхутала.
Суняла дачок-завей,
Каб дарма не бегалі,
А вязалі, ды хутчэй,
Рукавічкі белыя
Для ялінак-немаўлят,
Для хваінак тоненькіх.

У зімы работы шмат,
Ходзіць, ходзіць гонямі,
Рассцілае абрусы,
Дорыць шапкі цёплыя...
Спяць азёры, спяць лясы,
Спяць стагі на поплаве.
Спорыцца ўсё ў яе.
Неба распагодзіла.
Дзе парадку не стае,
Дык ідзе ў абходзіны.

## КЛАЎДЗІЯ КАЛІНА

### Люты

Ідзе па зямлі Люты і пытае ў кожнага, ці добра адзеты і абуты.

Зайшоў у сяло, пастукаўся да дзеда з бабай:

— Іду лютаваць! Сумёты намятаць! Дарогі засыпаць, усіх у хату заганяць. Люты я! Пытаю, ці ўсе добра адзеты, абуты?

— Усе, усе! — адказвае дзед. — У мяне кажух ёсць і валёнкі. У маёй бабы таксама кажух, і валёнкі, і цёплая хустка. І авечкі, і карова ў цёплых хлявах. Хату прызбаю абсыпаў, дроў назапасіў... Ідзі, лютуй!

Супакоіўся Люты і пайшоў у лес да лясных птушак ды звяроў.

— О-го-го-го! — крычыць на ўвесь лес, аж рэха разлятаецца. — Я лю-у-у-ты! Іду лютаваць! Сумёты намятаць! Дарогі засыпаць!

— А ў мяне цёплае дупло! Я накрыюся хвастом і буду спаць! Лютуй! — кажа вавёрачка.

— А я ў бярлозе лапу смакчу... — сапе скрозь сон мядзведзь. — Лютуй сабе!

— А я ў нару схаваюся! — махнуў рудым хвастом ліс.

— Я ямачку ў снезе зраблю! — сказаў заяц. — Я цяпер беленькі, і ніхто мяне не прыкмеціць.

— А я не баюся ні марозу, ні завеі, я ў цёплай камізэльцы! — ціўкнуў снягір.

— Я падамся да ч-ч-чалавечага прытулку-у! — застракатала сарока.

І ўсе звяры і птушкі пахаваліся. Хто ў нару, хто ў дупло, хто пад снег.

І што тут пачалося! Люты як падзьме — сумёты, як горы, вырас-

таюць. У маленькіх ялінак і сасонак толькі чубы з-пад снегу тырчаць. На рэчцы страляе лёд. А Люты лютуе. То марозам прыцісне, то завеяй у вочы сыпне.

Доўга лютаваў. Нарэшце стаміўся, лёг пад сасною адпачыць ды і заснуў. Спіць сабе Люты і не чуе бяды.

А сонейка выглянула з-за хмар, прыгрэла на сасне снег... І пачало з ледзяшоў капаць. Кап! Кап!

Выскачыла з дупла вавёрка і зацокала на ўвесь лес:

— Спіць Люты! Спіць, не чуе,
Што вясна яму рыхтуе!

Вылецеў з дупла дзяцел і застукаў дзюбай: тэлеграму адбівае:

— Спіць Люты! Спіць пад сасною,
А Са-ка-вік ужо за спіною!

А з ледзяшоў: кап! кап! кап!

Раптам — кап! — проста Лютаму на нос. Падхапіўся Люты, дзьмухнуў раз, другі завеяй, але сілы ўжо няма! Чуе, Сакавік недалёка!

## СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ

### Усё зіма заснежыла

Белымі сняжынкамі
Ўся дарожка ўсеяна.
Была ў полі рэчанька,
Ды не стала. Дзе яна?
Была ў полі елачка,
Пышная, зялёная,
А яе мяцеліца
Замяла шалёная.
Азярцо празрыстае
За сялом свяцілася,
Посцілка бялюткая
На яго зваліласся.
Тут зіма заснежыла
Брамы і штыкеты,
Кожны куст і дрэва
Ў белае адзеты.
Ранкам нашу сцежку,
Што да школы сцелецца,
Мы ізноў пратопчам.
Не мяці, мяцеліца!..

## ЯКУБ КОЛАС

### Дзед-госць

Ходзіць дзед белабароды
Полем, лесам, пералескам,

Засцілае рэчкі лёдам,
Брыльянцістым снежным блескам.
Сыпле іней на бярозы,
Туліць дрэвы лёгкім пухам,
Крые руні, травы, лозы
Белай воўнаю-кажухам.
Дзеда ўсюду носяць ногі,
І к нам прыйдзе на хвілінку
Адпачыць крыху з дарогі,
Важна сеўшы на ялінку.
А ялінка!.. Чаго толькі
На яе няма галінках!
Свецяць зоркі і вясёлкі
У бліскучых павуцінках.
Тут лісічка, зайчык, мышкі,
Рыбкі, буслік даўгавязы.
А як ззяюць на ёй шышкі,
Нібы ў іх гараць алмазы!
Каля ёлкі карагоды,
Песні, гутарка жывая,
А той дзед белабароды
Толькі ў вусны смех пускае.
Дык рассунем кола шырай,
Патанцуем на памосце,
Песняй звонкай, песняй шчырай
Прывітаем дзеда-госця.

## Тэматыка чытання:

# ВЯСНА, ВЯСНА! УСЕ ЁЙ РАДЫ...

*Сонца, зубкі пакажы!*
*Хай зазвоняць капяжы!*
*Сонейка, ха-ха, хі-хі!*
*Скіньце, людзі, кажухі!*
*Сонейка, рагачы!*
*Трэба зімцы ўцячы!*

Д. Бічэль

## Паводле ЯКУБА КОЛАСА

### Вясна

(Урывак)

I

Які пекны, слаўны дзянёк! Выйдзем, дзеткі, на вуліцу, на божы свет. Паглядзім, паслухаем. Можа, чаго і навучыць нас гэты божы свет.

Пачарнеў на полі снег, а на ўзгорках сталі паказвацца чорныя лапінкі, лысіны. Па вуліцах пацяклі равочкі каламутнай вады. Весела бягуць яны разоркаю з поля праз двор, блішчаць і срэбрам пераліваюцца на сонейку. Цякуць яны і ўсё большаюць. Выходзіць з хаты гаспадар.

Бачыць: вада цікуе на яго хлевец. Не, галубка! Не чапай будовы. Там стаіць авечачка, кароўка. Ідзі сабе далей. І гаспадар бярэ рыдлёўку і пракопвае ёй дарогу. А воданька закаламуціцца яшчэ больш і пабяжыць далей. Па дарозе сустрэне яна другі гэтакі самы равок. Яны забулькаюць нешта вясёленькае адзін аднаму, сальюцца і пабягуць далей разам... Сустрэнуць малюсенькі равочак, такі малюсенькі, што цячэ ён, як слёзка, па капельцы. Мардуецца, бедны, працуе над кусочкам лёду, што загарадзіў яму сцежачку. Збірае ўсе сілы і з вялікім трудом ледзьве-ледзьве скоціць нягодны кусочак лёду і з такою гэта радасцю зліваецца з перавалам! А перавал ахвотне бярэ з сабою і яго працу. І вот пакрысе, памаленьку перавал пераходзіць ужо ў рэчку. Шуміць, раве ў полі. Ён так ужо акрэп, што можа пакаціць і камень.

Бачыце, дзеткі, як расце сіла вады.

## II

А сонца дзень ада дня ўсё вышэй і вышэй ходзіць па небе, усё цяплей і цяплей саграваe яно зямлю. Плача зіма, льюцца яе халодныя каламутныя слёзы. Растае снег, пакідае палі. Не хочацца яму ўступіць места цяплу і свету. З гор злазіць ён у лагчынкі, у балота, у лес. Не схаваешся, браце, ад сонца, усюды яно знайдзе цябе. А сонейка так ласкава, так хораша пазірае на зямлю, як матка на сваё дзіця. Заглядае яно ўсюды: і ў бедную мужыцкую хатку, дзе так непрыбрана, бедна, нявесела; і на пясчаную горку, і ў лагчынку, дзе думаў снег знайсці сабе прыпынак; і ў лес, і на луг. Усюды льецца яго шчыры свет і цяпло; нідзе не найдзе сабе пакою снег. Многа работы залатому сонейку ў раннюю весну. Доўга трэба ваяваць яму з зімою. Многа снегу з'есць яно за дзень, а там, пазіраеш, уночку падымуцца хмуркі, павее вецер з халоднага боку і закрые ізноў усё снегам, ізноў

дасць работы для сонца. Але сонца не бядуе. Прыгрэе ўдзень, і снег прападае. І так яно працуе цэлы месяц, пакуль не згоніць з зямлі сляды халоднае зімы. І ваюе яно з цьмою і холадам, як ваюе і чалавек са злом і несправядлівасцю.

## Прылёт птушак

Ціхая раніца. Сонейка толькі што ўзышло. У полі яшчэ ляжыць снег. Толькі ўзгоркі чарнеюць. Лужынкі сцягнуліся за ноч лядком. Але ўжо чуваць вясна, і ўсё пазірае па-вясенняму.

Выйшаў маленькі Ясь на двор. Весела так яму, лёгка на сэрцы. Прыгрэе зараз сонца, добра будзе гуляць на дварэ.

Ся! Што-то звоніць у небе тоненькім срэбраным званочкам? Так хораша, так міла, — душа замірае! Ясь прыслухаўся. Не відаць нічога, а ў небе ціха разліваецца тоненькая песенька, як грае хто на срэбнай дудачцы. Гэта жаваранак! І так

весела Ясю, здаецца, каб льга было, пацалаваў бы мілую птушачку. Галубка! Яна ўжо вярнулася з далёкае старонкі ў наш бедны край і ў ясным небе залівaецца дзіўнаю песняю.

— Тата! Тата! Чуеш жаваранка?

Бацька Яся прыслухаўся.

— Але, жаваранка. Ну, зараз, брат, і шпак прыляціць, а там і бусел, а за ім і ўсе птушкі.

Рад Ясь, што першы пачуў ён жаваранка, і пабег хваліцца сваім сябрам. Дзеці выходзілі на двор слухаць першую песню вясны. І ім было весела.

— Эх, дзеці! Не скора яшчэ вясна, — казаў хто-небудзь старэйшы.

Дзеці не любілі слухаць такія рэчы. Яны любяць вясну, яны любяць, каб гаварылі ім аб вясне. А часам і праўда захаладае; дзеці кажуць: «Саўсім не холадна; не толькі не холадна — горача нават».

Кожную новую госцю-птушку дзеці сустракаюць з радасцю.

Праз некаторы час прылятае шпак. Халадно, туман, а ён мала дбае. Спявае на ўсё поле вясёлыя песні.

У канцы марца ўжо збіраецца шмат птушак. У лесе спяваюць дразды, лясныя жаваранкі, а па балоце важна праходжваецца бусел. На стрэхах бегаюць шустрыя беларудыя сытаўкі, трасуць сваімі доўгімі хвастамі.

А выйдзеш увечар на двор — крычаць качкі, жалобна стогнуць кнігі; як у кадушку, грукае недзе на возеры бугай. Розныя галасы поўняць воздух, усё спявае і радуецца.

## Дуб і чароціна

Была вясна. Ціхі вечар. Месячык плыў у небе, свяціліся зоркі. Спакойна каціласся рака і блішчала на месяцы. На беразе стаялі тоўстыя, старыя дубы. У самым беразе, у вадзе, чуць-чуць шарасцеў чарот. Каля самага берагу, воддаль ад другіх дубоў, рос самы тоўсты, самы магучы дуб.

Завяла чароціна з дубам гутарку.

— Скажы мне, дубе, — пачала чароціна, — чаму ты не гнешся прад бураю і бура цябе не можа здалець? Часта, стоячы тут, бачыла я, як самыя сярдзітыя буры ўпіраліся ў цябе, як у каменную сцену. На тваёй галаве бусел звіў агромнае гняздо, а ты нават не чуеш гэтае ценжэры. А я вот стаю тут ды гнуся, як жабрак. Маленькая птушачка сядзе на мяне, я не выдзержваю і гнуся да самае вады. Часам жук няўмысля вытнецца аб мяне, я ўся закалачуся, як у хваробе.

Дык скажы ж мне, дубе, адкуль твая сіла? Скажы мне, чаму я такая слабая?

І кажа ёй дуб:

— Ты баішся жыцця, затым ты і слабая. Ты выбіраеш мяккі грунт, каб не так трудна было бараздзіць зямлю сваім карэннем. Усім ты хочаш унаровіць, ка ўсякаму ты падыходзіш з хітрасцю, і змалку прывыкла ты гнуцца. А калі хто гнец-

ца, тым ён паказывае сваю слабасць і поўнае непаважэнне к сабе. А хто не паважае сябе, таго і другія не паважаюць, папіхаюць ім, як хочуць. Ты прывыкла да лёгкага жыцця і ўсю надзею кладзеш на другіх. А хто не надзеецца на сябе, той цягам бывае слабы. А я змалку надзееўся толькі на свае сілы і на сілы зямлі і сонца. Змалку навучыўся сам памагаць сабе. Нікому я не гнуўся. Лепей зламацца сусім, чым гнуцца ўсякай сіле. Мы, дубы, так і робім: або ломімся, або выжываем. Затое, як хто з нас захавае сваё жыццё, тады нікога не баімося. Праўда, і мяне можа зламаць бура і цяпер: няма на свеце такое сілы, над каторай не было б большае сілы.

### Паводка на Нёмане

Грымяць крыгі, шархацяць, узбягаюць адна на адну і з глухім шумам разбіваюцца, крышацца.

Выйшаў Нёман з берагоў, заняў увесь луг. Вада і вада скрозь, як акінуць вокам.

На адным беразе відны ўзгоркі, на другім — лес.

Вось плыве шырокая, доўгая крыга. З краю, умерзлая ў лёд, нахіліўшыся, стаіць на ёй елачка. Прыпынілася крыга ля берага, павярнулася раз і другі, выбілася на прастор і паплыла. Вось зусім схавалася, толькі елачка чарнее каля другога берага. Неўзабаве і яна прапала з вачэй.

Пасярэдзіне ракі коціцца стары, сухі дуб. Яшчэ летась стаяў ён над самым Нёманам. Размыла вада бераг, абваліўся дуб у раку, і панесла старога вада. Упіраецца дуб, чапляецца за кусты. Але быстрая плынь круціць яго ва ўсе бакі, як лёгкую трэску. Выплыў і ён на плёс і пакорна аддаўся на волю паводкі.

Сустракаюцца дужыя маладыя дубы, што моцна стаяць у вадзе. Глядзяць на старога. Шкода ім свайго таварыша.

**Першы гром**

Галасам моцы, ціха і важна
Гром пракаціўся ўгары.
Луг адазваўся грому працяжна,
Лес адгукнуўся стары.
Гай страсянуўся, дрогнула поле,
Долы той гук паняслі.
У гэтым раскаце чуецца воля,
Чуецца радасць зямлі.
У грукаце гэтым многа ёсць сілы,
Чуецца моц і прастор...
Першыя громы! Сэрцу вы мілы,
Люб мне ваш смех паміж гор...

## УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

### Канцэрт у Белавежскай пушчы

Ох, як спявае вясною Белавежская пушча! Вучоныя прызналі, што белавежскія салаўі самыя галасістыя. А тут яшчэ больш за дзвесце відаў розных птушак. Уявіце сабе, які штодня тут адбываецца канцэрт!

Праўда, не ва ўсіх птушак ёсць голас. Івалга свішча звонка з пералівамі, а цецярук балбоча. Пера-

гукваюцца адна з адной зязюлі: ку-ку-ку!

Шпак умее пераймаць галасы іншых птушак, а можа і паказаць, як пільшчыкі пілуюць тупой пілой дровы. Вялізная сава — няясыць — вухкае, аж мароз па скуры ідзе, а чорны бусел, вельмі рэдкая птушка, зусім маўчыць, зашыўшыся ў самыя глухія нетры.

Умейце, дзеці, слухаць птушак і пазнаваць кожную па голасу.

## ВАСІЛЬ ВІТКА

### Жаваранак

Хто прыносіць нам вясну,
Сонцам поплаў меціць,
Будзіць поле ада сну?
Жаваранак, дзеці.
На раллі яшчэ лядок,
Не абсохла глеба,
Вестунок — за званок
І хутчэй у неба.
І звініць, звініць званок
У блакітным свеце,
Кліча нас на свой урок
Жаваранак, дзеці.

## АРТУР ВОЛЬСКІ

### Май

І прыгожы, і вясёлы
Мой любімы месяц май.
Адышлі даўно трывогі.
І ўрачыста кожны год
Дзень Вялікай Перамогі
Адзначае наш народ.
Чуеш
выбухі салюта?
Палічыць іх
паспявай.
Перамогаю
славуты
Мой любімы
месяц май.

## ВЕСНАВЫЯ ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ

Вясенні дзень год корміць.

Рана ў поле выязджай — лепшы будзе ўраджай.

Калі добра ўзарэш, то і ўраджай збярэш.

Адна ластаўка вясны не робіць.

Вясной прапусціш — летам не дагоніш.

Цёплы апрэль, мокры май — будзе жыта так, як гай.

Май халодны — не будзеш галодны.

## Тэматыка чытання:

# ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ...

*Перамаглі мы светлым ранкам,*
*І ты заслала нам абрус,*
*Мая краіна — партызанка,*
*Мая Радзіма — Беларусь.*

М. Лужанін

*Таварыш,*
*Сягоння ў нас думы адны:*
*Мір нам патрэбен,*
*Не трэба вайны!*

П. Броўка

## ПЯТРУСЬ БРОЎКА

### А хіба ёсць, што забываюць?

Ляжыць салдат
ля пераправы,
Каля маленькае ракі.

Ляжыць салдат
Вялікай славы,
Крывёй здабытай на вякі.

Шуміць над ім гушчар
зялёны,
Плывуць аблокаў караблі.
Ён паў,
Пазбавіўшы палону
Вось гэты кут сваёй зямлі:

І лес ва ўзорах журавінных,
І луг з расянаю травой,
І тыя светлыя хаціны,
Што сталі дружна
над вадой,
І сад шумлівы
напрадвесні,
І піянерскія кастры...
Ляжыць салдат
І чуе песні,
Што не сціхаюць да зары.

Ляжыць і сніць ён
аб народзе,
Якому шчасце —
вольна жыць!

І рады ён, калі прыходзяць
Хоць зрэдку з ім пагаварыць,
Калі сцяжыначка малая
Не зарастае да яго...

А хіба ёсць, што забываюць
Выратавальніка свайго?

## СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ

### Партызанскі звон

Пад ялінамі, у гушчарніку, стаяла закураная павець. А крокаў сорак ад яе, на грудку, прытуліўся да стромкай сасны будан, пакрыты бярозавай карой і абложаны тонкім пластом дзёрну. Тут гаспадарыў партызанскі каваль Сцяпан Мажэйка. Пад павеццю стаяла кавадла, вісеў стары кавальскі мех, на дошцы ляжалі малаткі, напільнікі і абцугі.

У самім будане стаяў толькі сплецены з лазы тапчан. На старым, палапленым сенніку ляжалі суконная коўдра і кажух. Ад будана ішлі дзве добра пратаптаныя сцяжынкі: адна да павеці-кузні, другая — да балот-

ца. Яно ўсё зарасло купінамі і цягнулася кіламетраў з пяць ажно да самага бору.

Паблізу балота з-пад пагорка выбівалася маленькая крынічка. Каваль чэрпаў з яе ваду. Тут, над ёю, на вываратні замшэлай алешыны, сядзеў і адпачываў ён у вольныя хвіліны. Сюды любіў забягаць да старога каваля Марат Казей і слухаць яго цікавыя расказы. Знаёмства ў іх завязалася не так даўно. У Маратавага каня Орліка адстала адна падкова і ледзь трымалася на капыце. Марат прывёў каня да дзеда Сцяпана. Той доўга гладзіў Орліка, хваліў, нават схадзіў у будан і прынёс для яго кавалачак хлеба. А калі заўважыў у Орліка на назе ранку, знайшоў бутэлечку дзёгцю, змазаў ранку і сказаў Марату, што цяпер балячка хутка загоіцца.

З гэтага дня і пасябраваў Марат Казей з кавалём.

Летнім ранкам прывяла Марата да каваля зусім невялікая патрэба.

Надламалася зашчапка ў спражцы. А без папружкі лясному салдату не абысціся. На ёй вісяць гранаты, пісталет або цясак. А ў халодныя дні, чым тужэй падперазаны шынель або ватоўка, тым цяплей і нават лягчэй ісці.

Каваль узяў у рукі папружку, агледзеў спражку, усміхнуўся і сказаў:

— Ведаеш, сынок, бяда тут невялікая. Зараз дамо ёй рады, так замацуем, што, каб і хацеў, не адарвеш.

Сцяпан Мажэйка ўзяў малаток, падышоў да кавадла і акуратна выраўняў на ім зашчапку ў спражцы. Потым падняў кручок.

Марат падперазаўся, заткнуў за пояс гранату і хацеў падзякаваць дзеду за работу, але каваль спыніў яго на паўслове:

— Калі хочаш аддзякаваць, сынок, дык знайдзі кавалак рэйкі. Вельмі ж яна мне патрэбна...

Марат паабяцаў, што пастараецца знайсці. Праз тыдзень ён са

сваімі старэйшымі таварышамі Мікалаем Калечыцам і Мікалаем Шамко выправіліся ў баявую разведку.

Трое коннікаў імчаліся лясной дарогай да чыгуначнай каляі Койданава—Станькава. На гэтым участку чыгункі фашысты рыхтаваліся да перавозкі важных грузаў. Яны нагналі сюды рабочых, якія падбівалі шпалы, правяралі ўмацаванне рэек, забівалі новыя штылі.

Акупанты меркавалі, што паблізу стаяць моцныя гарнізоны і партызаны ўдзень не адважацца сюды ткнуць носа.

Партызаны спыніліся ў густым хмызняку. Ахову коней даручылі Мікалаю Шамко, а Марат Казей і Мікалай Калечыц пачалі прабірацца лагчынаю да чыгуначнай каляі. Радавала іх тое, што навокал многа зарасніку, рос малады бярэзнічак і ельнічак, а яшчэ ніжэй, каля чыгункі,— густы алешнік. Затаіўшыся ў гушчары, Марат і Калечыц пільна ўглядаліся на палоску

рэек, правяралі, як часта праходзяць аглядчыкі.

Раптам з боку Станькава пачуўся грукат колаў і шум матора. Па рэйках імчалася дрызіна. Наперадзе тырчэў кулямёт, за якім сядзеў немец у касцы. Апрача кулямётчыка, на дрызіне сядзела пяць салдат з аўтаматамі напагатове. Неўзабаве паявіліся вартавыя. Яны моцна грукалі па шпалах падкаванымі ботамі.

Калі салдаты зніклі, Марат і Калечыц кінуліся да рэек, прымацавалі да іх некалькі толавых шашак, працягнулі шнуры. Падпалілі іх, адбегліся як мага далей і прытуліліся да зямлі. Пачуліся страшэнныя выбухі, узняўся слуп зямлі. Глянулі хлопцы на чыгунку і ўбачылі, што рэйкі на некалькі метраў былі разарваны і развернуты шпалы.

— Хутчэй да коней! — загадаў Калечыц.

Але Марат, здавалася, не чуў гэтай каманды. Ён кінуўся да насыпу, схапіў паўметровы кавалак рэйкі,

ускінуў яго на плячо і пабег да Калечыца.

— Навошта яна табе, кінь! — крыкнуў Мікалай.

— Калі ўзяў, значыць, трэба!— сказаў Марат. Знаёмай лагчынаю вярнуліся хлопцы да коней.

У лесе іх чакаў Мікалай Шамко. Напалоханыя выбухамі на чыгунцы, коні насцярожана стрыглі вушамі.

Марат упакаваў рэйку ў фуражны мех і падвязаў да сядла.

Калі ўжо зайшло сонца, Марат прыйшоў у кузню. Каваль сядзеў на альховым вываратні, заняты сваімі думкамі. Голасна кракталі жабы, у далёкім бары абазвалася напалоханая сава.

— Добры вечар, дзядуля! — сказаў Марат, скінуў з плячэй мех і выцягнуў з яго рэйку.

— Дзякуй, унучак,—узрадаваўся стары каваль.

— Цяпер скажыце, дзядуля, навошта яна вам?

Каваль прытуліў хлопца да сябе:

— Камбрыг загадаў. З тваёй рэйкі мы зробім наш партызанскі звон... На досвітку ён будзе падымаць усіх, а вечарам званіць адбой. А калі што якое... Дык сам ведаеш...

Стары каваль прыкруціў рэйку дротам да сухой сасновай галіны.

Назаўтра раніцай партызанскі лагер падымаўся па баявому сігналу.

**Паводле ВІТАЛЯ ВОЛЬСКАГА**

## Подзвіг Мікалая Гастэлы

Быў ясны летні дзень. Сонца стаяла высока над зямлёю.

Капітан Мікалай Гастэла на чале сваёй эскадрыллі прымаў удзел у вялікім паветраным баі. Як заўжды, упэўнена вёў ён свой баявы самалёт.

Недалёка ад лініі фронту гарэла падпаленая фашыстамі вёска. У полі, каля сажалкі і ў садах паміралі людзі.

Бой зацягнуўся. Сярод залацістых палёў і зялёных садоў вузкаю стужкай слаўся ўнізе гасцінец. Рухалася калона нямецкіх машын

з пяхотай, цыстэрны з бензінам. У адным месцы згрудзіліся варожыя танкі і грузавікі. Рух на дарозе спыніўся. Сюды і накіраваў сваю машыну Гастэла. Вось ён зрабіў разварот і пачаў зніжацца. Але ў гэты момант снарад варожай зеніткі трапіў у бензінавы бак самалёта.

Машыну ахапіў агонь. Твар апаліла полымя. Што рабіць? Выратаваць самалёт нельга. Тады Мікалай Гастэла цвёрдай рукой накіраваў свой самалёт уніз — туды, дзе спынілася ў беспарадку калона фашыстаў. У самую гушчу вялікага скопішча танкаў, аўтамашын, зенітак і цыстэрнаў з бензінам упаў яго ахоплены полымем самалёт.

Страшэнны выбух скалыхнуў паветра.

Высока ўзняўся слуп зямлі, жалеза і дыму. Нямецкія танкі, машыны з салдатамі ўзляцелі ўгару. Потым ускінулася да неба і ахапіла ўсё навокал вялізнае полымя пажару.

Так загінуў у агні Мікалай Гастэла, сын беларускага народа, першы Герой Вялікай Айчыннай вайны, бясстрашны лётчык і патрыёт.

## РЫГОР БАРАДУЛІН

### Салдацкія зоркі

Абвясціў светлы май
Сорак пятага года:
«Край!
Сыноў сустракай
З баявога паходу!»
Маладзелі сады.
Маладзела дарога...
Аж чатыры гады
Ты ішла,
Перамога.
Не твая ў тым віна,
Што чакалі багата.
Лютавала вайна.
Стала грознай адплата.
Шлях праз дым.
Шлях праз жах.
Трэба пільна ўглядацца!
Зоркай значыўся шлях,

Пяцікутнай,
Салдацкай.
Зніклі прэч груганы,
Верас журыцца горкі.
Узнялі курганы
Пяцікутныя зоркі.
Перамога,
Пагляд
Твой праменіста бліскаў.
Ззяюць зоркі салдат
На грудзях абеліскаў.
Над імжой,
Над слатой,
Праз паляны, пагоркі,—
Перамогі святой
Пуцяводныя зоркі...

## Тэматыка чытання:
# НАС ЛЕТА Ў НОВЫЯ ДАЛІ ВЯДЗЕ...

*Сонца пячэ,*
*Ліпа цвіце,*
*Збожжа даспявае —*
*Калі гэта бывае?*

Загадка

11 Зак. 2082

## ПЯТРУСЬ БРОЎКА

### Спявае лета над барамі

Спявае лета над барамі,
Сасёнкі струнамі звіняць,
Гамоніць поле каласамі,
Шапоча ў кветках сенажаць.
Шумяць вятры ў гаях напеўна...
Адна рачулка ў чаратах
Бурчыць, варочаецца гнеўна,
Бы мулка спаць на камянях.
А можа, з навіны ў ахвоту,
Пакуль міне плацінаў строй,
Так напрацуецца да поту,
Што ўранку ажно пар над ёй.

## ЯКУБ КОЛАС

### Летняя ноч

Ціха на землю спушчаецца ноч. Усё заціхае. Птушкі перасталі спяваць і дрэмлюць на сваіх седалах. Край неба, дзе зайшло сонца, блішчыць шырокаю чырвонаю стужкаю.

Тонкія, лёгкія хмаркі афарбаваліся ў залаты колер, усё роўна як абняло іх полымя. Белаватаю пя-

лёнкаю ўздымаецца туман над лугамі і балотамі. А цемната ўсё гусцее і гусцее і закрывае ад вачэй і поле, і лес. Вот узышла ўжо першая вячэрняя зорка. Чуць-чуць свецяцца ў далёкім небе скрозь цемнату і другія маленькія зорачкі. Вот яны свецяць ярчэй, дрыжаць, пераліваюцца дзіўным бляскам. Кажаны вылецелі са сваіх месцаў, дзе сядзелі яны ўвесь дзень, круцяцца, падаюць наніз, ізноў падымаюцца ўгору і цыркаюць тоненькім піскам. За сялом, на балоце, закрахталі жабы.

За лесам яснее. Гэта круглы месячык запаліў ліхтарык і свеціць над чорнаю зямлёю. Вось ён падымаецца ўсё вышэй, меншае, бляднее, і маркотны свет яго цэлымі снапамі разліваецца ў цемнаце. Поле, луг, гай і лес, на мінуту перад гэтым схаваныя ў цьме ночы, чуць-чуць ясней выступілі сваімі цёмнымі фігурамі.

### На лузе

Добра ў лузе ў час палудны!
Лёгка там дыхнуць!
Хмаркі белыя марудна
За лясы плывуць.

Ветрык краскі чуць калыша,
Травы шалясцяць,
Луг зялёны жыццем дыша —
Конікі трашчаць.

Ў лозах шчэбет не сціхае,
Шум стаіць і свіст,
У яркім бляску спачывае
На ракіце ліст.

Спевам-гоманам і звонам
Поўніцца ўвесь луг,
І дрыжыць над ім, зялёным,
Жыватворны дух.

## КЛАЎДЗІЯ КАЛІНА

### Ліпень

Неяк раз запрасіла Вясна з заморскіх краёў да сябе ў госці пчаліны рой.

Прыляцелі пчолы да Вясны, спадабалася ім тут.

Сады цвітуць, прыгожыя кветкі на лугах. Ёсць з чаго пчолам збіраць мёд. І яны збіралі нектар, пылок з кветак і за работаю не згледзелі, як Вясна адышла і прыйшло Лета.

Аднойчы ранкам вылецелі пчолы ў сад, а там усе кветкі з дрэў асыпаліся. Паляцелі пчолы на лугі, а там пракосы ляжаць. Падаліся на палеткі канюшыны, і тут усё скошана. Зажурыліся пчолы і вярнуліся да сваёй маці.

— Што ж нам рабіць? — бедавалі яны. — Лета атрэсла з садоў усе кветкі, скасіла ўсе краскі на лугах і палях... Як жыць? Вясне мёду не хопіць на доўгую зіму!

— Не журыцеся, мае дзеткі! — супакоіла іх пчаліная маці. — Паляцім усім роем да Лета, папросім, можа, яно дасць якую раду.

Знайшлі пчолы Лета на лузе, яно касіла траву.

— Што ж ты нас крыўдзіш, Лета? — загулі пчолы. — Вясна нас запрасіла да сябе, расквеціла сады... А ты ўсе галінкі атрэсла, лугі скасіла, усё высушыла... няўжо ты не ведаеш, што мы без красак і без работы загінем?

Выслухала Лета пчол, задумалася.

— Не ведала я, што вам патрэбны кветкі, але пачакайце, можа, мае месяцы нешта параяць... Эгэ-гэгэ! Дзе вы, мае месяцы?! — гукнула Лета.

Выбеглі з зялёнага гаю тры вясёлыя, загарэлыя летнія месяцы, сталі ў рад.

— Мы тут, Лецейка! Што загадаеш? — спыталі.

— Памажыце пчолам! — папрасіла сваіх месяцаў Лета і расказала ім пра пчаліную скаргу.

— Я толькі магу падоўжыць дзень, каб пчолы маглі больш красак абляцець, — сказаў першы месяц Лета.

— А я замест скошаных красак падгадую новыя, — паабяцаў трэці, апошні месяц.

— А што ты маўчыш? — спытала Лета ў сярэдняга месяца.

Сярэдні месяц доўга думаў, што яму зрабіць, каб памагчы пчолам.

— Я расквечу ліпы, яны яшчэ не цвілі! — радасна сказаў ён. — Вось і будзе пчолам удосталь і працы, і мёду.

— Вельмі добра ты прыдумаў! — зарадавалася Лета. — За тое, што ты расквеціш ліпы і дапаможаш пчолам, ты будзеш звацца Ліпень.

— Дзякуй табе, Ліпень! Добры Ліпень! Шчодры Ліпень! — загулі пчолы і паляцелі да ліп.

І да гэтага часу пчолы дзякуюць шчодраму Ліпеню.

— Дз-зя-куй! Дз-зякуй! — дзынкаюць яны над ліпамі.

Пастойце хвілінку ў ліпені пад расквечанымі ліпамі, прыслухайцеся, самі пачуеце.

## СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ

### Лясная калыханка

На бярозцы пры гасцінцы
Птушаняткі на галінцы.
Ну а ветрык, як знарок,
Хіліць голлейка набок.

Ах ты, ветрыку мой,
Птушанятам дай спакой!
Люлі-люлі! Люлі-люлі!
Невялікія заснулі.

Лісце, збожжа, кветкі, травы
Кропіць дождж ык
неласкавы.
Сыпле, сыпле ад паўдня,
Мочыць бедных птушанят.

Ах ты, дождж ыку мой,
Птушанятам дай спакой!
Невялікія заснулі.
Люлі-люлі! Люлі-люлі!

І кляночкі, і асіны,
І сасонкі, і яліны,
І рабіна, і дубок —
Зашумеў увесь лясок.

Ах, лясочак ты мой,
Птушанятам дай спакой!
Люлі-люлі! Люлі-люлі!
Невялікія заснулі.

## СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ

### Адшумела лета

Адшумела лета
Роснымі лугамі.
Апусцела поле,
Нівы адцвілі.
Праплываюць хмары
Нізка над стагамі,
І ляцяць у вырай
З крыкам жураўлі.
Не сціхае вецер
Над асеннім полем,
За ракой
Рыбацкі аганёк патух,
І ляціць паволі
Ад старой таполі,
Кружыць над дарогай
Белы-белы пух.

На рабіне скачуць
Шустрыя сініцы.

Пад дажджом намоклі
Клёны і дубы,
Наліліся сокам
Спелыя брусніцы,
І каля дарогі
Выраслі грыбы.

## ЛЕТНІЯ ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ

Летні дзень зіму корміць.

Што летам нарадзіцца, тое зімой згодзіцца.

Людзі рады лету, а пчолы квету.

Што летам ножкай коп, то зімой ручкай хоп.

Лета праляжыш, то ўзімку ў пазыкі пабяжыш.

Ліпень косіць і жне, доўга спаць не дае.

Жнівень ходзіць па зямлі, жыта зносіць у кулі.

# ДАДАТАК

## ЗВЕСТКІ ПРА АЎТАРАЎ

(выкарыстаны матэрыялы вучэбнага дапаможніка «Беларуская дзіцячая літаратура» аўтара М. Ф. Шаўлоўскай)

### Эдзі Агняцвет

Эдзі Агняцвет (Эдзі Сямёнаўна Каган) — вядомая беларуская паэтэса, перакладчыца. Нарадзілася 11 кастрычніка 1913 г. у Мінску ў сям'і служачых. У 1934 г. скончыла крытыка-творчае аддзяленне літаратурнага факультэта Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута (цяпер Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка).

Вершы Э. Агняцвет пачалі друкавацца ў 1929 г. на старонках газет «Піянер Беларусі» і «Чырвоная змена». Першы зборнік вершаў «Маё пакаленне» з'явіўся ў друку ў 1935 г.

Асабліва плённа працавала Э. Агняцвет у галіне дзіцячай літаратуры. Яе пяру належаць шматлікія збор-

нікі вершаў і паэм. Творы паэтэсы вызначаюцца дабрынёй, гумарам, мілагучнасцю, многія з іх пакладзены на музыку.

Значную частку паэтычнай творчасці Э. Агняцвет складаюць пераклады вершаў Пушкіна, Някрасава, Маякоўскага, Беранжэ, Гюго і іншых.

У 1986 г. Эдзі Агняцвет узнагароджана міжнародным Ганаровым дыпломам імя Х. К. Андэрсена за кнігу «На двары алімпіяда».

Памерла 17 ліпеня 2000 г.

## Максім Багдановіч

Класік беларускай паэзіі Максім Адамавіч Багдановіч нарадзіўся ў Мінску 9 снежня 1891 г. Маленства будучага паэта прайшло ў Гродне, куды бацька пераехаў у сувязі з пераходам на службу ў Сялянскі банк. У 1896 г. сям'я Багдановічаў пераязджае ў Ніжні Ноўгарад, жыццё ў якім пакінула глыбокі след у душы Максіма. У 1902 г. ён пасту-

пае ў Ніжагародскую мужчынскую гімназію. У гэты час пачынаюць праяўляцца паэтычныя здольнасці М. Багдановіча. Літаратурны дэбют адбыўся ў 1907 г., калі ў газеце «Наша ніва» з'явілася яго рамантычнае апавяданне «Музыка».

З пераездам бацькі па службе ў Яраслаўль Максім Багдановіч перавёўся ў Яраслаўскую гімназію (1908–1911). Летнія канікулы ён праводзіць у Беларусі. Сустрэча з Бацькаўшчынай духоўна ўзбагаціла паэта. Юнака цікавіла беларуская філалогія, і ён пачаў рыхтавацца да паступлення ў Пецярбургскі ўніверсітэт па філалагічным профілі, але слабае здароўе (туберкулёз лёгкіх) перашкодзіла здзяйсненню гэтай задумы. Увосень 1911 г. Багдановіч паступіў у Яраслаўскі юрыдычны ліцэй. Ліцэйскі перыяд быў самы плённы ў творчай біяграфіі паэта. Ён піша вершы, крытычныя артыкулы, друкуецца ў «Нашай ніве», рускіх часопісах

і газетах, займаецца перакладамі на беларускую мову твораў замежных і рускіх паэтаў, на рускую мову твораў Я. Купалы, Т. Шаўчэнкі, І. Франко і іншых.

У 1914 г. у Вільні выйшаў першы і апошні прыжыццёвы зборнік вершаў М. Багдановіча «Вянок». У 1914 г. паэт напісаў паэму-казку для дзяцей «Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык».

М. Багдановіч — мастак слова шырокага паэтычнага дыяпазону; яго паэзія вызначаецца тэматычнай разнастайнасцю, філасафічнасцю зместу, глыбокім пранікненнем у духоўны свет чалавека, высокімі эстэтычнымі вартасцямі. Многія вершы паэта пакладзены на музыку.

У апошнія дні свайго жыцця М. Багдановіч працуе над складаннем беларускага буквара.

Памёр 25 мая 1917 г. у Ялце, дзе і пахаваны.

## Рыгор Барадулін

Народны паэт Беларусі Рыгор Іванавіч Барадулін нарадзіўся 24 лютага 1935 г. на хутары Верасоўка Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працаваў у рэдакцыях газеты «Советская Белоруссия», часопісаў «Бярозка», «Полымя».

Друкавацца пачаў у газеце «Чырвоная змена» ў 1953 г. Першая кніга вершаў «Маладзік над стэпам» выйшла ў 1959 г.

Для дзяцей выдаў кніжкі паэзіі «Мех шэрых, мех белых», «Красавік», «Экзамен», «Ай! Не буду! Не хачу!», «Што было б тады б, калі б?», «Ці пазяхае бегемот?», «Як воўк калядаваў» і інш. Юнаму чытачу адрасаваны кнігі вершаў і паэм «Вяртанне ў першы снег» (1972), «Суровая вымова» (1976), «Слаўлю чысты абрус» (1996).

Р. Барадуліну прысуджана Дзяржаўная прэмія імя Янкі Купалы.

## Пятрусь Броўка

Пятрусь (Пётр Усцінавіч) Броўка нарадзіўся 25 чэрвеня 1905 г. у вёсцы Пуцілкавічы Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. Працоўны шлях яго пачаўся ў 1918 г. у Вялікадалецкім валасным ваенным камісарыяце. П. Броўка быў справаводам у валвыканкаме, рахункаводам у саўгасе, старшынёй сельсавета. У 1927–1929 гг. працаваў адказным сакратаром акруговай газеты «Чырвоная Полаччына». У 1931 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1940 г. быў прызначаны галоўным рэдактарам часопіса «Полымя». У Вялікую Айчынную вайну працаваў у франтавым і партызанскім друку. Пасля вайны быў галоўным рэдактарам часопіса «Полымя». У 1948 г. абраны старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. У 1967–1980 гг. працаваў галоўным рэдактарам Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

Пачаткам творчай дзейнасці П. Броўкі лічыцца 1926 г., калі ў газеце «Чырвоная Полаччына» былі надрукаваны першыя яго вершы. Выйшла каля дваццаці кніг паэзіі.

П. Броўка — таксама аўтар празаічных твораў (аповесць «Каландры» — 1931 г., раман «Калі зліваюцца рэкі» — 1957 г.). Выступаў і як перакладчык на беларускую мову твораў Т. Шаўчэнкі, У. Маякоўскага, А. Твардоўскага, М. Ісакоўскага і іншых паэтаў.

П. Броўка вядомы і юнаму чытачу як аўтар зборнікаў вершаў «Маладым сябрам» (1961), «Мая Радзіма» (1985), паэм «Наш музей» (1962), «Лясы наддзвінскія» (1973). Для вучняў старэйшага школьнага ўзросту напісаў аповесць «Донька-Даніэль» (1982).

П. Броўку прысвоена ганаровае званне народнага паэта (1962), званне Героя Сацыялістычнай Працы (1972). Ён лаўрэат Ленінскай прэміі (1962), двойчы лаўрэат Дзяржаўнай

прэміі СССР (1947, 1951), лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1959), Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы (1970), Дзяржаўнай прэміі за ўдзел у стварэнні Беларускай Савецкай Энцыклапедыі (1976).

Памёр 24 сакавіка 1980 г.

## Змітрок Бядуля

Змітрок Бядуля (Самуіл Яфімавіч Плаўнік) нарадзіўся 23 красавіка 1886 г. у м. Пасадзец былога Вілейскага павета Віленскай губерні (цяпер Лагойскі раён Мінскай вобласці). Вучыўся ў пачатковай яўрэйскай школе. Працаваў хатнім настаўнікам, а з 1902 г. канторшчыкам на лесараспрацоўках.

Пісаць вершы пачаў на старажытнаяўрэйскай мове з трынаццаці год. Першы верш на рускай мове быў надрукаваны ў 1910 г. у часопісе для пачынаючых пісьменнікаў «На берегах Невы» (Пецярбург). Першым творам на беларускай мове было апавяданне «Пяюць начлежнікі»,

надрукаванае ў 1910 г. у «Нашай ніве». Праз два гады рэдакцыя гэтай газеты запрасіла маладога пісьменніка на сталую працу. Пераехаўшы ў Вільню, Бядуля пазнаёміўся з Цёткай і Я. Купалам. У 1913 г. выходзіць з друку першы зборнік лірычных апавяданняў Бядулі «Абразкі».

З 1915 г. жыве ў Мінску, працуе ў Беларускім таварыстве дапамогі ахвярам вайны, потым у газеце «Савецкая Беларусь», быў рэдактарам дзіцячага часопіса «Зоркі», краязнаўчага часопіса «Наш край». Уваходзіў у літаратурна-мастацкае аб'яднанне «Маладняк», пасля — ва «Узвышша».

На пачатку Вялікай Айчыннай вайны эвакуіраваўся з Беларусі.

Памёр 3 лістапада 1941 г. каля Уральска.

З. Бядуля — таленавіты мастак слова, аўтар зборнікаў вершаў і апавяданняў, а таксама буйных празаічных твораў. Значнае месца

ў літаратурнай спадчыне З. Бядулі займаюць творы для юнага чытача, якія склалі кнігі «Качачка-цацачка» (1927, казка), «Вясной» (1928, вершы), «Гаспадарка» (1930, вершы), «Мурашка Палашка» (1939, вершаваная казка), «Люцік» (1940, верш), «Хлопчык з-пад Гродна» (1940, паэма), «Апавяданні» (1947), «Мае забавы» (1949, вершы), «Сярэбраная табакерка» (1958, казка і апавяданні), «Дзень добры!» (1979, вершы, казкі і апавяданні).

## Васіль Вітка

Васіль Вітка (Цімох Васільевіч Крысько) нарадзіўся 16 мая 1911 г. у вёсцы Еўлічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Пасля заканчэння Слуцкай прафтэхшколы металістаў працаваў слесарам на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце. У 1928 г. у штомесячным літаратурным дадатку да акруговай бабруйскай газеты «Камуніст» былі надрукаваны першыя вершы паэта,

а першы зборнік вершаў «Гартаванне» выйшаў у 1944 г. у Маскве.

Да Вялікай Айчыннай вайны супрацоўнічаў у рэдакцыях рэспубліканскіх часопісаў і газет. У 1939 г. удзельнічаў у вызваленчым паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Быў сакратаром аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР у Беластоку і адначасова карэспандэнтам «Литературной газеты» па заходніх абласцях БССР. У пачатку вайны працаваў у рэдакцыі газеты «Савецкая Беларусь», потым супрацоўнічаў у сатырычным лістку «Партызанская дубінка» і сатырычнай газеце-плакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну», у газеце «Комсомольская правда». У 1944–1947 гг. працаваў адказным сакратаром часопіса «Беларусь», потым — намеснікам рэдактара, галоўным рэдактарам газеты «Літаратура і мастацтва» (1948–1957). З дня ўтварэння дзіцячага часопіса «Вясёлка» (1957) на працягу сямнаццаці гадоў быў яго галоўным рэдактарам.

Творчасць для дзяцей пачалася з казачнага эпасу — у 1947 г. ён напісаў вершаваную казку «Вавёрчына гора». Затым выдаў кнігі для дзяцей «Буслінае лета», «Казка пра цара Зубра», «Зайчык-вадалаз», «Дударык», «Азбука Васі Вясёлкіна», «Казкі» і інш. Для дзяцей старэйшага школьнага ўзросту напісаў паэму «Беларуская калыханка» (1968).

Педагагічныя роздумы, эсэ, літаратурныя партрэты вядомых педагогаў склалі кнігі «Дзеці і мы» (1977), «Урокі» (1982), «Азбука душы» (1988). У 1995 г. выйшла кніга «Дом, дзе жывуць словы. Слоўнік народнай мовы для дзяцей»; у 2001 — «Выхаванне словам». Пісьменнік з'яўляецца адным з сааўтараў чытанак для 1-га і 2-га класаў.

Нямала твораў у В. Віткі для дарослых.

У 1972 г. за кнігі «Беларуская калыханка», «Казкі», «Чытанка-ма-

ляванка» В. Вітку прысуджана Дзяржаўная прэмія імя Янкі Купалы. У 1978 г. ён узнагароджаны міжнародным Ганаровым дыпломам імя Г. Х. Андэрсена за зборнік «Казкі». Памёр 5 ліпеня 1996 г.

## Артур Вольскі

Артур Вітальевіч Вольскі (Зэйдэль-Вольскі) нарадзіўся 23 верасня 1924 г. у Дзяржынску Мінскай вобласці. Скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча (1941), працаваў мастаком. У 1942 г. быў прызваны ў армію, служыў на Далёкім Усходзе, удзельнічаў у баях супраць імперыялістычнай Японіі. Пасля дэмабілізацыі працаваў у рэдакцыях газеты «Чырвоная змена», часопісаў «Бярозка», «Вясёлка». У 1962 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Працяглы час (1963–1978) працаваў дырэктарам Беларускага тэатра юнага гледача, потым — дырэктарам Дома літаратара Саюза пісьменнікаў

БССР (1978–1979). З 1980 г. быў літаратурным кансультантам Саюза пісьменнікаў БССР. У 1981–1984 гг. працаваў у выдавецтве «Юнацтва».

Сваю першую аповесць «Родная семья» напісаў на рускай мове ў сааўтарстве з таварышам па службе ў арміі Б. Іртышскім (Хабараўск, 1953). Затым выйшлі на беларускай мове зборнікі вершаў А. Вольскага «Водбліскі далёкіх маякоў», «Далёкія і блізкія прычалы», «Дабрата», «Выратавальны круг», «Строма», «Чалавек, якому баліць».

Творчасць для дзяцей пачалася з кнігі «Маленькім сябрам» (1955). Неўзабаве выйшлі іншыя зборнікі паэзіі і прозы.

А. Вольскі з'яўляецца таксама аўтарам п'ес для дзяцей «За лясамі дрымучымі» (у сааўтарстве з П. Макалём; пастаўлена ў 1958 г.), «Марынка-крапіўніца» (у сааўтарстве з П. Макалём; пастаўлена ў 1962 г.), «Сцяпан — вялікі пан» (1979, пакладзена на музыку Ю. Семяня-

кам і пастаўлена ў 1979 г. на сцэне Мінскага тэатра музычнай камедыі), «Тры Іваны — тры браты» (1985), «Граф Глінскі-Папялінскі» (1986), «Каб не змаўкаў жаваранак» (1989).

А. Вольскі — сааўтар чытанак для вучняў 2, 3, 4-га класаў.

Памёр 5 верасня 2002 г.

## Віталь Вольскі

Віталь Вольскі (Віталь Фрыдрыхавіч Зэйдэль-Вольскі) нарадзіўся 5 верасня 1901 г. у Пецярбургу. З 1919 г. — у Чырвонай Арміі, удзельнічаў у грамадзянскай вайне, затым служыў у пагранічных войсках. Пасля дэмабілізацыі ў 1926 г. пачаў працаваць старшым інспектарам кінафікацыі Белдзяржкіно, з 1930 г. — дырэктарам Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа (Віцебск).

У 1934 годзе В. Вольскі абараніў дысертацыю і стаў кандыдатам філалагічных навук. Навуковую дзейнасць плённа спалучаў з мастацкай твор-

часцю. Напісаў п'есы-казкі для дзяцей «Цудоўная дудка» (1938, пастаўлена ў 1939 г.) і «Дзед і жораў» (1939, пастаўлена ў 1939 г.). Найбольшую папулярнасць прынесла пісьменніку п'еса «Несцерка» (1940, пастаўлена ў 1941 г.), за якую яму была прысуджана першая прэмія на Усесаюзным конкурсе на лепшы драматычны твор. У 1946 г. выйшла п'еса «Машэка» (пастаўлена ў 1954 г.).

Напісаў сцэнарыі дакументальных краязнаўчых фільмаў «Белавежская пушча» (1946), «Бярэзінскі запаведнік» (1965) і мастацкага фільма «Несцерка» (1955). У 1977 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Вялікая заслуга пісьменніка ў стварэнні навукова-пазнавальных кніг для юнага чытача. Краязнаўчыя нарысы і апавяданні змешчаны ў яго кнігах «Па лясных сцежках», «У лясах над Бярозай», «Месяц за месяцам», «На бабровых азёрах»,

«Чайкі над Нараччу», «Родны край», «Старонкі нашай гісторыі», «Падарожжа па краіне беларусаў», «Палессе», «Кніга падарожжаў», «Лёс Дункана», «Дзень добры, Бяроза!». Творчым вынікам падарожжа пісьменніка па Афрыцы сталі нарысы «Афрыканскае падарожжа» (1963) і «Эль Махрыб» (1965).

Памёр 22 жніўня 1988 г.

## Сяргей Грахоўскі

Сяргей Іванавіч Грахоўскі нарадзіўся 25 верасня 1913 г. у мястэчку Нобель Пінскага павета Мінскай губерні (цяпер Зарэчненскі раён Ровенскай вобласці, Украіна). Дзяцінства і першыя гады юнацтва прайшлі на матчынай радзіме ў мястэчку Глуск (Магілёўская вобласць), дзе будучы паэт закончыў сямігодку. Свой працоўны шлях С. Грахоўскі пачаў на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце (1930–1931). Некаторы час працаваў у

Дзяржвыдавецтве Беларусі, потым — у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена». У 1935 г. скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага і стаў працаваць у радыёкамітэце, адначасова выкладаў літаратуру на рабфаку пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (1935–1936). У 1936 г. рэпрэсіраваны, працаваў на лесанарыхтоўках у Горкаўскай вобласці. Пасля Вялікай Айчыннай вайны настаўнічаў на Случчыне. У 1949 г. арыштаваны паўторна, сасланы ў Новасібірскую вобласць, дзе таксама працаваў настаўнікам. Пасля рэабілітацыі пераехаў у Мінск, спачатку працаваў на Беларускім радыё, потым загадваў аддзелам у рэдакцыі часопіса «Бярозка» (1957–1959). Быў рэдактарам часопіса «Вясёлка» (1960–1973), адказным сакратаром Камітэта па дзяржаўных прэміях у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (1973–1974).

Першыя вершы былі надрукаваны ў 1926 г. у часопісе «Беларускі піянер», потым змяшчаліся на старонках штомесячнага літаратурнага дадатку «Вясна» да бабруйскай акруговай газеты «Камуніст», а таксама ў часопісе «Чырвоная Беларусь». У 1958 г. выйшаў першы зборнік вершаў паэта «Дзень нараджэння». Затым з'явіліся іншыя кнігі паэзіі. С. Грахоўскі — аўтар дакументальных аповесцей «Рудабельская рэспубліка» (1968, твор экранізаваны) і «Ранні снег» (1975).

Для дзяцей пачаў пісаць у канцы 50-ых гг. Выйшлі зборнікі вершаў, казак, паэм «Ад вясны да вясны», «Сёння і заўтра», «Гарыць касцёр», «Сонечная сцежка», «Знаходка», «Я ўсё ўмею», «Птушыная дзяржава». У 1974 г. напісаў аповесць «Гарачае лета». За кнігу «Споведзь» (аповесць, вершы) паэт быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй імя Якуба Коласа (1992).

Вядомы як перакладчык на беларускую мову твораў А. Пушкіна, А. Блока, У. Маякоўскага, Р. Гамзатава, Ж. Верна і іншых пісьменнікаў.

Кніга вершаў «Асеннія гнёзды» (1982) адзначана ў 1983 г. Літаратурнай прэміяй імя А. Куляшова.

## Уладзімір Дубоўка

Уладзімір Мікалаевіч Дубоўка нарадзіўся 15 ліпеня 1900 г. у вёсцы Агароднікі Вілейскага павета Віленскай губерні (зараз Пастаўскі раён Віцебскай вобласці).

Першы верш «Сонца Беларусі» У. Дубоўкі з'явіўся ў 1921 г. у газеце «Савецкая Беларусь». Праз два гады выйшаў у свет першы яго зборнік «Строма». У пасляваенны перыяд выдадзены зборнікі паэзіі «Палеская рапсодыя» (1961), «Вершы» (1970).

Значнае месца ў творчасці паэта займаюць адрасаваныя юнаму чытачу вершаваныя апрацоўкі на-

роднқых казак, што склалі зборнікі «Цудоўная знаходка», «Мілавіца», «Кветкі — Сонцавы дзеткі», «Казкі», «Залатыя зярняты». Некаторыя казкі з гэтых зборнікаў выходзілі асобнымі выданнямі.

У. Дубоўка — аўтар навукова-прыгодніцкіх аповесцей для дзяцей «Жоўтая акацыя» (1967), «Ганна Алелька» (1969), «Як Алік у тайзе заблудзіўся» (1974), а таксама зборніка апавяданняў пераважна аўтабіяграфічнага зместу «Пялёсткі» (1973).

Вядомы і як перакладчык на беларускую мову санетаў У. Шэкспіра, паэм Д. Байрана, вершаў В. Брусава, А. Пракоф'ева, П. Тычыны і іншых паэтаў.

У 1962 г. за зборнік вершаў «Палеская рапсодыя» У. Дубоўку прысуджана Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы.

Памёр 20 сакавіка 1976 г.

## Клаўдзія Каліна

Клаўдзія Канстанцінаўна Каліна (Лукашэвіч) нарадзілася 1 лістапада 1925 г. у вёсцы Блювінічы Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і настаўніка.

Скончыла Брэсцкае музычнае вучылішча (1953). Працавала настаўніцай спеваў у школах Брэста, Кобрына, Віцебска, а ў 1960–1977 гг. у Мінску.

Першыя апавяданні і казкі друкаваліся ў дзіцячых часопісах і газетах у 1962 г.

К. Каліна — аўтар аповесцей і казак для дзяцей «Хлопчык-пакідайчык» (1969), «Забароненая песня» (1972), «Каляровыя месяцы» (1975), «Маці і сын» (1977), «Світанак» (1983), «Бабуля Насця, дзед Адам, Петрык і каза Рагуля» (1985), «Крылаты конь» (1989), «Першы раз у першы клас» (1994).

Памерла 25 чэрвеня 1994 г.

## Уладзімір Караткевіч

Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч нарадзіўся 26 лістапада 1930 г. у Оршы Віцебскай вобласці. У час Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў эвакуацыі ў Пермскай вобласці, пасля ў Чкалаве. У 1944 г. вярнуўся на радзіму, атрымаў сярэднюю адукацыю ў Оршы і вышэйшую ў Кіеве.

Упершыню выступіў у друку з вершам «Машэка» ў 1955 г. Неўзабаве выйшла ў свет кніга паэзіі «Матчына душа» (1958), потым — «Вячэрнія ветразі» (1960), «Мая Іліяда» (1969), «Быў. Ёсць. Буду» (1986). Караткевіч — таксама аўтар зборнікаў апавяданняў «Блакіт і золата дня», кніг «Нельга забыць», «Дзікае паляванне караля Стаха», «Каласы пад сярпом тваім» і інш.

У. Караткевіч вядомы і як драматург. Шмат пісаў і для дзяцей. Юнаму чытачу адрасаваны зборнікі

«Казкі» (1975), нарысы «Белавежская пушча» (1975), «Зямля пад белымі крыламі» (1977).

За раман «Чорны замак Альшанскі» ў 1984 г. пісьменніку прысуджана Дзяржаўная прэмія імя Якуба Коласа.

Памёр 25 ліпеня 1984 г.

## Якуб Колас

Народны паэт Беларусі Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч) нарадзіўся 3 лістапада 1882 г. у засценку Акінчыцы Мінскага павета (цяпер Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці). Дзіцячыя гады будучага пісьменніка прайшлі ў Ластку і Альбуці. Вучыўся спачатку ў хатніх настаўнікаў, потым у Мікалаеўшчынскім народным вучылішчы. Пасля заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі (1902) працаваў настаўнікам пачатковай школы.

На старонках газеты «Наша доля» 1 верасня 1906 г. быў на-

друкаваны першы верш Я. Коласа — «Наш родны край». У гэтым жа годзе Колас распачаў працу над падручнікам для беларускіх школ «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» (Пецярбург, 1909).

У 1910 г. выйшаў яго першы зборнік вершаў «Песні жальбы» (у Вільні).

Пазней у Вільні выдаюцца яго кнігі прозы і вершаваныя апавяданні «Прапаў чалавек», «Батрак».

У пачатку верасня 1915 г. у сувязі з набліжэннем фронту Я. Колас эвакуіраваўся ў Маскоўскую губерню. Хутка яго мабілізавалі ў армію. Па дэкрэце Савецкага ўрада быў вызвалены ад вайсковай службы як настаўнік. У 1921 г. пераехаў у Мінск на пастаяннае жыхарства. Выкладаў методыку роднай мовы ў Белпедтэхнікуме, Беларускім дзяржаўным універсітэце, чытаў лекцыі на курсах настаўнікаў, займаўся навуковай дзейнасцю. З дня ўтварэння АН БССР (1 студзеня 1929 г.) быў яе

віцэ-прэзідэнтам. У 1926 г. удастоены звання народнага паэта БССР.

Далёка за межамі вядомы яго творы «Новая зямля», «Сымон-музыка», аповесці «У палескай глушы», «У глыбі Палесся», «На прасторах жыцця», «Дрыгва», п'есы «Вайна вайне», «У пушчах Палесся», зборнік вершаў «Нашы дні», «Адпомсцім», «Голас зямлі»; у 1943 г. выйшла паэма «Суд у лесе». У пасляваенныя гады выйшлі зборнік вершаў «Мой дом» (1946), паэмы «Адплата» (1946), «Рыбакова хата» (1947), трылогія «На ростанях» (1955).

У 1946 г. за вершы, напісаныя ў вайну, Я. Коласу прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР, у 1949 г. — Дзяржаўная прэмія СССР за паэму «Рыбакова хата».

Значнае месца ў творчасці Я. Коласа займаюць творы для дзяцей, пра што сведчаць зборнікі апавяданняў «Першыя крокі», «Крок за крокам», вершаваныя казкі «Рак-вусач», «Дзед і мядзведзь», паэма

«Міхасёвы прыгоды», зборнікі апавяданняў і вершаў «На рэчцы зімою», «У старых дубах», «Усход сонца», «Раніца жыцця». Творы Я. Коласа для дзяцей многа разоў перавыдаваліся. Вялікая заслуга пісьменніка і ў апрацоўцы народных казак.

Вядомы і як перакладчык твораў рускай, украінскай і польскай літаратуры на беларускую мову (А. Пушкіна, М. Лермантава, Т. Шаўчэнкі, П. Тычыны, А. Міцкевіча).

Памёр 13 жніўня 1956 г.

## Янка Купала

Народны паэт Беларусі Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч) нарадзіўся 7 ліпеня 1882 г. у фальварку Вязынка былога Вілейскага павета Віленскай губерні (цяпер Маладзечанскі раён Мінскай вобласці). Вучыўся, а затым працаваў хатнім настаўнікам, перапісчыкам у судовага следчага ў мястэчку Радашковічы,

малодшым прыказчыкам у маёнтку Беліца Магілёўскай губерні. Тры гады працаваў рабочым на броварах. Восенню 1908 г. пераехаў у Вільню, дзе працаваў у рэдакцыі «Нашай нівы» і ў прыватнай бібліятэцы «Знание» Б. Даніловіча. З Вільні пераехаў у Маскву, дзе некалькі месяцаў вучыўся ў Народным універсітэце А. Шаняўскага, а ў студзені 1916 г. быў мабілізаваны ў армію. Служыў у дарожна-будаўнічым атрадзе Варшаўскай акругі шляхоў зносін.

28 мая 1905 г. у прагрэсіўнай мінскай газеце «Северо-Западный край» быў надрукаваны першы верш Купалы на беларускай мове «Мужык». Першая кніга паэзіі «Жалейка» выйшла з друку ў 1908 г., затым з'явіліся «Гусляр» і «Шляхам жыцця». Напісаны паэмы «Адвечная песня», «Сон на кургане», «Курган», «На папасе», «Бандароўна», «Магіла льва», «Яна і я», п'есы «Паўлінка», «Раскіданае гняздо».

Удзельнічаў у стварэнні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,

Акадэміі навук БССР, нацыянальнага тэатра, рэспубліканскіх выдавецтваў. У 1922 г. выходзіць зборнік яго вершаў «Спадчына», затым — «Безназоўнае» і іншыя творы. У 1925 г. Я. Купалу было прысвоена званне народнага паэта БССР.

У гады Вялікай Айчыннай вайны жыў у Маскве, а таксама ў пасёлку Пячышчы каля Казані. Творчасць паэта ваеннага часу вызначаецца палымяным патрыятызмам і вялікай нянавісцю да фашысцкіх захопнікаў. Верш «Беларускім партызанам» распаўсюджваўся як лістоўка на часова акупіраванай ворагам тэрыторыі Беларусі, друкаваўся на старонках падпольных выданняў.

Вядомы Купала і як перакладчык. Дарэчы, ён пераклаў на беларускую мову «Слова аб палку Ігаравым» (прозай і вершам).

Нямала Я. Купала напісаў для дзяцей, пра што сведчаць зборнікі вершаў «Хлопчык і лётчык», «Арлянятам», «Алеся», «Славуты домік» і інш.

Многія вершы паэта пакладзены на музыку.

За зборнік «Ад сэрца» Я. Купалу ў 1941 г. была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР. За заслугі ў развіцці беларускай літаратуры ўзнагароджаны ордэнам Леніна (1939). Памёр 28 чэрвеня 1942 г. у Маскве.

## Еўдакія Лось

Еўдакія Якаўлеўна Лось нарадзілася 1 сакавіка 1929 г. у вёсцы Старына Лепельскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыла Глыбоцкае педвучылішча (1948), філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута (1955). Некаторы час працавала рэдактарам Вучэбна-педагагічнага выдавецтва БССР. Вучылася на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве, якія скончыла ў 1961 г. Затым працавала літработнікам газеты «Звязда», адказным сакратаром часопіса «Работніца і сялянка», галоўным рэдактарам часопіса «Вясёлка».

Першыя вершы з'явіліся ў рэспубліканскім друку ў 1948 г. У 1958 г. выйшаў у свет першы зборнік вершаў «Сакавік». Затым былі выдадзены кнігі паэзіі «Палачанка», «Людзі добрыя», «Харaство», «Яснавокія мальвы», «Вянцы зруба», «Перавал», «Галінка з яблыкам», «Лірыка», «Лірыка ліпеня», «Валошка на мяжы». Выйшлі з друку зборнікі апавяданняў «Пацеркі» (1966), «Травіца брат-сястрыца» (1970).

Плённа працавала і ў галіне дзіцячай паэзіі. Паэтычныя творы для юнага чытача склалі зборнікі «Абутая ёлачка», «Казка пра Ласку», «Вяселікі», «Зайчык-выхваляйчык», «Смачныя літары». Маленькаму чытачу адрасаваны таксама зборнік «Дванаццаць загадак».

У перакладзе Е. Лось на беларускай мове выйшла кніга вершаў рускага паэта С. Баруздзіна «Краіна, дзе мы жывём».

Памерла 3 ліпеня 1977 г.

## Яраслаў Пархута

Яраслаў Сільвестравіч Пархута нарадзіўся 8 сакавіка 1930 г. у вёсцы Мілейкі Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся на аддзяленні журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна (1949–1952). Доўга працаваў журналістам.

Першы верш апублікаваў у 1949 г.

Для дзяцей выдаў кнігі «Там, дзе жыве Юлька», «Зямля бацькоў нашых». Маленькім прызначаны кніжкі вершаваных і празаічных казак: «Казка зялёнай дубровы», «Перапёлачка», «Казкі дзеда Яраслава». Творы гэтыя поўняцца паэзіяй, у іх адчуваецца тонкі эстэтычны густ аўтара, майстэрскае валоданне словам.

Я. Пархута — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя К. Каліноўскага (1992) за кнігу «Зямля бацькоў нашых».

Памёр 20 сакавіка 1996 г.

## Андрэй Федарэнка

Андрэй Міхайлавіч Федарэнка нарадзіўся 17 студзеня 1964 г. у вёсцы Бярозаўка Мазырскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. Скончыў Мазырскі палітэхнікум (1983), працаваў некаторы час муляром, затым транспартным рабочым. Скончыў бібліятэчны факультэт Мінскага інстытута культуры (1990).

Першыя апавяданні надрукаваў у 1987 г. у часопісе «Маладосць». Аўтар кніг прозы «Гісторыя хваробы» (1989), «Смута» (1994), «Шчарбаты талер» (1999). Творы друкаваліся і ў калектыўных зборніках.

## Васіль Хомчанка

Васіль Фёдаравіч Хомчанка нарадзіўся 12 студзеня 1919 г. у вёсцы Канічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. У 1934 г. паступіў у Мінскі хіміка-тэхналагічны тэхнікум, з другога курса

перавёўся на рабфак пры Беларускім дзяржаўным універсітэце. У 1937 г. быў рэпрэсіраваны і працаваў на Далёкім Усходзе на будаўніцтве чыгункі і на лесанарыхтоўках (1937–1941). У час Вялікай Айчыннай вайны быў камандзірам мінамётнага ўзвода. У 1951 г. скончыў Ваенна-юрыдычную акадэмію ў Маскве. Звольнены з арміі ў запас у 1968 г. У 1972–1985 гг. працаваў у выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Пачынаў пісаць на рускай мове. Першае апавяданне «Анисов бор» было надрукавана ў 1954 г. у альманаху «Владимир». Ва Уладзіміры выйшлі першыя зборнікі апавяданняў для дзяцей «Куда исчез гриб», «Перчатки генерала Доватора» і кніга апавяданняў для дарослых «Жаворонок». На беларускай мове для юнага чытача выйшлі зборнікі апавяданняў «Наша вячэра», «Рукавіцы генерала Даватара», «Суседзі», «Чырвоны мак», «Верны рыцар», «Тваё чэснае сло-

ва», «Зімовы дождж», «Сустрэча з цудам», «Паляванне на львоў», «Цёплая зямля», «Я ўжо вялікі», «Уначы пад сонцам», «Паклон».

В. Хомчанка — аўтар аповесцей «Чырвоныя хвалі», «Я прынёс вам радасць», рамана «Вяртанне ў агонь». У 1982 г. выйшаў зборнік аповесцей і апавяданняў «Бацькава шабля», у 1985 — «Чэкістам стала вядома», у 1992 — «Цар-зэк Сямён Івашкін». Аповесць пісьменніка «Пры апазнанні — затрымаць» (1983) прысвечана паэту-дэмакрату Ф. Багушэвічу. У 1988 г. выйшла кніга аповесцей і апавяданняў «Стрэл у акно».

Для дзяцей пераклаў на беларускую мову казку Р. Кіплінга «Чаму ў слоніка доўгі нос».

Памёр 4 лістапада 1992 г.

## Станіслаў Шушкевіч

Станіслаў Пятровіч Шушкевіч нарадзіўся 19 лютага 1908 г. у вёсцы Бакінава Мінскага павета (цяпер Дзяржынскі раён Мінскай вобласці).

Вучыўся ў Сенніцкай пачатковай школе, у 11-ай працоўнай мінскай сямігодцы, пасля заканчэння якой у 1926 г. паступіў у Белпедтэхнікум. У гэтым жа годзе стаў членам літаратурнага аб'яднання «Маладняк».

Першыя вершы С. Шушкевіча ўбачылі свет на старонках часопіса «Маладыя араты» ў 1924 г. З гэтага часу творы маладога паэта пачалі часта з'яўляцца ў рэспубліканскіх часопісах і газетах. У 1934 г. выйшла першая кніга «Вершы», потым — «Дарогаю вясны», «Услед за марамі», «Навальніца», «Сябрам», «Сонца над маім асеннім садам». У 1968 г. выйшла кніга артыкулаў і ўспамінаў «Вяртанне ў маладосць», у якой змешчаны каштоўныя звесткі пра жыццё і творчасць М. Чарота, З. Бандарынай, М. Гарэцкага, Ю. Таўбіна, А. Бабарэкі, З. Астапенкі, У. Жылкі, Я. Пушчы і іншых пісьменнікаў. Пяру Шушкевіча належыць зборнік сатыры і гумару «Грушы на вярбе» (1969).

Для юных чатачоў пачаў пісаць у канцы 20-ых гг. У 1929 г. на старонках часопіса «Беларускі піянер» была змешчана яго казка «Звярыны баль», асобнай кніжкай выдадзеная ў 1936 г. Дзецям паэт прысвяціў шматлікія кнігі вершаў і казак.

Памёр 1 лютага 1991 г.

## Уладзімір Ягоўдзік

Уладзімір Іванавіч Ягоўдзік нарадзіўся 14 лютага 1956 г. у вёсцы Кастровічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Дзятлаўскай, Слонімскай, Зэльвенскай школах-інтэрнатах, у 1978 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Усё жыццё звязана з журналістыкай і літаратурнай дзейнасцю.

Дэбютаваў у друку вершамі ў 1972 г. Аўтар кніг прозы «Стронга», «Прыручэнне птушкі», «Вочы Начніцы», «Белыя рысы на чорным полі».

Для дзяцей напісаў кнігі «Сонейка, свяці», «Заклятыя скарбы», «Ці вернецца князь Кук?», «Янка і Ружа», «У царстве Вадзяніка», «Дзівосны карабель», «Вужовы кароль», «Свята летаўца», «Грыбок, грыбок, выстаў лабок» і інш.

## Алесь Якімовіч

Алесь (Аляксандр Іванавіч) Якімовіч нарадзіўся 17 студзеня 1904 г. у вёсцы Чурылава Ігуменскага павета Мінскай губерні (цяпер Уздзенскі раён Мінскай вобласці). Скончыў Вышэйшае пачатковае вучылішча ў мястэчку Узда і двухмесячныя настаўніцкія курсы, пасля чаго вучыўся ў Белпедтэхнікуме (1921–1926). Ужо ў студэнцкія гады пачаў пісаць вершы; адзін з іх — «Вясна» — трапіў у першы нумар літаратурна-мастацкага часопіса «Маладняк» за 1923 г. Неўзабаве А. Якімовіча прымаюць у члены літаратурнай арганізацыі «Маладняк». З гэтага часу ён займаецца літаратурнай і выкладчыцкай працай.

Пачатак творчасці А. Якімовіча прыпадае на 20-ыя гг. — перыяд станаўлення беларускай савецкай дзіцячай літаратуры. У 1925 г. выйшаў з друку яго першы зборнік «Вершы». З цягам часу пісьменнік аддае перавагу прозе, галоўным чынам такому яе жанру, як апавяданне, пра што сведчаць зборнікі «Гул бубна», «Залаты зуб», «Помста», «Сябры» і інш. Плённа працаваў і ў жанры аповесці.

А. Якімовіч — аўтар вершаваных і празаічных казак «Каваль Вернідуб», «Вераб'ёвы госці», «Байка пра казла», «Першае яечка», «Казка пра смелага Вожыка», «Браты Лазоўскія», «Лянота». Шырокую папулярнасць набылі апрацаваныя пісьменнікам народныя казкі, што склалі зборнікі «Каток — залаты лабок», «Бацькаў дар», «З рога ўсяго многа», «Людзей слухай, а свой розум май», «Андрэй за ўсіх мудрэй».

Нямала зроблена А. Якімовічам і ў галіне перакладу. У яго перакладзе

на беларускую мову выйшлі асобныя творы М. Някрасава, П. Яршова, А. Пушкіна, І. Крылова, І. Тургенева, М. Горкага, У. Маякоўскага, А. Гайдара, К. Чукоўскага, С. Маршака, С. Міхалкова і іншых пісьменнікаў.

За аповесці «Адкуль ліха на свеце», «Канец сервітуту», «Кастусь Каліноўскі» Алесю Якімовічу прысуджана ў 1974 г. Дзяржаўная прэмія імя Якуба Коласа.

Памёр 15 студзеня 1979 г.

# ЗМЕСТ

**Прадмова** .................................... 3

## 2 клас

Тэматыка чытання:
*Не проста ў словы я гуляю,*
*На роднай мове размаўляю...* ............ 4

**Пятрусь Броўка** ............................ 4
Родныя словы .............................. 4
Багата, родная ты мова ................ 5

**Эдзі Агняцвет** ............................ 6
Першае слова .............................. 6

**Паводле Васіля Віткі** ................... 7
Мілагучнасць роднай мовы ........... 7

**Уладзімір Караткевіч** .................. 8
Родная мова ................................. 8

**Калыханкі** ................................... 9
Баю-баінькі-баю............................ 9
Люлі-люлі-люленькі........................ 9

**Ніл Гілевіч** ................................. 10
Калі рана ўстанеш ........................ 10

Тэматыка чытання:
*Верасень букеты*
*запрасіў у школу...* .......................... 10

**Эдзі Агняцвет** ............................ 11
Параска і падказка ....................... 11

**Рыгор Барадулін** .......................... 12
Колькі раніц месціць ранец?....... 12
Вінаваты тут не сшыткі............. 15
Перастараўся (Смяшынка)........ 17
**Васіль Хомчанка** ...................... 17
Цяжкае імя................................. 17
**Андрэй Федарэнка** .................... 18
Падслуханая казка .................... 18
Памылка ..................................... 25
**Прыказкі** ................................... 33

Тэматыка чытання:
*Мы не заўважылі і самі,*
*Як восень па зямлі пайшла...* ........... 33
**Якуб Колас** ................................ 34
Восень (Скарочана) ..................... 34
**Станіслаў Шушкевіч** .................. 36
Лістапад ...................................... 36
**Рыгор Барадулін** ........................ 37
Як восень дрэвы ашукала ........... 37
**Уладзімір Ягоўдзік** .................... 40
Баравік........................................ 40
Жураўлі ...................................... 42
**Пятрусь Броўка** ......................... 45
Песня хлебу ................................ 45
**Рыгор Барадулін** ........................ 46
Загадкі на градках ....................... 46

**Віталь Вольскі** ................................. 48
Вавёрка ................................. 48
**Клаўдзія Каліна** ................................. 49
Кастрычнік ................................. 49
**Прыказкі і народныя прыкметы** .... 51

Тэматыка чытання:
*Што ў народзе скажуць —*
*Як вузел звяжуць...* ................................. 52
**Калыханкі** ................................. 52
Люлі-люлі ................................. 52
Ходзіць сон каля акон ................................. 53
Люлі, люлі, ўсе паснулі... ................................. 53
**Забаўлянкі** ................................. 54
Чыкі, чыкі, сарока ................................. 54
Гоп-гоп, і-га-га... ................................. 54
Мышка, мышка, дзе была... ................................. 55
**Лічылкі** ................................. 55
**Загадкі** ................................. 56
**Прыказкі і прымаўкі** ................................. 58
**Казкі** ................................. 60
Зайкава хатка ................................. 60
Зайчыкі ................................. 65
Вол і асёл ................................. 67
**Скорагаворкі** ................................. 69

Тэматыка чытання:
*Снег іскрыцца пад нагамі...* .......... 70
**Янка Купала** .......... 70
Зімой у лесе .......... 70
**Якуб Колас** .......... 71
Зіма .......... 71
Два маразы .......... 74
**Змітрок Бядуля** .......... 77
Сняжынкі .......... 77
**Максім Багдановіч** .......... 78
Завіруха .......... 78

Тэматыка чытання:
*Вясна, вясна жаданая!* .......... 79
**Змітрок Бядуля** .......... 79
Вясна .......... 79
**Клаўдзія Каліна** .......... 80
Песня вясны (Казка) .......... 80
Фіялка .......... 83
**Васіль Вітка** .......... 85
Вясна .......... 85
Сонейка .......... 85
**Павел Ткачоў** .......... 86
Зямля прачынаецца .......... 86

Тэматыка чытання:
*З чаго чалавек пачынаецца...* .......... 87
**Еўдакія Лось** .......... 87
Казка пра Ласку .......... 87

**Эдзі Агняцвет** .................... 95
Рэчка, рэчанька мая .................... 95

**Пятрусь Броўка** .................... 96
А ты хоць дрэва пасадзіў?.. .................... 96
Сымонка .................... 97

**Васіль Хомчанка** .................... 99
Салдацкая крыніца .................... 99
Самы лепшы малюнак .................... 100

**Уладзімір Дубоўка** .................... 102
Як унук дзеду дапамог .................... 102
Чые рукі прыгажэйшыя .................... 105
Праўдзівы хлопчык .................... 110

**Прыказкі** .................... 114

Тэматыка чытання:
*Смяецца, радуецца лета...* .................... 114

**Якуб Колас** .................... 115
Лета (Урывак) .................... 115
Канец лета .................... 116

**Артур Вольскі** .................... 117
Чарнічка .................... 117
Дождджыкава песня .................... 119

**Сяргей Грахоўскі** .................... 120
Лета .................... 120
Дзяцел .................... 121
У лесе .................... 122

**Віталь Вольскі** ........................123
Лета ........................................123
**Клаўдзія Каліна** .......................124
Чэрвень і Сонейка........................124

## 3 клас

Тэматыка чытання:
*З крыніц народных...* ...........................127
**Беларускія народныя песні** ..........127
Зімовыя песні ..............................127
На новае лета... ..........................127
Там за садамі трава-мурава... .....128
Узышло, узышло
тры месяцы... ...............................129
Ой, пад вярбою,
пад зеляною... ..............................130
Го-го-го, каза ...............................130
Веснавыя песні..............................131
Вясна красна... .............................131
А ляцела сойка цераз
чыста поле... ................................132
Жніўныя песні...............................133
Наш гаспадар маладзенькі.........133
Закракатала шэра вутанька
на рацэ... ......................................134
**Легенды** ............................................134
Адкуль пайшлі беларусы ...........134

Бусел ........................................136
Пра возера Свіцязь ........................138
Пра зязюлю ................................139

**Казкі** ........................................140
Баран — бок абадран ......................140
Дзедава рукавічка ..........................142
Сабака і воўк ................................144
Казка пра быка і яго сяброў .....152

**Яраслаў Пархута** ...........................158
Як рабілі вясёлку (Казка) .......158
Котавы казкі (Урыўкі) ............160
Мурашык ..................................161

Тэматыка чытання:
*Мой родны кут!*
*Як ты мне мілы...* ...........................164
**Уладзімір Караткевіч** ......................164
*** Дзе мой край?.. ...........................164
Белавежа ........................................165
**Эдзі Агняцвет** ..................................167
Зямля з блакітнымі вачамі ........167
**Пятрусь Броўка** ...............................168
Беларусь .........................................168
**Віталь Вольскі** .................................168
Беларускае мора ...........................168
**Якуб Колас** ......................................172
Вясковая дарога ...........................172

Тэматыка чытання:
*З усмешкай і ўсур'ёз...* ....................175

**Васіль Вітка** ....................175

Травінка ....................175

**Змітрок Бядуля** ....................178

Скарб ....................178

Музыка ....................187

**Еўдакія Лось** ....................193

Маці ....................193

**Сяргей Грахоўскі** ....................194

Сонечная сцежка ....................194

Зазімак ....................195

**Уладзімір Ягоўдзік** ....................195

Кнігаўка ....................195

Рак ....................198

Ласка ....................201

## 4 клас

Тэматыка чытання:
*Радзіма мая дарагая...* ....................204

**Янка Купала** ....................204

Сын і маці ....................204

**Васіль Вітка** ....................209

Спадчына ....................209

**Віталь Вольскі** ..........210
У Белавежскай пушчы ..........210
**Уладзімір Караткевіч** ..........212
Зямля пад белымі
крыламі (Урывак)..........212
Зямля мая беларуская..........213
Вёска, о родная вёска мая!..........213
Кацёл з каменьчыкамі ..........221
Просім у хату, госцейкі нашы!...232
**Артур Вольскі** ..........238
Беларусь ..........238
**Еўдакія Лось** ..........238
Продкі..........238
**Прыказкі** ..........240

Тэматыка чытання:
*На ніцях белай павуціны*
*Прыносяць восень павучкі...* ..........241
**Пятрусь Броўка** ..........241
Надыход восені..........241
**Віталь Вольскі** ..........242
Верасень ..........242
**Станіслаў Шушкевіч** ..........247
Журавы ..........247
**Якуб Колас** ..........248
Восень ..........248

Тэматыка чытання:
*З рога ўсяго многа...* ..............249
**Васіль Вітка** ..............249
Вавёрчына гора (Казка) ..............249
**Сяргей Грахоўскі** ..............267
Жмуркі ..............267
**Станіслаў Шушкевіч** ..............269
Казка-быль пра рэпку ..............269
**Васіль Хомчанка** ..............271
Венікі ..............271
Дружба ..............272
Дзядоўнік ..............274
**Уладзімір Дубоўка** ..............275
Як сінячок да сонца лётаў ..............275
**Казкі** ..............283
Суп з сякеры ..............283
Лёгкі хлеб ..............285
**Эдзі Агняцвет** ..............290
Скорагаворкі ..............290

Тэматыка чытання:
*Ой, зіма, зіма, зіма!*
*Весялей цябе няма!* ..............292
**Рыгор Барадулін** ..............292
Зіма ..............292
**Клаўдзія Каліна** ..............293
Люты ..............293

**Станіслаў Шушкевіч** .................... 296
Усё зіма заснежыла ................... 296
**Якуб Колас** .......................... 296
Дзед-госцьць .......................... 296

Тэматыка чытання:
*Вясна, вясна! Усе ёй рады...* ............. 298
**Паводле Якуба Коласа** ................. 298
Вясна (Урывак) ...................... 298
Прылёт птушак ....................... 301
Дуб і чароціна ...................... 303
Паводка на Нёмане ................... 305
Першы гром .......................... 307
**Уладзімір Караткевіч** .................. 307
Канцэрт у Белавежскай пушчы .. 307
**Васіль Вітка** .......................... 308
Жаваранак ........................... 308
**Артур Вольскі** ......................... 309
Май .................................. 309
**Веснавыя прыказкі і прымаўкі** ..... 309

Тэматыка чытання:
*Ішла вайна народная...* .................. 310
**Пятрусь Броўка** ........................ 310
А хіба ёсць, што забываюць? ..... 310
**Станіслаў Шушкевіч** .................... 312
Партызанскі звон ..................... 312

**Паводле Віталя Вольскага** ............ 318
Подзвіг Мікалая Гастэлы ........... 318
**Рыгор Барадулін** ........................ 320
Салдацкія зоркі ........................ 320

Тэматыка чытання:
*Нас лета ў новыя далі вядзе...* ........ 321
**Пятрусь Броўка** ........................ 322
Спявае лета над барамі ............. 322
**Якуб Колас** ............................... 322
Летняя ноч ................................ 322
На лузе ....................................... 324
**Клаўдзія Каліна** ........................ 324
Ліпень ......................................... 324
**Станіслаў Шушкевіч** ................... 328
Лясная калыханка ..................... 328
**Сяргей Грахоўскі** ........................ 329
Адшумела лета ........................... 329
**Летнія прыказкі і прымаўкі** ......... 330

**Дадатак** (звесткі пра аўтараў) .......... 331
Эдзі Агняцвет ............................. 331
Максім Багдановіч ...................... 332
Рыгор Барадулін ......................... 335
Пятрусь Броўка ........................... 336
Змітрок Бядуля ........................... 338
Васіль Вітка ................................ 340

Артур Вольскі ............................343
Віталь Вольскі............................345
Сяргей Грахоўскі .........................347
Уладзімір Дубоўка ........................350
Клаўдзія Каліна ..........................352
Уладзімір Караткевіч .....................353
Якуб Колас ...............................354
Янка Купала ..............................357
Еўдакія Лось..............................360
Яраслаў Пархута ..........................362
Андрэй Федарэнка..........................363
Васіль Хомчанка ..........................363
Станіслаў Шушкевіч .......................365
Уладзімір Ягоўдзік .......................367
Алесь Якімовіч ...........................368

*Вучэбнае выданне*
*Серыя «Хрэстаматыя»*

**Беларуская літаратура:**
**Пазакласнае чытанне**
**2–4 класы**

Укладальнік
**СТРОК** Людміла Іванаўна

Адказны за выпуск *Л. Б. Дайлідка*

Падпісана ў друк 29.08.2016.
Фармат 84×108 $^1/_{32}$. Папера афсетная. Гарнітура «School».
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 20,16. Ул.-выд. арк. 9,64.
Тыраж 3280 экз. Заказ 2082.
Тэрмін прыдатнасці не абмежаваны.

ТАА «ЮніПрессМаркет».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/57 ад 22.10.2013.
Вул. Платонава, д. 1Б, пам. 20, 220034, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь
Па пытаннях аптовых закупак звяртацца
па тэл.: (17) 290-90-30.
www.unipress.by

Дзяржаўнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 2/102 ад 01.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.

# Беларуская літаратура

## Пазакласнае чытанне 2·4 класы



ISBN 978-985-578-509-6

9 789855 785096

2-4
класы

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Пазакласнае чытанне